**Канспекты заняткаў па выхаванні ў дзяцей дашкольнага ўзросту цікавасці да беларускай мастацкай літаратуры і фальклору**

**Старэйшая група**

**(ад 5 - да 6 года жыцця)**

Дзеці старэйшага дашкольнага ўзросту ўжо здольныя да ўспрымання мастацкіх твораў розных жанраў. Асабліва іх цікавяць чароўныя казкі, легенды і паданні, а таксама вялікія па аб'ёме творы—так званыя «тоўстыя кніжкі». Чытаць мастацкія творы пажадана штодзённа. Бацькі не павінны парушаь гэтыя правілы і ў дні адпачынку.

Падрыхтоўка дзяцей да ўспрымання новага твора можа ажыццяўляцца непасрэдна перад чытаннем або напярэдадні. Пры гэтым В.В. Гербава раіць выкарыстоўваць наступныя прыёмы: размяшчэнне новай кнігі ў кніжным кутку і самастойнае яе разглядванне дзецьмі; паказ прадметаў пра якія расказваецца ў творы; разважанні наконт назвы твора і яго зместу.

Пасля расказвання або чытання мастацкага твора дарослы можа выкарыстаць наступныя прыёмы: змястоўныя зносіны па змесце твора, разглядванне ілюстрацый да твора, дэманстрацыя ілюстрацый, слоўныя замалёўкі, паўторнае чытанне ўрыўкаў тэксту, пераказ твора або аднаго з эпізодаў твора, драматызацыя ўрыўкаў твора і інш. На думку В.В. Гербавай змястоўныя зносіны павінны суправаджацца чытаннем пэўных урыўкаў твора. Пры гэтым трэба прытрымлівацца патрабавання наконт таго, што лепей яшчэ раз паслухаць мастацкі тэкст, чым распачынаць працяглыя разважанні пра тое, што адбылося з героямі твора і чаму.

У пласт дзіцячага чытання для дзяцей гэтага ўзросту ўключана шмат лірычных вершаў. Іх неабходна чытаць дзецям не толькі ў час мастацка-маўленчай дзейнасці, але і ў працэсе іншых відаў дзейнасці.

Сеансы актывізуючых зносін па завучванні вершаў могуць мець некалькі варыянтаў: чытанне без устаноўкі на завучванне, чытанне з устаноўкай на завучванне; змястоўны дыялог па асобных частках верша; практыкаванні ў выразным расказванні верша і інш. З дзецьмі гэтага ўзросту можна праводзіць літаратурныя віктарыны і літаратурныя ранішнікі.

***Раказванне калыханкі «*Ходзіць коцік па палях*»***

**Мэта:**развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць твор, выразна расказваць яго напамяць.

**Матэрыял:**малюнак коціка.

**Ход**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

П. Давайце пагуляем ў шэрага ката.

Спачатку выбярэм «ката» па лічылцы:

Раз, два, тры, чатыры,

Ката грамаце вучылі:

Не чытаць, не пісаць,

А за мышкамі скакаць.

Астатнія дзеткі будуць мышкамі. «Мышы» становяцца за «катом» у калону, якая рухаецца па групавому пакою. Паміж «катом» і «мышамі» ідзе размова:

К о т. У стозе мышы ёсць?

Д з е ц і. Ёсць!

К о т. Мышы ката баяцца?

Д з е ц і. Не баяцца!

К о т. А я кот Катафей, разганю ўсіх мышэй!

«Мышы» разбягаюцца, а «кот» іх ловіць.

*Заўвага: гульцы павінны знаходзіцца ў калоне да слоў «...разганю ўсіх мышэй» і дакладна, выразна вымаўляць тэкст.*

П. Паглядзіце на малюнак і назавіце жывёлу, што на ім адлюстравана. Так, гэта Шэры кот. Як коцік спявае сваю песеньку, як ён голас падае? Паслухайце пра яго беларускую народную калыханку «Ходзіць коцік па палях».

Расказванне калыханкі педагогам.

**Ходзіць коцік па палях**

Ходзіць коцік па палях,
Носіць сон у кашалях,
Ходзіць коцік па капусце,
Носіць сон у белай хусце.
Бабка коціка дагнала,
Сон для дзетачак забрала.
А ты, коця, вон, вон,
А на дзетак - сон, сон.

П. Пра што расказваецца ў калыханцы? Дзе ходзіць коцік? У чым носіць ён сон? Для каго забрала бабка сон ў коціка? Паўтарыце яе словы.

А ты, коця, вон, вон,
А на дзетак - сон, сон.

Паслухайце калыханку яшчэ раз. Будзем яе расказваць.

Расказванне калыханкі дзеткамі. (3-4 дзіцяці)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Расказванне беларускай народнай казкі «Гарошак»**

**Мэта:** вызваць у выхаванцаў эмацыянальны водгук на казачны тэкст, паглыбляць уяўленні пра жанравыя асаблівасці казкі. Развіваць навыкі дыялагічнага маўлення.

**Матэрыял:**малюнкі да казкі.

**Ход**

П. Паглядзіце на гэтага асілка – магутнага чалавека, багатыра (малюнак). Якімі словамі можна пра яго расказаць.

Паслухайце казку пра асілка якога звалі Гарошак. Казка так і называецца “Гарошак”. Расказванне казкі педагогам.

Жыў калісь на свеце адзін гаспадар з жонкаю. Былі ў іх два сыны і адна дачка.
Рэдка ў каго былі такія працавітыя хлопцы, як гэтыя сыны. Ніколі яны не сядзелі без работы, а калі дома работы не было, то хадзілі ў чужыя землі.
Яшчэ больш цікавая была іхняя сястра. Цяжка было знайсці такую прыгожую, такую мілую дзяўчыну. І звалася яна Ясаня. Адзін раз улетку, парабіўшы дома работу, задумалі браты пайсці ў заработкі.
— Калі мы не вернемся праз тры дні,— сказалі браты, — то няхай нам Ясаня прынясе есці.
— А як жа я вас, браткі, знайду? Куды мне есці прыносіць? — спытала Ясаня братоў ужо на двары.
— Мы будзем салому па дарозе церушыць. Па гэтай саломцы і знойдзеш ты нас.
Развіталіся яны з бацькамі, з сястрою. Ідуць раты, саломку па дарозе раскідваюць, прыгаворваючы:
— Будзе наша Ясаня ісці і не саб’ецца з дарогі.
А ў тых мясцінах жыў страшны змей. У ягобыў жалезны язык, вочы — як жарнавыя камяні і гарэлі агнём. Жыў ён у палацах. Тыя палацы былі зложаны з людскіх касцей.Падслухаў змей, што казалі браты, даведаўся, навошта салому цярушаць. Пазбіраў ён тую салому і пакідаў яе па дарозе, што ў яго касцяныя палацы вяла.
«Будзе яна па саломцы ісці і ў мае палацы прыйдзе», — думае змей.
Так яно і сталася.
Праходзіць дзень, праходзіць другі,— няма братоў. І трэці дзень мінуўся, а іх няма.
На чацвёрты дзень сабралася Ясаня ў дарогу братам есці несці. Узяла яна хлеба, стравы і пайшла.
Ідзе яна ды ідзе, на саломку прызіраецца. А дарога ўсё глыбей у лес забірае. Лес цёмны, глухі, нават і неба не відаць. Ідзе Ясаня, і страшна робіцца ёй. «Куды ж так далёка зайшлі яны?»— думае дзяўчына. Вось пад вечар падыходзіць яна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

да касцяных палацаў ліхога змея. Паглядзела Ясаня, і сэрца яе замерла ад страху: вакол чалавечыя косці ляжаць. Што ж тут рабіць? Кінулася яна бегчы назад. Бяжыць яна, бяжыць, ажно чуе — гудзе штосьці. Азірнулася— змей даганяе!

Схапіў яе змей і ў свае палацы нясе.

— Я цябе даўно чакаю, — кажа змей. — Цяпер ты будзеш жыць са мною — ты будзеш маёю жонкаю.

Плакала, прасілася Ясаня, каб пусціў яе змей, але просьба не памагла.

Браты чакаюць яе на чацвёрты дзень. Чакалі, чакалі, ды так і не дачакаліся. Пайшлі яны дадому.

— Чаму ж вы, — кажуць бацькам, — не прыслалі яды?

Напалохаліся бацькі:

— Як не прыслалі? Хіба ж не было Ясані?Спалохаліся і браты: напэўна, з Ясаняю ліханалучылася.

— Пайду шукаць яе, — кажа старэйшы брат.

Сабраўся і пайшоў. Ідзе ён ды ідзе па той дарозе, што саломаю пацярушана, ды не прыкмеціў, што гэта не тая дарога, кудою ён з братам ішоў, і дайшоў да касцяных палацаў. Сустракае сястру.

— Куды ж ты, братка, зайшоў? — пытае яго Ясаня. — Тут страшны змей жыве. З’есць ён цябе. Уцякай ты адгэтуль хутчэй!

— Калі ўцякаць — уцякайма разам, — кажа ёй брат.

— Не, братка: ён чуе мой дух — дагоніць і зловіць нас. А адзін ты, можа, уцячэш.

Толькі што яна так сказала, чуюць — як загудзе нешта, ды так моцна, што аглушыла іх.

Глядзяць— аж то змей ляціць.

— Гэта мой брат прыйшоў да нас,— кажа Ясаня змею.

— Добра,— кажа змей, — вядзі ж ты яго да мяне ў госці. Увайшлі ў палацы.

— Ну, жонка, — гаворыць змей, — дай нам пасмакаваць бобу жалезнага.

Прынесла Ясаня жалезнага бобу. Змей як чаў есці гэты боб, дык аж іскры пасыпаліся,

а той, небарака, узяў адну бабіну́ ды ледзь быў зуба сабе не паламаў. Пажаваў дый выплюнуў з рота бабіну.

Як закрычыць тут змей:

— Ты што ж гэта дабром маім пагарджаеш? Я ем, а ты не можаш? Чым ты лепшы за мяне?

Сядзіць бедны госць, баіцца зварухнуцца.

— Хадзем пакажу маё багацце!

Вывеў змей свайго госця на двор і павесіў яго на варотах, а потым прыйшоў да Ясані і кажа:

— Жонка! Я павесіў твайго брата, бо ён не хацеў есці майго бобу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Залілася Ясаня горкімі слязамі, але бядзе памагчы нічым не магла.

Праз дзень ці праз два выйшла Ясаня на дарогу, бачыць — другі брат ідзе, шукаючы яе.

Такая ж самая доля напаткала і другога брата.Чакаюць бацькі сыноў дзень, чакаюць другі… Так чакалі з тыдзень, а іх усё няма.

Аднаго разу досвіткам пайшла жонка гаспадара па ваду. Бачыць яна— коціцца па дарозе гарошак. Падняла яна яго, паглядзела ды і з'ела. І вось якая сталася з ёй праява. Пачула яна, што той гарошак стаў у ёй расці. А тыдні праз два нарадзіўся ў яе сын. І такі прыгожы ды такі вялікі, што проста дзівота! А як толькі нарадзіўся ён, дык зараз жа і закрычаў:

— Мама! Дай мне есці!А голас такі грубы-грубы, што ўсе папалохаліся.

Расце той хлопец не па днях, а па часінах, і за месяц вырас такі вялікі, ды яшчэ з барадою, ажно бацька яго баяўся. Думалі, думалі, як назваць яго, якое імя даць. І назвалі яго Гарошак.

Праз нейкі час кажа Гарошак бацьку:

— На табе, тата, шпільку, завязі яе да каваля, няхай выкуе з яе булаву на сем пудоў.

Бацька думае сабе: «Ось дурны які хлопец: хоча, каб са шпількі яму зрабілі булаву на сем пудоў». Але сказаць аб гэтым сыну пабаяўся.

Паехаў у горад, купіў сем пудоў жалеза, завёз да каваля.

— Зрабі ты,— кажа, — булаву, каб яна важыла сем пудоў.

Каваў, каваў каваль булаву, ледзь выкаваў. Ускацілі на воз булаву. Прывозіць яе бацька дадому.

— На,— кажа, — сынок, табе булаву.

І скаціў яе на зямлю.

Узяў Гарошак тую булаву адною рукою ды як шыбануў яе ўгору, ажно яна ў небе схавалася.

Шпурнуў ён гэтую доўбню, пайшоў у хату, паснедаў, з бацькам пагутарыў.

— Ну, хадзем, бацька, на двор, зараз булава вернецца.

Выйшлі за хату на поле. Пaглядзеў Гарошак у неба.

— Бач, тата: вунь булава ляціць!

Не паспеў бацька зірнуць, а булава калі загудзе! Падставіў Гарошак калена. Як стукнецца аб калена булава! Трах— і пераламалася папалам. Пакруціў Гарошак галавою.

— Ты, мусіць, тата, не з тае шпількі булаву зрабіў.

Паехаў бацька зноў у горад, купіў сем пудоў жалеза і зноў завёз яго да каваля. Выкаваў каваль новую булаву.Прывёз яе бацька дамоў.

Шпурнуў яе Гарошак угору, падставіў калена— булава толькі трошкі пагнулася.

— Ну, гэта булава добрая,— кажа Гарошак, павесялеўшы. — Цяпер жа, тата, пайду сястру шукаць.

Доўга не думаючы, узяў Гарошак булаву і пайшоў проста да змея.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пачуў змей вялікую сілу. Выскачыў на дарогу насустрач Гарошку. Зірнулі яны адзін на аднаго і маўчаць, як бы напужаліся адзін аднаго.

Недалёка і Ясаня стаіць. Гарошак здагадаўся, што гэта сястра яго.

Нарэшце кажа змей Гарошку:

— Хадзем, браце, з'ямо трохі бобу.Пайшлі ў палац, садзяцца за жалезныя

столікі. Як толькі сеў Гарошак за свой столік, дык гэты столік так і пасыпаўся. Здзівіўся змей і яшчэ больш спалохаўся. Падаў госцю другі столік, яшчэ мацнейшы. Але і той сагнуўся пад Гарошкам. Пачалі есці жалезны боб. Елі, пакуль увесь не з'елі.

Змей аж пачырванеў, так яму моташна стала, што знайшоўся чалавек, яшчэ дужэйшы за яго.

Круціўся ён, круціўся, а потым кажа:

— Хадзем, брат, агледзім маё багацце.

— Хадзем.

Прыходзяць у гумно. Гумно вялікае. Ад сцяны сцяны не ўбачыш. Ток выкладзены меддзю.

Страха на жалезныя пруты апіраецца. А на гэтых слупах вісяць два чалавекі, даўно нежывыя.

— Што гэта за людзі ў цябе вісяць?— пытае Гарошак.

— Браты маёй жонкі, — адказвае змей.

Затрохся Гарошак ад злосці і гневу.

— Ах ты, паганец, змяіная твая душа! То ж ты маіх братоў павешаў!— загрымеў Гарошак ды як хапіў рукамі змея, як здушыў яго ды як стукнуў,

дык змей па пояс уляцеў у медны ток— і дух з яго вон.

Вярнуўся Гарошак дадому і сястру прывёў.

П. Пра каго расказваецца ў казцы.

П. Апішыце Гарошка? А цяпер паслухайце як расказваецца пра Гарошка ў казцы.

А тыдні праз два нарадзіўся ў яе сын. І такі прыгожы ды такі вялікі, што проста дзівота! А як толькі нарадзіўся ён, дык зараз жа і закрычаў:

— Мама! Дай мне есці!А голас такі грубы-грубы, што ўсе папалохаліся.

Расце той хлопец не па днях, а па часінах, і за месяц вырас такі вялікі, ды яшчэ з барадою, ажно бацька яго баяўся. Думалі, думалі, як назваць яго, якое імя даць. І назвалі яго Гарошак.

П. Прывядзіце прыклады з казкі, якія падцвярджаюць сілу і моц Гарошка. Паслухайце , як пра гэта расказваецца ў казцы.

Праз нейкі час кажа Гарошак бацьку:

— На табе, тата, шпільку, завязі яе да каваля, няхай выкуе з яе булаву на сем пудоў.

Бацька думае сабе: «Ось дурны які хлопец: хоча, каб са шпількі яму зрабілі булаву на сем пудоў». Але сказаць аб гэтым сыну пабаяўся.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паехаў у горад, купіў сем пудоў жалеза, завёз да каваля.

— Зрабі ты,— кажа, — булаву, каб яна важыла сем пудоў.

Каваў, каваў каваль булаву, ледзь выкаваў. Ускацілі на воз булаву. Прывозіць яе бацька дадому.

— На,— кажа, — сынок, табе булаву.

І скаціў яе на зямлю.

Узяў Гарошак тую булаву адною рукою ды як шыбануў яе ўгору, ажно яна ў небе схавалася.

Шпурнуў ён гэтую доўбню, пайшоў у хату, паснедаў, з бацькам пагутарыў.

— Ну, хадзем, бацька, на двор, зараз булава вернецца.

Выйшлі за хату на поле. Паглядзеў Гарошак у неба.

— Бач, тата: вунь булава ляціць!

Не паспеў бацька зірнуць, а булава калі загудзе! Падставіў Гарошак калена. Як стукнецца аб калена булава! Трах— і пераламалася папалам. Пакруціў Гарошак галавою.

— Ты, мусіць, тата, не з тае шпількі булаву зрабіў.

Паехаў бацька зноў у горад, купіў сем пудоў жалеза і зноў завёз яго да каваля. Выкаваў каваль новую булаву.Прывёз яе бацька дамоў.

Шпурнуў яе Гарошак угору, падставіў калена— булава толькі трошкі пагнулася.

— Ну, гэта булава добрая,— кажа Гарошак, павесялеўшы. — Цяпер жа, тата, пайду сястру шукаць.

Доўга не думаючы, узяў Гарошак булаву і пайшоў проста да змея.

Пачуў змей вялікую сілу. Выскачыў на дарогу насустрач Гарошку. Зірнулі яны адзін на аднаго і маўчаць, як бы напужаліся адзін аднаго.

Недалёка і Ясаня стаіць. Гарошак здагадаўся, што гэта сястра яго.

Нарэшце кажа змей Гарошку:

— Хадзем, браце, з’ямо трохі бобу.Пайшлі ў палац, садзяцца за жалезныя столікі. Як толькі сеў Гарошак за свой столік, дык гэты столік так і пасыпаўся. Здзівіўся змей і яшчэ больш спалохаўся. Падаў госцю другі столік, яшчэ мацнейшы. Але і той сагнуўся пад Гарошкам. Пачалі есці жалезны боб. Елі, пакуль увесь не з’елі.

Змей аж пачырванеў, так яму моташна стала, што знайшоўся чалавек, яшчэ дужэйшы за яго.

Ці спадабаўся вам Гарошак? Чаму?

### *Расказванне казкі “ Палешукі і палевікі”*

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць твор, эмацыйна і паслядоўна пераказваць яго асобныя ўрыўкі. Выхоўваць любоў да роднага краю.

**Матэрыял:** малюнкі да казкі – плыт, калёсы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Ход**

П. Ці ведаеце вы, хто такія палешукі і палевікі? Палешукі – гэта тыя, што жывуць пасярод лесу, палевікі тыя, што жывуць каля палянак з пяскамі і прагалінамі. Паслухайце казку. Называецца яна ***“ Палешукі і палевікі”.***

Расказванне казкі педагогам.

Было ў бацькі дванаццаць сыноў, ўсе рослыя ды ўдалыя хлопцы.

Жылі яны на вялікай палянцы, між цёмнага лесу. Вялі там сваю гаспадарку, палявалі на дзікіх звяроў і птушак. Стары бацька, сівы, як голуб, сядзеў сабе ў кажушку і ўлетку толькі камандаваў. І былі ў сям’і лад ды згода.

Пажаніліся сыны, пайшлі ў іх свае дзеці. Вялікая вырасла сям’я. Ды ўсе слухалі старога бацьку, і кожны рабіў сваю работу.

Але вось па некаторым часе памёр бацька. І пачаліся ў сям’і нелады. Жонкі братоў сварацца, адна адну заядаюць – рады няма. Такая пайшла між імі калатня, што і мужыкі нічога зрабіць не могуць. Крычаць жонкі, хочуць дзяліцца.

“ Ну што ж , -- думаюць браты, -- трэба дзяліцца”.

Пачалі дзліцца. Ды справа гэтая не такая і лёгкая, як ім здавалася. Сяк-так з крыкам ды зыкам падзялілі дабро і жывёлу. А як дайшло да зямлі, дык тут чуць адзін аднаго не пазабівалі: ніяк не могуць падзяліць сваю палянку, каб нікому крыўды не было. Перасварыліся браты і сталі адзін аднаму ворагамі.

Толькі два малодшыя браты жылі між сабою ў вялікай згодзе: куды адзін, туды і другі. Не захацелі яны калаціцца з братамі за зямлю, пакінулі бацькаву хату ды падаліся ў свет шукаць іншага прытулку.

Зрабілі браты з двух дубоў вялікія сані, запрэглі іх у шэсць пар валоў, наклалі дабра, пасадзілі жонак з дзецьмі ды паехалі на санях па пяску. А каровы і дробная жывёла ззаду за імі пайшлі.

Працягнулі трохі валы дубовыя сані па пяску ды сталі як укопаныя. Калёс тыя браты не мелі і нічога пра іх не ведалі. Бо нікуды яны з свайго лесу не толькі ўлетку, але і зімою не ездзілі...

Пачалі браты адпілоўваць круглыя калодкі ды падкладваць пад палазы. Коцяцца калодкі і сані паўзуць уперад.

Надакучыла меншаму брату падкладваць калодкі пад палазы, вось ён і кажа большаму:

-- Давай зробім так, каб калодкі самі круціліся пад палазамі.

І зрабілі яны першыя ў тым краі калёсы. Лёгка пайшлі цяпер валы, так што браты і самі паселі на воз. Едуць і дзівяцца, як яны да гэтага часу абыходзіліся без калёс.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ехалі яны, ехалі, даехалі да вялікай ракі. Агледзелі раку – усюды глыбока, нідзе няма зручнага месца, каб пераехаць уброд. А тут такая навальніца ўсхадзілася, што лес, як звер раве. Ломіць навальніца дрэвы, як саломінкі, ды шпурляе ў раку. Плывуць яны па вадзе цэлымі сціртамі.

Паглядзеў на іх малодшы брат, падумаў і здагадаўся, як перабрацца цераз раку.

Налавілі яны з братам дрэў, ачысцілі галлё, калоды звязалі адну з адной і зрабілі моцны плыт. А як сціхла навальніца, узвезлі свой воз на плыт. Самі стаяць на плыце ды кіруюць доўгімі жэрдкамі-бусакамі, а плыт плыве, як карабель.

Убачылі каровы, што валы паплылі на другі бераг, кінуліся ў раку ды за імі наўздагон. Толькі свінні і авечкі не адважыліся скакаць у ваду.Стаяць на беразе, бляюць, рохкаюць. Вярнуліся потым браты з плытом назад і забралі іх. Гэтак усе і пераправіліся цераз шырокую і глыбокую раку. Паехалі яны далей і забраліся ў такую пушчу, што і канца ёй няма.

Пачалі браты церабіць прасекі ў пушчы ды масціць грэблі. Але дзе там! Чым далей, тым лес гусцей, а ў ім такія нетры, што і выбрацца нельга. Большы брат змарыўся, аслабеў.

--Застануся, -- кажа ён меншаму, -- я тут , бо не хопіць у мяне сілы з гэтага лесу выцерабіцца.

І застаўся з сваёю сям'ёю жыць у лесе.

З таго часу і яго самога, і ўвесь род пачалі зваць палешукамі.

А малодшы брат не захацеў заставацца ў лесе. Быў ён дужы як тур, і спадзяваўся на сваю сілу. Ён адзін церабіў прасекі, масціў грэблі і ехаў далей.

І да гэтых часоў засталіся яшчэ на Палессі тыя прасекі ды грэблі, што нарабіў малодшы брат.

Ці доўга ён так выбіраўся з цёмнага лесу, ці не, але вось нарэшце пачалі трапляцца прагаліны ды палянкі з пяскамі. Асеў малодшы брат на гэтых палянках, пачаў іх араць і сеяць збожжа.

І з таго часу празвалі яго самога і ўвесь яго род палевікамі.

А потым рассяліліся палешукі і палевікі, занялі новыя лясы і палі ды сталі добрымі суседзямі.

Так і цяпер жывуць.

П. Пра каго расказваецца ў казцы? Чаму казка мае такую назву? Што прыдумалі браты, каб палегчыць сваё падарожжа. Так, гэта калесы і плот (паказвае малюнак).

П. Паслухайце ўрывак з казкі, дзе расказваецца як прыдумалі браты калёсы.

Працягнулі трохі валы дубовыя сані па пяску ды сталі як укопаныя. Калёс тыя браты не мелі і нічога пра іх не ведалі. Бо нікуды яны з свайго лесу не толькі ўлетку, але і зімою не ездзілі...

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пачалі браты адпілоўваць круглыя калодкі ды падкладваць пад палазы. Коцяцца калодкі і сані паўзуць уперад.

Надакучыла меншаму брату падкладваць калодкі пад палазы, вось ён і кажа большаму:

-- Давай зробім так, каб калодкі самі круціліся пад палазамі.

І зрабілі яны першыя ў тым краі калёсы. Лёгка пайшлі цяпер валы, так што браты і самі паселі на воз. Едуць і дзівяцца, як яны да гэтага часу абыходзіліся без калёс.

П. Перакажыце гэты ўрывак.

П. Паслухайце урывак з казкі, дзе расказваецца як прыдумалі браты плыт, які плыве як карабель.

Ехалі яны, ехалі, даехалі да вялікай ракі. Агледзелі раку – усюды глыбока, нідзе няма зручнага месца, каб пераехаць уброд. А тут такая навальніца ўсхадзілася, што лес, як звер раве. Ломіць навальніца дрэвы, як саломінкі, ды шпурляе ў раку. Плывуць яны па вадзе цэлымі сціртамі.

Паглядзеў на іх малодшы брат, падумаў і здагадаўся, як перабрацца цераз раку.

Налавілі яны з братам дрэў, ачысцілі галлё, калоды звязалі адну з адной і зрабілі моцны плыт. А як сціхла навальніца, узвезлі свой воз на плыт. Самі стаяць на плыце ды кіруюць доўгімі жэрдкамі-бусакамі, а плыт плыве, як карабель.

Перакажыце гэты ўрывак.

П. Дзе застаўся жыць адзін з братоў, калі яны пераправіліся праз глыбокую раку? Як сталі зваць яго самога і яго род? Паслухайце, як пра гэта расказваецца ў казцы.

Паехалі браты далей і забраліся ў такую пушчу, што і канца ёй няма.

Пачалі браты церабіць прасекі ў пушчы ды масціць грэблі. Але дзе там! Чым далей, тым лес гусцей, а ў ім такія нетры, што і выбрацца нельга. Большы брат змарыўся, аслабеў.

--Застануся, -- кажа ён меншаму, -- я тут , бо не хопіць у мяне сілы з гэтага лесу выцерабіцца.

І застаўся з сваёю сям'ёю жыць у лесе.

З таго часу і яго самога, і ўвесь род пачалі зваць палешукамі.

П. Што рабіў малодшы брат, дужы як тур, каб выбрацца з лесу? У казцы пра гэта расказваецца так:

Ён адзін церабіў прасекі, масціў грэблі і ехаў далей.

І да гэтых часоў засталіся яшчэ на Палессі тыя прасекі ды грэблі, што нарабіў малодшы брат.

Ці доўга ён так выбіраўся з цёмнага лесу, ці не, але вось нарэшце пачалі трапляцца прагаліны ды палянкі з пяскамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

П. Дзе асеў малодшы брат, калі выбраўся з цёмнага лесу? Як з таго часу празвалі яго самога і яго род? І сапраўды, асеў малодшы брат на гэтых палянках, пачаў іх араць і сеяць збожжа.І з таго часу празвалі яго самога і ўвесь яго род палевікамі.

П. Якія адносіны ў далейшым наладзіліся паміж палешукамі і палевікамі?

***Расказванне падання “Аб паходжанні Мінска***

**Мэта:** паглыбляць уяўленні дзяцей пра паходжанне назвы роднага горада, выхоўваць любоў да роднага краю.

**Матэрыял:**малюнкі да падання.

**Ход**

П.Паглядзіце на малюнкі і здагадайцеся, як называецца горад, у якім ёсць такія жывапісныя куточкі. У кожнага горада, у кожнай вёсцы ёсць свая назва. Наш родны горад завецца Мінск. Пра ўтварэнне яго назвы ёсць шмат розных паданняў Паслухайце адно з іх.

Расказванне падання педагогам.

Народнае паданне кажа: між Татарскім канцом і Пярэспенскім мастком ля самага цяперашняга Віленскага паштовага тракта некалі пасяліўся знакаміты волат-чараўнік па празванню Менеск, або Менскі, і збудаваў на Свіслачы вялікі каменны млын на сямі калёсах. Гавораць, што ніхто яго ніколі не бачыў, а між тым на усім свіслацкім наваколлі ўсе расказвалі аб яго сіле і магутнасці. У яго млыне нібыта мука малолася не з жыта, а з камення..., што ў поўнач раз’язджаў ён на сваім млыне на дарогах і збіраў дружыну з дужых людзей, з якіх потым утварыўся цэлы народ, які пачаў сяліцца побач з млыном чараўніка...Тут і быў заснаваны горад і названы імем волата -- Менск.

П. Пра якога волата-чараўніка, што жыў у нашым горадзе, расказваецца ў паданні? Што пабудаваў ён на рацэ Свіслач? На якой рацэ Менеск заснаваў горад? Чаму наш горад атрымаў назву Менск?

***Расказванне беларускай народнай казкі “Дзед, баба і воўк”***

**Мэта:** паглыбляць уяўленні дзяцей пра адпаведнасць назвы тэкста яго зместу. Выхоўваць любоў да роднай мовы, народных традыцый.

**Матэрыял:**малюнкі да казкі.

**Ход**

П. Пагуляем у гульню “Дзед і баба”

*Дзеці выбіраюць дзеда і бабу. Дзед садзіцца вярхом на палку, а баба і астатнія ўдзельнікі гульні адзін за адным садзяцца на падлогу: дзеці наперадзе, баба ззаду. Усе моцна трымаюць адзін аднаго пад пахі. Дзед аб'язджае ўсіх са словамі:*

*Еду, еду каля дзеда,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Еду, еду каля бабы,*

*Каля бабы, каля старэнькай.*

*Затым прыпыняецца каля пачатку рада, і, стукаючы палкай, пытае:*

*- Ці ёсць гаспадар у двары?*

*- А што табе?*

*- Свінні ў гародзе!*

*- Ну, выгані іх!*

*- А ці дазволіце рэпку вырваць?*

*- Ды рві сабе, толькі выгані!*

*Тады дзед дакранаецца палкай да пляча таго, хто сядзіць першым, і гаворыць:*

*- Юсь, вон! Юсь, вон! Мне пакіньце хоць адну рэпку!*

*Кідае палку, хапае першага за рукі і цягне да сябе.*

*Другія яго не пускаюць. Дзед вырывае гэту «рэпку», садзіць яе асобна, а сам зноў пачынае аб'язджаць гульцоў з той жа песняй. Пасля просьбы рэпку вырваць дзеці пытаюць дзеда:*

*- А дзе ж ты тую падзеў?*

*Дзед прыдумвае розныя адказы («А вось, як ехаў цераз масток, чорт схапіў кабылу за хвасток, тады я яму рэпіну і кінуў»).*

*- Ну, вырві сабе.*

*Дзед пачынае цягнуць рэпку, а калі яму цяжка, то кліча на дапамогу таго, каго выцягнуў раней. Разам яны выцягваюць другую рэпінку. Гульня працягваецца, пакуль дзед не перацягне ўсіх яе ўдзельнікаў.*

П. Пагулялі, а цяпер пагаворым. Якое скора будзе зімовае свята. Што вы ведаеце пра гэтае свята? Паслухайце казку, пра тое, што аднойчы здарылася на Калядах. Называецца яна“***Дзед, баба і воўк”***

Вось прыйшлі Каляды, а на Каляды холадна, ваўкі ходзяць галодныя па лесе.
Прыйшоў адзін воўк да дзеда. А дзед на печ пабраў і авечак, і бычечка, і курку, і сабачку, і бабку – гэтакі быў вялікі мароз. Сядзяць усе на печы. Адчыняе воўк дзверы:

Дзед, а дзед, я табе праспяваю каляду.

Ну, спявай.

Ёсць, ёсць у дзедкі пяць, пяць авечак, шосты бычэчак, курка-рабушка, сабачка-брахушка і бабка-старушка. Дзед, дзед, падай каляду!

Дзед яму даў авечку , ён яе за спіну закінуў і зацягнуў у лес. На другі дзень зноў прыходзіць да дзеда:

Дзед, а дзед, я табе праспяваю каляду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Спявай.

Стаў воўк на парозе і спявае:

Ёсць, ёсць у дзедкі пяць, пяць авечак, шосты бычэчак, курка-рабушка, сабачка-брахушка і бабка-старушка. Дзед, дзед, падай каляду!

Дзед даў яму другую авечку. “ Гэта ж ён так будзе хадзіць, пакуль Каляды не скончацца”, -- бядуе дзед.

Пайшоў воўк у лес, закінуўшы авечку за спіну. Наеўшыся, заснуў пад хвойкай. Назаўтра зноў прыйшоў да дзеда ў хату:

Дзед, дзед, я табе праспяваю каляду.

Дзед не можа адмовіцца, бо – Каляды;

Ну, спявай.

Ёсць, ёсць у дзедкі пяць, пяць авечак, шосты бычэчак, курка-рабушка, сабачка-брахушка і бабка-старушка. Дзед, дзед, падай каляду!

Шкадаваў дзед , шкадаваў, але ж аддаў авечку. Назаўтра рана-рана воўк прыйшоў:

Дзед, дзед, я табе праспяваю каляду.

А мой ты воўча, ты ж па апошнюю авечку прыйшоў. Усіх так звядзеш!

Дзед, а дзед, падай каляду!

Адддаў дзед яму апошнюю авечку. Назаўтра зноў воўк на дварэ:

Ёсць, ёсць у дзедкі пяць, пяць авечак, шосты бычэчак, курка-рабушка, сабачка-брахушка і бабка-старушка. Дзед, дзед, падай каляду! Дзед, а дзед, падай каляду!

Дзед даў яму бычэчка. Ледзьве воўк завалок яго ў лес. На другі дзень не прыйшоў. Аж на трэці дзень пачуў зноў дзед:

Дзед, а дзед, я табе праспяваю каляду.

Ну, спявай.

Ёсць, ёсць у дзедкі пяць, пяць авечак, шосты бычэчак, курка-рабушка, сабачка-брахушка і бабка-старушка. Дзед, дзед, падай каляду! Дзед, а дзед, падай каляду!

Дзед даў яму курку. Воўк выйшаў на ганак, з’еў яе і зноў ідзе:

Я табе праспяваю каляду!

Ну, спявай.

Ёсць, ёсць у дзедкі пяць, пяць авечак, шосты бычэчак, курка-рабушка, сабачка-брахушка і бабка-старушка. Дзед, дзед, падай каляду! Дзед, а дзед, падай каляду!

Даў дзед сабачку-брахушку, воўк і пайшоў. Дзед думаў, што болей не прыйдзе. Ажно на апошні дзень Каляд чуе:

Дзед, а дзед, я табе праспяваю каляду.

Ну, спявай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ёсць, ёсць у дзедкі пяць, пяць авечак, шосты бычэчак, курка-рабушка, сабачка-брахушка і бабка-старушка. Дзед, дзед, падай каляду! Дзед, а дзед, падай каляду!

Дзед аддаў яму і бабку-старушку. Панёс воўк бабку ў лес і пасадзіў на пень. Сам пайшоў іншых ваўкоў збіраць. Бабка, седзячы, сама сабе і кажа:

Вышэй, вышэй, пенчучок, каб не дастаў ваўчучок!

Пень пачаў расці і вырас вялікі. Прыбеглі ваўкі, грызлі-грызлі той пень, зубы паламалі і пайшлі. Бабка тады кажа:

Ніжэй, ніжэй, пенчучок, бо ўжо пайшоў ваўчучок.

Той пенчучок ніжэй, ніжэй, зрабіўся нізенькі, бабка саскочыла і пайшла. Ідзе, ідзе, стаіць хатка ў лазе, на курынай назе, цестам абмазана, маслам абгладжана, абаранчакам замкнёна. Увайшла яна ўсярэдзіну, там — козы, човен вады і стог сена. Сядзіць дзедка барадаты і кажа:

Пільнуй, бабка, гэтых коз, паі, кармі, малако даі, сыры і масла рабі.

Бабка іх паіла, даіла, сыры і масла рабіла. Нарабіўшы сыроў, масоа, узяла ўсё ў торбу і пайшла дадому. Там узлезла на страху і глянула ў комін. Бачыць: дзед зацірку на прыпеку мяшае. Бабка кінула кавалак масла – пасмачнела зацірка. Тады дзед кажа:

Жонка-варонка, скінь яшчэ чаго трошкі!

Бабка сыру кінула. Дзед памячшаў, яшчэ смачнейшая стала зацірка. Бабка тады яшчэ большы кавалак кінула. Гаршчок пабіўся, зацірка па прыпеку разлілася. Дзед за чапялу:

Я ж заб'ю тую варону!

Глядзіць, дык гэта ж бабка! Ён яе ў хату завёў, віном-півам паіў, сырам-маслам карміў. Яны жылі пажывалі і дабро наноў нажывалі.

П. Які звычай існуе на Каляды, калі ў хату да гаспадара заходзяць калядоўшчыкі? Хто наведаўся да дзеда праспяваць Каляду. Што папрасіў воўк за тое, што праспяваў Каляду? Ці заходзіў воўк у калядныя святы да дзеда яшчэ?Каго дзед яму аддаў за спяванне Каляды? Што здарылася з пяццю авечкамі, бычэчкам, куркай- рабушкай, сабачкам-брахушкай, бабкай-старушкай? Як дзед даведаўся, што бабка вярнулася дахаты?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### *Расказванне беларускай народнай казкі “Стары бацька”*

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне разумець змес казкі, асэнсоўваць характары персанажаў, жанравыя асаблівасці казкі, выхоўваць павагу да старых людзей.

**Матэрыял**:прыказкі.

**Ход**

П. У каго з вас ёсць бабулі і дзядулі? Для вас яны дзядулі і бабулі, а для вашых бацькоў – бацькі. Ці клапоцяцца вашы бацькі аб сваіх бацьках? Паслухайце казку, якая мае назву ***“Стары бацька”.***

Расказванне казкі педагогам.

Даўней было так: як састарэе бацька, то сын завязе яго ў глухую пушчу ды і пакіне там…

Вось аднаго разу павёз сын бацьку ў пушчу.

Шкада яму бацькі – моцна любіў ён яго, але што зробіш? Не павязеш – людзі смяяцца будуць: старых, скажуць, звычаеў не трымаецца. Яшчэ з сяла выганяць…

Едзе ён так маркотны, аж бацька і кажа яму:

-- Няўжо ты, сынку, мяне, старога ды нядужага, аднаго ў пушчы пакінеш?

Падумаў сын, змахнуў слязу і кажа:

-- Не , бацька, не пакіну. Але для людзей хоць трэба зрабіць гэта. Уночы я прыеду па цябе, забяру і буду трымаць да смерці, каб ніхто не бачыў.

Так сын і зрабіў.

Як прыйшла ноч, прывёз ён бацьку з пушчы ды схаваў у цёмнай каморцы.

Здарылася няшчасце: град усё жыта выбіў і няма нават новага пасеяць.

Прыйшоў сын да бацькі ў цёмную каморку, бядуе:

-- Што рабіць? Не пасеем жыта – і налета без хлеба будзем.

Бацька кажа:

-- Не, сынку, пакуль я жыў, без хлеба мы не будзем. Слухай мяне. Як ты быў яшчэ малы, тады я гумно ставіў. А ў тым годзе быў вельмі ж добры ураджай. Дык я немалочаным жытам гумно накрыў. Здзяры страху, абмалаці і мецьмеш насенне.

Сын так і зрабіў. Садраў страху з гумна, абмалаціў і пасеяў увосень жыта.

Суседзі дзівяцца: адкуль ён насенне ўзяў?

А сын маўчыць, бо нельга ж прызнацца, што гэта стары бацька яму памог.

Прыйшла зіма. Няма чаго есці. Зноў ідзе сын да бацькі ў цёмную каморку.

-- Так і так, -- кажа, -- давядзецца з голаду паміраць…

-- Не, -- кажа бацька, -- з голаду не памром.

Слухай, што я табе скажу. Вазьмі рыдлёўку ды пакапайся ў хаце пад лаваю. Там я некалі, як быў яшчэ малады і дужы, закапаў трохі грошай на чорны дзень. Жыццё, сынку, пражыць – не поле перайсці: усё можа здарыцца. Так я думаў, так і рабіў.

Зарадаваўся сын, выкапаў бацькавы грошы і купіў збожжа. Сам з сям'ёю хлеб есць ды яшчэ і суседзям пазычае. Вось яны і пытаюцца ў яго:

-- Скажы ты нам, браце, адкуль ты хлеб бярэш?

Прызнаўся сын.

-- Бацька, -- кажа, -- мяне корміць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

-- Як жа так?—дзівяцца суседзі. – Ты ж завёз свайго бацьку ў лес, як і ўсе добрыя сыны!

-- Не, -- кажа ён,-- я не рабіў так, як вы робіце, а пакінуў бацьку пры сабе дажываць веку.

Затое, як прыйшла бяда, -- бацька мне і памог.

Старыя людзі большы розум маюць, чым маладыя.

Перасталі з таго часу сыны бацькоў у пушчу вазіць, а пачалі пад старасць шанаваць іх і даглядаць.

П. Ці добра зрабіў сын, што пакінуў бацьку  пры сабе дажываць веку?  Як аддзякаваў бацька  сыну за добры ўчынак ?  Пра дапамогу бацькі сыну ў казцы расказваецца так:

Здарылася няшчасце: град усё жыта выбіў і няма нават новага пасеяць.

Прыйшоў сын да бацькі ў цёмную каморку, бядуе:

-- Што рабіць? Не пасеем жыта – і налета без хлеба будзем.

Бацька кажа:

-- Не, сынку, пакуль я жыў, без хлеба мы не будзем. Слухай мяне. Як ты быў яшчэ малы, тады я гумно ставіў. А ў тым годзе быў вельмі ж добры ураджай. Дык я немалочаным жытам гумно накрыў. Здзяры страху, абмалаці і мецьмеш насенне.

Сын так і зрабіў. Садраў страху з гумна, абмалаціў і пасеяў увосень жыта.

Суседзі дзівяцца: адкуль ён насенне ўзяў?

А сын маўчыць, бо нельга ж прызнацца, што гэта стары бацька яму памог.

Прыйшла зіма. Няма чаго есці. Зноў ідзе сын да бацькі ў цёмную каморку.

-- Так і так, -- кажа, -- давядзецца з голаду паміраць…

-- Не, -- кажа бацька, -- з голаду не памром.

Слухай, што я табе скажу. Вазьмі рыдлёўку ды пакапайся ў хаце пад лаваю. Там я некалі, як быў яшчэ малады і дужы, закапаў трохі грошай на чорны дзень. Жыццё, сынку, пражыць – не поле перайсці: усё можа здарыцца. Так я думаў, так і рабіў.

Зарадаваўся сын, выкапаў бацькавы грошы і купіў збожжа. Сам з сям'ёю хлеб есць ды яшчэ і суседзям пазычае. Вось яны і пытаюцца ў яго:

-- Скажы ты нам, браце, адкуль ты хлеб бярэш?

Прызнаўся сын.

-- Бацька, -- кажа, -- мяне корміць.

-- Як жа так?—дзівяцца суседзі. – Ты ж завёз свайго бацьку ў лес, як і ўсе добрыя сыны!

-- Не, -- кажа ён,-- я не рабіў так, як вы робіце, а пакінуў бацьку пры сабе дажываць веку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Затое, як прыйшла бяда, -- бацька мне і памог.

П. Ці стаў учынак сына прыкладам для усіх жыхароў вёскі? Як сталі паступаць са старымі людзьмі жыхары вёскі? ( Перасталі ў пушчу вазіць, а пачалі пад старасць шанаваць іх і даглядаць). У народнай прыказцы гаворыцца: «Старыя людзі большы розум маюць, чым маладыя». Ці ёсць у вашай сям'і старыя людзі? Раскажыце, як вы да іх ставіцеся?

***Расказванне беларускай народнай казкі “Баран бок абадран”***

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць твор, даваць ацэнку казачным персанажам, садзейнічаць развіццю навыкаў апісальнага маўлення выхаванцаў.

**Матэрыял:**малюнкі да казкі.

**Ход**

П. Паглядзіце на малюнак і назавіце хатнюю жывёлу, што на ім адлюстравана. Як вы здагадаліся, што гэта баран? Паслухайце беларускую народную казку пра барана. Называецца яна ***“Баран бок абадран.***

Быў раз дзед, а ў таго дзеда баран. І захацеў той дзед зарэзаць свайго барана. Толькі пачаў рэзаць, трошкі бок абадраў, а баран усхапіўся ды ўцёк і схаваўся ў лісіную норку.

Прыйшла ліса ў норку, а там нехта сядзіць. Спужалася лісіца і пытаецца:

— Хто там?

А баран ёй адказвае:

— Я баран, бок абадран, чатыры нагі, два рагі, — як дам рагамі, дык ты паляціш уверх нагамі!

Лісіца спужалася і пабегла ваўка прасіць.

— А воўчанька ты мой, а кумочак мой, — хадзі, памажы маёй бядзе, паглядзі, хто гэта ў мяне ў норцы сядзіць.

Паслухаў воўк лісу, пайшоў з ёю ў нару выганяць барана. Прыйшоў, ды сап, сап — носам нюхае.

— Хто там?

— Я баран, бок абадран, чатыры нагі, два рагі, — як дам рагамі, дык ты паляціш уверх нагамі!

Воўк спужаўся ды ўцёк. Пайшлі яны з лісіцай ды к мядзведзю, пачалі мядзведзя прасіць:

— Мядзведзінка, бацінка, — хадзі, памажы нашай бядзе, паглядзі, хто гэта ў лісінай норцы сядзіць.

Паслухаў мядзведзь, пайшоў з імі да норкі, прыйшоў, ды пытаецца:

— А хто там? А баран яму:

— Я баран, бок абадран, чатыры нагі, два рагі, — як дам рагамі, дык ты паляціш уверх нагамі!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мядзведзь спужаўся, ды ўцёк.

Ідуць яны, ідуць каля саду, ды бачаць — ляціць пчолка. Давай яны гэтую пчолку прасіць.

— Пчолка, душачка, — хадзі, паглядзі, хто гэта ў лісінай норцы сядзіць.

Паляцела пчолка з імі, прыляцела і пытаецца:

— А хто там?

— Я баран, бок абадран, чатыры нагі, два рагі, — як дам рагамі, дык ты паляціш уверх нагамі!

А пчолка не спужалася, — у норку, ды давай кусаць барана за абарваны бок.

Баран спалохаўся, выскачыў з норкі, ды давай уцякаць.

П. Як называецца казка, што я вам расказала? Апішыце барана так, як пра яго расказваецца ў казцы. Так, баран пра сябе гаварыў , што ён баран, бок абадран, чатыры нагі, два рагі,

П. Назавіце звяроў, якія дапамагалі лісіцы выгнаць барана са сваёй норкі. Пакажыце звяроў на малюнках (мядзведзь,воўк). Раскажыце пра кожнага са звяроў па малюнках




П.Каго спалохаўся баран?

П. Як пра гэта расказваецца ў казцы? Паслухайце гэты ўрывак казкі.

Ідуць лісічка, воўк і мядзведзь, ідуць каля саду, ды бачаць — ляціць пчолка. Давай яны гэтую пчолку прасіць.

— Пчолка, душачка, — хадзі, паглядзі, хто гэта ў лісінай норцы сядзіць.

Паляцела пчолка з імі, прыляцела і пытаецца:

— А хто там?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— Я баран, бок абадран, чатыры нагі, два рагі, — як дам рагамі, дык ты паляціш уверх нагамі!

А пчолка не спужалася, — у норку, ды давай кусаць барана за абарваны бок.

Баран спалохаўся, выскачыў з норкі, ды давай уцякаць.

П. У народзе кажуць “ Важна смеласць, але патрэбна і ўмеласць”. Хто ў гэтай кацы аказаўся больш умелым воўк і мядзведзь або маленькая пчолка?

### *Расказванне беларускай народнай казкі “***Хвасты***”*

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне разумець змест казкі, паглыбляць уяўленні дзяцей пра адпаведнасць назвы тэкста яго зместу, асэнсоўваць змест казкі з рэальнымі ўяўленнямі выхаванцаў.

**Матэрыял:**малюнкі да казкі.

**Ход**

П. Назавіце звяроў на малюнку.



П. Знайдзіце на малюнку памылку мастака.

П. Здагадайцеся, хвасты якіх звяроў адлюстраваны на наступным малюнку.





Паслухайце казку, якая так і называецца “Хвасты”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Быў такі час на зямлі, калі звяры не мелі хвастоў. Камары і мошкі страшэнна дакучалі ім: абараніцца звяры не мелі чым. І вось аднойчы ад ляснога цара выйшаў загад, каб звяры ішлі хвасты атрымліваць. Пайшлі ганцы ў ва ўсе канцы з пушчаў, лясоў і палёў склікаць звяроў. Паведамілі ваўка, лісіцу, куніцу, пабудзілі мядзьведзя ў яго бярлозе.

— Добра, — кажа Мішка: — я зараз прыйду, адно загляну да старое ліпы, ці не знайду там чаго паснедаць.

Сапраўды, у дупло старое ліпы дзікія пчолы нанасілі шмат мёду. Стаў Мішка ламаць дупло ды выграбаць мёд. Пчолы жалілі яго, але ён не зважаў на гэта, заграбаў мёд і пчол і парахню, што прыстала да мёду, еў усё ды толькі мармытаў ад асалоды. Наеўшыся, ён ужо хацеў ісці на сходку, аж глянуў, што шэрсць уся выпацкана ў мёд ды парахню.

— Не, — падумаў Мішка, — у такім гарнітуры ісьці на сходку нельга. — Сеў ён і пачаў вылізваць сабе бруха. А сонейка так добра грэла, што Мішка разамлеў і не заўважыў, як моцна заснуў.

Тым часам на сходку ўжо сталі збірацца звяры. Першай прыбегла лісіца і выбрала сабе самы прыгожы пушысты хвост. Потым — куніца, вавёрка. Бык выбраў сабе хвост з мяцёлкай на канцы, конь — з даўгімі валасамі, каб лепш было змагацца з мухамі ды аваднямі. Падбег і зайчык, але, пачуўшы страшэнны гармідар, спалохаўся ды схаваўся ў кусты; сядзеў там, пакуль усе звяры разыйшліся і ў лесе стала ціха. Вылез зайчык з кустоў і нясмела падыйшоў да ляснога цара.

— Дзе-ж ты быў — кажа цар, — то-ж усе хвасты ўжо разабралі, астаўся толькі адзін маленькі.

— То-ж такі мне й трэба — узрадаваўся зайчык. — даўгі хвост толькі перашкаджаў-бы мне ад ваўкоў ды сабак уцякаць, а гэты будзе якраз.

Фарсіста прычапіў зайчык свой хвост і весела паскакаў.

А тым часам прачнуўся мядзьведзь і раптам успомніў, што ён мусіў ісці на сход. Глянуў, а сонца ўжо зусім над лесам павісла. З усіх ног кінуўся Мішка бегчы. Бег, бег, аж засопся. Але ў тым месцы, дзе была сходка, ужо нікога не было.

— Што-ж мне цяпер рабіць, — думае мядзьведзь — усе будуць мець хвасты, адзін я застануся без хваста. — Гэтак ідзе ён злосны, аж бачыць на пяньку барсук пакручваецца і ўсё на свой прыгожы хвост глядзіць.

— Паслухай, барсуча, — кажа мядзведзь, — нашто табе такі вялікі хвост? Аддай мне хоць палавіну.

— Што ты? — кажа барсук — як-жа можна? То-ж увесь фасон прападзе.

— Не дасі, — сказаў мядзьведзь ды палажыў лапу барсуку на галаву, — не дасі па дабру, дык сілай вазьму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— Не дам — крыкнуў барсук, ды як рвануўся, дык і вырваўся. Але ў мядзведзя ў лапе засталася доўгая паласа барсуковае скуры. Адарваў мядзьведзь кавалак гэтае скуры, прычапіў сабе, дзе павінен быць хвост, ды пайшоў даядаць мёд. А барсук бег, бег, дзе ні схаваецца, усё яму здаецца, што мядзведзь услед тупае. Урэшце выкапаў ён глыбокую нару, залез у яе і сядзеў там цэлыя дні. Толькі калі месяц узыходзіў над лесам, вылазіў ён пашукаць чаго-колечы зесьці. Там у нары ў барсука дзеці нарадзіліся. І вось аднойчы недалёка ад гэтае нары бегла лісіца. Чуе яна, што нешта пішчыць. Глянула яна на дрэвы, агледзела ўсе кусты — нічога няма. Прыслухалася лісіца і здалося ёй, што нешта пішчыць пад зямлёй. Глядзіць, аж нара. Палезла лісіца ў нару, аж там барсук.

— Што гэта табе, барсуча, наверсе цесна стала, што ты пад зямлю залез? —

— А так, цесна. — Ды расказаў лісіцы, як мядзведзь хацеў забраць у яго хвост. Выслухала лісіца, хітра засмяялася ды кажа:

— Хлусіш ты, барсук. Не веру я твайму ніводнаму слову.

— Ня верыш, дык я цябе пераканаю. — І вылез з нары. Праўда, лісіца пабачыла, што ў барсука ад галавы праз усю спіну белая паласа. Паверыла лісіца і не на жарт спалохалася.

— Што-ж, — падумала яна — калі ён хацеў забраць барсукоў хвост, дык мой-жа прыгажэйшы. — І пабегла шукаць сабе схóвішча. Але дзе яна ні хавалася, усё ёй здавалася, што мядзведзь яе знойдзе. Гэтак прабегала яна ўсю ноч і не магла супакоіцца. А пад раніцу, як і барсук, выкапала сабе глыбокую нару, залезла ў яе, накрылася сваім прыгожым пушыстым цёплым хвастом і спакойна заснула.

П. Якія хвасты выбралі сабе розныя звяры? Як здабыў сабе хвост мядзведзь? Чаму барсук і лісіца жывуць у глыбокіх норах? Дзе жывуць астатнія звяры, пра якіх расказваецца ў казцы? Пакажы на малюнках звяроў, назаві іх і знайдзі на малюнках хатку кожнага з іх.





РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Расказванне беларускай народнай казкі “Сабака і воўк”***

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне эмацыйна успрымаць змест казкі, асэнсоўваць характары казачных персанажаў, фарміраваць навыкі дыялагічнага маўлення.

**Матэрыял:**малюнкі да казкі, загадкі.

**Ход**

П. Адгадайце загадкі і знайдзіце адгадкі.

Ляжыць пад ганкам, хвост абаранкам.

Сабака.

П. Паглядзіце на малюнак, што за звер на ім адлюстраваны. Як вы здагадаліся? Паслухайце казку. Называецца яна ***“Сабака і воўк”.***

Расказванне казкі педагогам.

Быў у аднаго гаспадара сабака. Шчыра служыў ён гаспадару, ды не агледзеўся, як пастарэў. Горш сталі бачыць яго вочы, і цяжэй яму стала вартаваць гаспадарава дабро. Тады скупая гаспадыня перастала карміць яго, а потым і зусім пачала з двара праганяць.

«Чым так жыць, — думае сабака, — лепш няхай мяне воўк з’есь».

Надумаўся ён і пайшоў у лес шукаць ваўка. Ідзе ён лесам, а тут насустрач і воўк бяжыць.

— Куды, сабака, ідзеш? — пытаецца воўк.

— Да цябе.

— Чаго?

— З’еш ты мяне, воўча...

І расказаў ён ваўку пра сваю бяду.

Бачыць воўк, што сабака надта худы — яшчэ зубы паломіць, і кажа:

— Не, цяпер я цябе есьці ня буду. Трэба, каб ты трохі патлусцеў.

— Як-жа я патлусцею, — кажа сабака, — калі мяне гаспадыня зусім не корміць?

— Нічога. Мы зробім так, што яна цябе з ахвотаю будзе карміць.

— Дзе там! — пакруціў хвастом сабака. — Гаспадыня мая вельмі скупая.

— Слухай ты мяне, — кажа воўк. — Ідзі дадому і сядзі там на агародзе. Адвячоркам, як пачне цямнець, я прыбягу і ўхаплю лепшага гаспадаровага падсвінака. Ты наробіш брэху, пабяжыш за мною, і я табе аддам падсвінака. Гаспадар убачыць гэта і загадае гаспадыні добра карміць цябе. А праз месяц, як патлусцееш, — прыходзь да мяне, тады я цябе з’ем.

Сабака падумаў і згадзіўся.

Адвячоркам прыбег воўк, ухапіў падсвінака і павалок цераз агароды.

Тут сабака як наробіць ляманту, як кінецца за ваўком...

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пачуў гэта гаспадар, выскачыў з хаты, бачыць: воўк падсвінака валачэ цераз агароды, а сабака яго даганяе, адбірае.

— Туйга! Туйга! — закрычаў гаспадар на ўсю сілу. — Кусі яго, Лыска!

Воўк тым часам кінуў падсвінака, а сам ходу ў лес.

— Малайчына, Лыска! — пахваліў гаспадар сабаку, прывёў на кухню і загадаў жонцы карміць яго.

Жыве Лыска прыпяваючы. А праз месяц зрабіўся такі тлусты, аж шэрсць блішчыць. І пра дагавор з ваўком забыўся.

Вось аднойчы сабраліся ў гаспадара госці. Гуляюць, песні спяваюць. Нямала тут і Лыску перапала — цэлую кучу касцей пад стол яму накідалі.

Наеўся Лыска ды выйшаў на двор — у сваю будку. Глядзіць — аж у будцы воўк чакае яго.

— Чаго ты тут? — здзівіўся сабака.

— Па цябе прыйшоў, — адказвае воўк. — Памятаеш наш дагавор з табою?

Спалохаўся сабака — не хочацца яму на воўчыя зубы трапляць. Вось ён і кажа:

— Не еш ты мяне, воўк. Я цябе за гэта добра пачастую самаю смачнаю ядою.

— Адкуль-жа ты возьмеш?

— У майго гаспадара госці. Там пад сталом поўна касцей — нават з мясам. Хадзем!

— Баюся. Яшчэ заб'юць мяне там.

— Не бойся, не заб'юць, — угаворвае сабака. — Я цябе правяду так, што ніхто і не ўбачыць.

Згадзіўся воўк і пайшоў за сабакам.

Лыска пакінуў яго ў сенцах, сам убег у хату, махнуў хвастом і патушыў лучыну.

— Цяпер бяжы пад стол, — паклікаў ён ваўка. Воўк так і зрабіў.

Сабака накарміў ваўка. А тым часам госці заспявалі вясёлыя песні.

Воўк слухаў, слухаў, ды кажа сабаку:

— Мне таксама спяваць хочацца.

— Маўчы лепш, — адказвае сабака.

Воўк памаўчаў крыху ды зноў за сваё:

— Не вытрымаю, — кажа, — аж язык свярбіць, гэтак спяваць захацелася.

І зацягнуў на ўсю хату басам:

— Ау—ау!

А сабака таксама не вытрымаў ды давай падпяваць яму:

— Гаў, гаў! Цяў, цяў!..

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пачулі гэта госці, ухапілі хто качаргу, хто чапялу, набілі ваўка і выкінулі яго з хаты разам з сабакам.

Ачухаўся воўк і кажа сабаку:

— Ну і накарміў-жа ты мяне! Я табе не дарую гэтага.

— Сам вінаваты, — кажа сабака. — Трэба было маўчаць.

— Не, — не згаджаецца воўк, — гэта ты вінаваты. Навошта ты завёў мяне ў хату?

Спрачаліся яны, спрачаліся, нарэшце воўк кажа:

— Калі так, давай будзем ваяваць: хто каго зваюе, той таго і з’есь. Збірай сваё войска і прыходзь да мяне ў лес.

— Што-ж, — кажа сабака, — няхай будзе так.

Назаўтра ўзяў ён барана, ката і пеўня сабе ў памочнікі ды пайшоў на вайну з ваўком.

А воўк запрасіў да сябе ў ваякі мядзведзя, дзіка і зайца. Сабраў ён сваё войска, выйшаў на ўскраек лесу і чакае.

— Палезь ты, Міхайла, — кажа ён да мядзведзя, — на елку ды паглядзі, ці не ідзе сабака з сваім войскам.

Мядзведзь узлез на елку, прыгледзеўся і кажа:

— Ідзе!

— Ну, дык злазь! — кліча воўк. — Будзем ваяваць.

— Не, не злезу, — адказвае мядзведзь.

— Чаму?

— Страшна.

— Што-ж там за войска такое, што ты гэтак спужаўся? — пытаецца воўк.

— Такое войска, што я ніколі і не бачыў, — адказвае мядзьведзь калоцячыся. — Адзін ваяка тоўсты і калматы, з віламі ідзе; другі — грозны, вусаты, ззаду піку нясе; трэці — у шапачцы чырвонай, і з шпорамі на нагах, шабляю махае... Першы ідзе, галавою трасе ды ўсё крычыць: «Бэ! Я ўсіх пакалю, на вілы пасаджу!» Другі сярдзіта чмыша, па баках азіраецца і ўсё мармыча: «Мне, мне іх давай!» А трэці, ганарысты такі, крычыць: «Куды, куды ісці! Я адзін усіх паб'ю!».

Дзік пачуў гэта ды хутчэй у мох па самыя вушы зашыўся. А воўк бачыць, што не паспее схавацца, — стаў на заднія лапы і стаіць. «Хавайся за мяне, — кажа ён перапалоханаму зайцу. — Яны падумаюць, што я — пень, і абмінуць нас».

Прыходзіць сабака з сваім войскам, бачыць — нідзе нікога няма.

Тут якраз барану рогі засвярбелі. Глядзіць ён — побач нейкі пень стаіць. Разагнаўся баран ды — трах! — рагамі ў пень. У ваўка ад гэтага і галава раскалолася. Паваліўся ён дагары ды ногі выцягнуў. Заяц выскачыў з-пад ваўка, але сабака згледзеў яго і адразу злавіў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дзіку ў гэты час, як на бяду, села муха на вуха. Паварушыў ён вухам, каб сагнаць яе, а кот падумаў, што там мыш. Кінуўся туды ды давай мох разграбаць. Так і дзярэ дзіка вострымі кіпцюрамі! Цярпеў, цярпеў, дзік, а потым усхапіўся ды наўцёкі...

Певень напужаўся дзіка, залопаў крыллямі, узляцеў на елку і нарабіў крыку:

— Куды, куды?

Мядзведзь падумаў, што гэты самы грозны ваяка да яго дабіраецца, і залез з страху аж на верхні сук. Сук не вытрымаў, зламаўся, мядзведзь грукнуўся аб зямлю і забіўся.

З таго часу больш і не сябруюць сабака з ваўком.

П. Пра каго расказваецца ў казцы? Назаві звяроў, якія дапамаглі сабаку перамагчы ваўка? Пра які персанаж казкі, я зараз расказваю: у будцы жыве, дом сцеражэ, гаспадара слухае, ад ворага спасае, добрым сябрам бывае .

П.Здагадайцеся ся пра якіх казачных герояў ідзе гаворка ў наступных казачных радках:

Адзін ваяка тоўсты і калматы, з віламі ідзе, галавою трасе ды ўсё крычыць: «Бэ! Я ўсіх пакалю, на вілы пасаджу!».

Другі — грозны, вусаты, ззаду піку нясе, сярдзіта чмыша, па баках азіраецца і ўсё мармыча: «Мне, мне іх давай”.

Трэці — у шапачцы чырвонай, і з шпорамі на нагах, шабляю махае..., ганарысты такі, крычыць: «Куды, куды ісці! Я адзін усіх паб'ю!».

П. Як схаваліся лясныя звяры ад сяброў сабакі.? Ці дапамагло ім гэта?

П. Паслухай яшчэ раз як сабака перамог ваўка.

Прыходзіць сабака з сваім войскам, бачыць — нідзе нікога няма.

Тут якраз барану рогі засвярбелі. Глядзіць ён — побач нейкі пень стаіць. Разагнаўся баран ды — трах! — рагамі ў пень. У ваўка ад гэтага і галава раскалолася. Паваліўся ён дагары ды ногі выцягнуў. Заяц выскачыў з-пад ваўка, але сабака згледзеў яго і адразу злавіў.

Дзіку ў гэты час, як на бяду, села муха на вуха. Паварушыў ён вухам, каб сагнаць яе, а кот падумаў, што там мыш. Кінуўся туды ды давай мох разграбаць. Так і дзярэ дзіка вострымі кіпцюрамі! Цярпеў, цярпеў, дзік, а потым усхапіўся ды наўцёкі...

Певень напужаўся дзіка, залопаў крыллямі, узляцеў на елку і нарабіў крыку:

— Куды, куды?

Мядзведзь падумаў, што гэты самы грозны ваяка да яго дабіраецца, і залез з страху аж на верхні сук. Сук не вытрымаў, зламаўся, мядзведзь грукнуўся аб зямлю і забіўся.

З таго часу больш і не сябруюць сабака з ваўком.

***Расказванне беларускай народнай казкі “Заяц і вожык”***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне разумець эмацыянальна-вобразны змест казкі, даваць ацэнку дзеянням казачных персанажаў, звязваць змест казкі з рэальнымі падзеямі ў жыцці.

**Матэрыял:**малюнкі да казкі.

**Ход**

П. Адгадайце загадку і знайдзіце адгадку.

"Пад соснамі, пад ёлкамі ляжыць клубок з іголкамі" (Вожык).

П. Адзначце прыкметы, па якіх вы знайшлі адгадку.

П. Паслухайце, пра якога звера гэтая загадка?

" Доўгае вуха, камячок пуха, скача лоўка, любіць маркоўку."

П. Адзначце прыкметы, па якіх вы знайшлі адгадку.

Паслухайце казку пра зайчыка і вожыка. Называецца яна ***"Заяц і вожык".***

У адзін ясны сонечны дзень стаяў вожык каля дзвярэй свайго дому, склаўшы рукі на жываце, і напяваў песеньку. Спяваў ён сваю песеньку, спяваў і раптам уздумаў: «Пайду я на поле ды на сваю бручку зірну. Пакуль мая жонка дзяцей мые ды апранае, я паспею і ў поле схадзіць і вярнуцца дадому».

Пайшоў вожык і сустрэўся па дарозе з зайцам, які таксама ішоў у поле на сваю капусту паглядзець.

— Добры дзень, паважаны заяц! Як вы маецеся?

А заяц быў вельмі важны і горды. Замест таго, каб ветліва прывітацца з вожыкам, ён толькі кіўнуў галавою ды сказаў груба:

— Што гэта ты, вожык, так рана па полі лётаеш?

— Я на прагулку выйшаў, — кажа вожык.

— На прагулку? — запытаўся заяц насмешліва. — А па-мойму, на такіх кароценькіх ножках далёка не зойдзеш.

Пакрыўдзіўся вожык за гэткія словы. Не любіў ён, калі гаварылі пра ягоныя ногі, якія запраўды былі кароткія ды крывыя.

— Ці не думаеш ты, — запытаўся ён у зайца, — што твае ногі бегаюць хутчэй і лепш?

— Вядома, — адказаў заяц.

— А ці не хочаш ты са мною навыперадкі пабегчы? — пытаецца вожык.

— З табою навыперадкі? — кажа заяц. — Не смяшы ты мяне, калі ласка. Няўжо-ж ты на сваіх крывых нагах мяне абгоніш?

— А вось пабачым, — адказвае вожык. — Убачыш, што абганю.

— Ну, давай пабяжым, — кажа заяц.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— Пачакай, — адказвае вожык, — спачатку я схаджу дадому паснедаю, а праз паўгадзіны вярнуся на гэтае месца. Тады і пабяжым. Добра?

— Добра, — сказаў заяц.

Пайшоў вожык дадому. Ідзе і думае: «Заяц, вядома, хутчэй за мяне бегае. Але ён дурны, а я разумны. Я яго перахітру».

Прышоў вожык дадому і кажа жонцы:

— Жонка, апранайся хутчэй, прыдзецца табе са мною ў поле ісьці.

— А што здарылася? — пытаецца вожычыха.

— Ды вось мы з зайцам паспрачаліся, хто хутчэй бегае — я ці ён. Я павінен зайца абагнаць, а ты мне ў гэтай справе дапаможаш.

— Што ты — звар'яцеў? — здзівілася вожычыха. — Ён-жа цябе адразу перагоніць.

— Не твая справа, жонка, — сказаў вожык. — Апранайся хутчэй ды пойдзем. Я ведаю, што раблю.

Апранулася жонка ды пайшла з вожыкам у поле.

Па дарозе вожык кажа жонцы:

— Мы пабяжым з зайцам вось па гэтым доўгім полі. Заяц пабяжыць па адной баразне, а я па другой. А ты, жонка, стань у канцы поля каля маёй баразны. Як толькі падбяжыць пад цябе заяц, ты крыкні: «Я ўжо тут!». Зразумела?

— Зразумела, — адказвае жонка.

Так яны і зрабілі. Завёў вожык жонку на канец свае баразны, а сам вярнуўся на тое месца, дзе пакінуў зайца.

— Ну, што-ж — кажа заяц, — пабяжым?

— Пабяжым, — адказвае вожык.

Сталі яны кожны ў пачатку свае баразны.

— Раз, два, тры! — крыкнуў заяц.

І абодвы яны пабеглі з усіх ног.

Прабег вожык крокаў тры-чатыры, а потым ціхенька вярнуўся на сваё месца і сеў. Сядзіць ды адпачывае. А заяц усё бяжыць ды бяжыць. Дабег да канца свае баразны, а тут вожычыха яму і крычыць:

— Я ўжо тут!

А трэба сказаць, што вожык і вожычыха вельмі падобныя адзін да другога. Здзівіўся заяц, што вожык яго перагнаў.

— Пабяжым цяпер назад, — кажа ён вожыку. — Раз, два, тры!

І пусціўся заяц назад хутчэй. А вожычыха засталася сядзець на сваім месцы.

Дабег заяц да пачатку баразны, а насустрач яму вожык крычыць:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— Я ўжо тут!

Яшчэ больш здзівіўся заяц.

— Пабяжым яшчэ раз, — кажа ён вожыку.

— Добра, — адказвае вожык. — Калі хочаш, пабяжым яшчэ раз.

Так семдзесят тры разы бегаў заяц туды і назад.

А вожык усё яго пераганяў. Прыбяжыць заяц да пачатку баразны, а вожык крычыць: «Я ўжо тут».

На семдзесят чацвёрты раз дабег заяц да сярэдзіны поля ды паваліўся на зямлю.

— Замарыўся, — кажа, — не магу больш бегаць.

— Вось бачыш цяпер, у каго ногі лепшыя?

Нічога не адказаў заяц і пайшоў з поля — ледзь ногі пацягнуў.

А вожык з вожычыхай паклікалі сваіх дзяцей і пашлі з імі на прагулку.

П. Раскажыце, што расказваецца пра зайца ў казцы? І ,сапраўды,

заяц быў вельмі важны і горды. Замест таго, каб ветліва прывітацца з вожыкам, ён толькі кіўнуў галавою ды сказаў груба:

— Што гэта ты, вожык, так рана па полі лётаеш?

— Я на прагулку выйшаў, — кажа вожык.

— На прагулку? — запытаўся заяц насмешліва. — А па-мойму, на такіх кароценькіх ножках далёка не зойдзеш.

П. Раскажыце як расказваецца ў казцы пра тое, як выглядае вожык?

У вожыка ногі былі кароткія ды крывыя.

П. Ці прыбег бы заяц першым, калі б вожыку не дапамагла вожычыха? Чаму?

П. На самой справе, як вы лічыце, ці быў правы вожык? Так, заяц сам сябе наказаў, таму што ён грубы і некультурны.

***Расказванне беларускай народнай казкі “Сава і дзяцел”***

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне разумець яго казкі, даваць ацэнку дзеянням герояў. Развіваць навыкі дыялагічнага маўлення.

**Матэрыял:**малюнкі да казкі, загадкі.

**Ход**

П. Знайдзіце адгадкі на гэтыя загадкі.

Не доктар, а дрэвы лечыць? (Дзяцел.) Удзень спіць, а ўначы крычыць. (Сава.)

П. Паслухайце казку пра гэтых птушак. Яна называецца ***“Сава і дзяцел”.***

Сябравалі некалі сава і дзяцел. Была ўсё добра. Але вось аднаго разу не паспела яшчэ як след развіднець, а дзяцел ужо ўхапіўся за работу. Ён так забарабаніў па старой хвоі, аж

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рэха пайшло па ўсім лесе. У гэты час яго суседка сава толькі ўкладвалася спаць, раззлавалася сава і кажа дзятлу:

-- Ці маеш ты розум, не дасі мне спакойна паспаць.

Здзівіўся дзяцел, як гэта днём ды спаць. Не паслухаў ён саву, а зноў ўзяўся за сваю работу. Мінуў дзень, настала ноч. Усе дзятлавы сваякі моцна заснулі. Заснуў і сам дзяцел. Але раптам ён пачуў крык савы. Узлаваўся дзяцел ды кажа:

-- Чаго ты мяне пужаеш, ідзі спаць!

Але сава не паслухала дзятла, як дзяцел не паслухаў саву. З таго часу і не ладзяць сава і дзяцел паміж сабой. І так у іх пайшло дзень за днём, ноч за ноччу: ні дзяцел, ні сава з таго часу не могуць спаць спакойна.

П. Дзе жывуць сава и дзяцел? Ці ведаеце вы, як выглядае дзяцел? Ці ведаеце вы, як выглядае сава? Знайдзіце гэтых птушак на малюнках. Апішыце гэтых птушак па мадэлях..




П. Які распарадак дня ў дзятла? Як паводзіць сябе ўначы сава? Які час найлепшы для савы, а які – для дзятла? Чаму ні сава, ні дзяцел не могуць спаць спакойна?

***Расказванне беларускай народнай казкі “Дзяцел, лісіца і варона”***

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне разумець змест казкі, эмацыйна і паслядоўна ўзнаўляць яго ў працэсе пераказа.

**Матэрыял:** малюнкі да казкі, загадкі.

**Ход**

П. Знайдзіце на малюнку адгадкі на гэтыя загадкі.

Да яліны, да сасны

Доктар прыляцеў лясны. Дзяцел.

У рыжай разбойніцы

хвост, як мятла.

Ад кары ўцякла –

сляды замяла. Ліса.

Крылы шэрыя,

Чорны хвост,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дзюба моцная.

Ці прысядзе, ці ляціць, -

«Кар, кар, кар!» - усё крычыць.   Варона



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

П. Паслухайце пра гэтых птушак і звяроў  казку  *“Дзяцел, лісіца і варона*

Выдзеўб дзяцел у асіне  дупло, збудаваў гняздо і вывеў дзетак — траіх дзятлянятак. Растуць малыя, а дзяцел цешыцца: «Выгадую, думае, дзяцей — на старасць падмога будзе...» Ды недарэмна кажуць: «Хто-б дзятла ведаў, каб не яго доўгі нос?» Не ўмеў ён радавацца сам сабе, а раструбіў на ўвесь лес пра сваіх дзяцей. Каго ні спаткае — усім хваліцца: «Якія ў мяне слаўныя дзеткі! І разумныя, і прыгожыя. Другіх такіх няма ні ў кога...»

Дачулася пра гэта лісіца. Захацелася ёй маладых дзятлянятак пакаштаваць. Але як-жа іх з гнязда дастаць? На дрэвы лазіць лісіца спрыту не мае.

Дзяцел дзяцей гадуе, — корміць, поіць, а лісіца, каля асіны пахаджвае, зубы выскаляе і ўсё думае, як дзятлянятак ізь свету звесьці.

І надумалася-такі. Падыходзіць аднойчы да асіны ды давай хвастом па камлі стукаць.

Высунуў дзяцел галаву з дупла:

— Што ты, лісічка, робіш? Навошта маіх дзяцей пужаеш?

— Вось як, — кажа лісіца, — дык у цябе і дзеці ёсць?

— Ёсць, — адказвае дзяцел. — І такія-ж слаўныя дзеткі!

— Ну дык выганяй іх вон, ды сам выбірайся, бо я зараз буду дрэва секчы...

— Навошта табе гэта дрэва? — пытаецца дзяцел.

— Як гэта навошта? На дровы папілую, у печы паліць буду!

— Ой, лісанька, ой, матанька! — пачаў прасіцца дзяцел. — Дай хоць дзяцей пагадаваць, тады і сячы сабе дрэва. Куды-ж я цяпер з малымі падзенуся?

А лісіца яшчэ мацней стукае хвастом па дрэву:

— Не магу я чакаць, пакуль ты дзяцей пагадуеш! Хто-ж вінаваты, што ты якраз на гэтай асіне гняздо зрабіў! Мала лесу было, ці што?

— Яно то праўда, — кажа дзяцел, — лесу нямала. Ды хто мог ведаць, што табе гэтая старая трухлявая асіна на дровы спатрэбіцца...

— Трэба было запытацца, раней чым гняздо рабіць, — злуецца лісіца. — Сам вінаваты.

Пачухаў дзяцел сваю стракатую галаву:

— Што-ж мне рабіць, лісанька? Дай раду.

Аблізалася хітрая лісіца, пакруціла хвастом ды кажа:

— Скінь мне адно дзіця, тады не буду секчы дрэва.

Падумаў дзяцел — шкада дзіцяці.

— Пачакай, лісічка, хоць да заўтра, — просіцца ён. — Дай хоць трохі з дзяцей пацешыцца.

— Добра, — згадзілася лісіца. — Прыйду заўтра.

Сядзіць дзяцел у дупле, бядуе і ўсё думае, як яму ад лісіцы ўратавацца. Ды нічога прыдумаць не можа. Нічога не зробіш, прыдзецца аддаць адно дзятлянятка, хоць двое яму застануцца.

Тым часам прылятае да яго ў госці кума — шэрая варона.

— Так і так, — кажа ёй дзяцел, апусціўшы нос. — Не да гасцей мне кумка: маё роднае дзіця лісіца адбірае...

Варона была птушка старая і разумная, не такая, як іншыя.

— Дурань ты, — кажа яна, — не аддавай!

— Дык-жа лісіца дрэва ссячэ і ўсё роўна загубіць нас.

— Гэта яна толькі страшыць цябе. Як прыйдзе заўтра, ты скажы ёй: «Сячы сабе, я цябе не баюся!».

Зарадаваўся дзяцел, падзякаваў вароне-куме за разумную параду і навет добра пачаставаў яе за гэта жукамі-караедамі.

Прыбягае назаўтра лісіца.

— Ну, дзяцел, — кажа, — скідай дзіця, а то зараз дрэва ссяку.

А дзяцел высунуў свой доўгі нос з дупла і кажа:

— Сячы сабе, я цябе не баюся!

Здзівілася лісіца — адкуль толькі дзяцел розуму набраўся?

— Хто цябе навучыў так гаварыць? — пытаецца яна.

— Сваячка мая — варона-кума, — смела адказаў дзяцел.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Узлавалася лісіца на дзятлаву куму — шэрую варону. «Пачакай-жа, — думае, — я ёй не дарую гэтага». І пайшла прэч, глытаючы сліну.

Думала яна, думала, як вароне адпомсціць, і надумалася-такі. Выбегла на палянку, лягла і прыкінулася мёртвай.

Убачыла гэта варона з дрэва. «Эгэ, — зарадавалася яна, — нядрэнная спажыва валяецца».

Тут яна крыллямі — мах, мах! І, як бачыш, каля лісіцы апынулася. Дзяўбанула спачатку ў хвост, каб праверыць, ці сапраўды лісіца мёртвая. А тая — навет не зварухнулася. Ляжыць, як дохлая.

Варона пасмялела, падскочыла да галавы і ўжо намерылася дзяўбануць у вока... А лісіца як усхопіцца ды цап варону за нагу!

— Ага! — зарагатала лісіца, выскаліўшы зубы. — Папалася мне на абед замест дзятляняці. Будзеш ведаць, як дзятла вучыць.

— Ну што-ж, — кажа варона, — перахітрыла ты мяне. Цяпер я толькі аднаго баюся: каб ты не мучыла мяне так, як твая маці мучыла маю маці.

— А як-жа яна мучыла? Нешта я не памятаю.

— Бо ты малая тады была...

— Дык раскажы хоць, — зацікавілася лісіца.

— Добра, раскажу, — згадзілася варона. — Было яно так. Твая маці злавіла маю маці. Вось як ты мяне цяпер.

— Ну, вядома, — перапыніла яе лісіца. — Мая маці была не такая дурная, як твая.

— Так, так, — адказала варона. — Яна, і праўда, была разумная, твая маці, бо не захацела есці маю маці з пер'ем: пер'е-ж нясмачнае!

— Вядома, нясмачнае, — падтакнула лісіца.

— Дык твая маці зрабіла вось як: узяла два рэшаты, пасадзіла туды маю маці, потым склала рэшаты адно да аднаго ды як пусціла з крутой гары, дык на маёй маці ні пярынкі не засталося — усё чыста асыпалася. Брр! — скаланулася варона. — Гэта самая страшная пакута для нас, варон...

«Добра-ж, — падумала лісіца. — Ня буду я дурнейшай за сваю маці».

Дастала яна два рэшаты, пасадзіла туды дзятлаву куму ды і пусціла рэшаты з крутой гары. Рэшаты раз’ехаліся ў бакі, а варона ўзнялася і паляцела на дрэва.

П.Пра каго расказваецца ў казцы? Якая варона ў гэтай казцы, як яе можна назваць ? Раскажы пра яе словамі з казкі.

Варона была птушка старая і разумная, не такая, як іншыя.

П. Ці ўдалося лісіцы перамагчы варону? Чаму?

П. Раскажы, як  варона ашукала лісіцу?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ну што-ж, — кажа варона, — перахітрыла ты мяне. Цяпер я толькі аднаго баюся: каб ты не мучыла мяне так, як твая маці мучыла маю маці.

— А як-жа яна мучыла? Нешта я не памятаю.

— Бо ты малая тады была...

— Дык раскажы хоць, — зацікавілася лісіца.

— Добра, раскажу, — згадзілася варона. — Было яно так. Твая маці злавіла маю маці. Вось як ты мяне цяпер.

— Ну, вядома, — перапыніла яе лісіца. — Мая маці была не такая дурная, як твая.

— Так, так, — адказала варона. — Яна, і праўда, была разумная, твая маці, бо не захацела есці маю маці з пер'ем: пер'е-ж нясмачнае!

— Вядома, нясмачнае, — падтакнула лісіца.

— Дык твая маці зрабіла вось як: узяла два рэшаты, пасадзіла туды маю маці, потым склала рэшаты адно да аднаго ды як пусціла з крутой гары, дык на маёй маці ні пярынкі не засталося — усё чыста асыпалася. Брр! — скаланулася варона. — Гэта самая страшная пакута для нас, варон...

«Добра-ж, — падумала лісіца. — Ня буду я дурнейшай за сваю маці».

Дастала яна два рэшаты, пасадзіла туды дзятлаву куму ды і пусціла рэшаты з крутой гары. Рэшаты раз’ехаліся ў бакі, а варона ўзнялася і паляцела на дрэва.

П. У каго з герояў гэтай казкі вам захацелася б пераўтварыцца? Чаму?

***Расказванне беларускай народнай казкі “Страшны звер”***

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць твор, разумець яго змест, паглыбляць уяўленні дзяцей пра адпаведнасць назвы тэкста яго зместу.

**Матэрыял:**малюнкі да казкі.

**Ход**

П. Паглядзіце на малюнак. Назавіце свойскую жывёлу, што на ім адлюстравана.

П. Паслухайце загадку і назавіце адгадку.

Хутчэй за вецер я скачу.

Куды хочаш даімчу.

Калмата і гулліва

Мая віецца грыва. Конь

А. Бараноўскі.

П. Як вы здагадаліся, што гэта конь?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А цяпер паслухайце казку. Называецца яна ***"Страшны звер".***

Быў у аднаго гаспадара конь. Быў ён дужы, паслухмяны і працавіты. Любіў яго гаспадар і глядзеў, каб быў напоены і накормлены. Але праходзіў час. Конь старэў, і сіла пачала яго пакідаць. Падышла пара яго збываць ды купляць маладзейшага. Шкода гаспадару яго збываць, але што зробіш, калі ўжо такі закон у жыцця.

Павёў тады гаспадар каня да каваля і папрасіў, каб ён яго падкаваў моцнымі, стальнымі падковамі. Як каваль падкаваў, павёў гаспадар каня на луг і сказаў: "Служыў ты мне верна колькі мог, дык дзякуй табе вялікае за тваю службу. А цяпер адпачывай і хадзі дзе хочаш".

Пайшоў гаспадар дамоў, а конь застаўся адзін на волі. Выбіраў ён сабе траву й ваду якую хацеў, грэўся пад сонейкам ды адпачываў.

Доўга ён хадзіў ці мала, ды аднаго разу напаткаўся яму мядзведзь. "Што ты за звер і чаму ясі траву на маім полі?" - кажа ён каню. "Я конь, а хадзіць мне ўсюды дазволіў мой гаспадар". - "Тут я гаспадар, і я цябе з'ем!" - "Добра, але спярша пойдзем да камяня на суд. Хто з нас стукне па камяні нагой так, каб з яго пасыпаліся іскры, той таго і зесць".

Падышлі яны да вялікага каменя. Стукнуў мядзведзь лапай з усёй сілы па камяні раз, пасля яшчэ некалькі раз, завыў ад болю - а іскраў няма. "Цяпер давай ты", - кажа каню мядзведзь. Смаргануў конь падкаванай нагою па камяні - і шугануў сноп іскраў мядзведзю ў вочы. Адскочыў мядзведзь са страху ў бок і пачаў жаласна прасіць каня, каб ён адпусціў яго жывога. "Добра, - кажа конь. - Ідзі сабе куды хочаш, толькі мяне болей не турбуй".

Пайшоў мядзведзь кульгаючы ды пачаў расказваць сустрэчным звярам, што зявіўся ў іхняй аколіцы страшэнны звер, які можа нагой выбіваць з камяня агонь. Пачуў пра гэта леў і сказаў мядзведзю, каб ён завёў яго да таго звера. "Паказаць - дык я пакажу, але да яго ідзі сам. Ён ужо мне раз чуць агнём вачэй ня высмаліў".

Пайшоў леў адзін, але й з ім было тое самае, што зь мядзведзям. Вярнуўся ён назад з апушчанай ад сораму галавой. Па дарозе спаткаўся ён з ваўком і расказаў яму пра ўсё. "А дзе ён знаходзіцца?" - пытаецца воўк. "Ды там, за гарой". - "Падымі ты мяне ўверх, каб хоць здалёк паглядзець". Падняў леў воўка ўверх, ды, мусіць трохі перастараўся, бо ў гэнага аж косьці затрашчэлі, а пасля апусьціў на зямлю. Воўк, трохі аддыхаўшыся, кажа: "Ды такіх зьвяроў я не толькі відаў, але й ядаў. Зараз я з ім распраўлюся". - "Глядзі, будзь асцярожны". - кажа леў.

Прыйшоў воўк да каня і кажа: "Мяне ты не абманеш, і да камяня я з табой на суд не пайду. Я цябе проста задушу, як і многіх тваіх братоў". - "Але як жа ты мяне будзеш есці? Мяне гаспадар абуў у стальныя боты, што я іх і сам не магу скінуць. Давай, можа, як-небудзь удвох іх скінем?" - "Давай". - "Тады я падыму нагу, а ты паспрабуй сцягваць".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Падняў конь заднюю нагу - і толькі воўк хацеў учапіцца за падкову, а ён яму калі ж гэкне ў лоб! Зазвінела ў ваўка ў галаве, засвяціла нейкае полымя ў вачах. Завыў ён ад болю і пакаціўся клубком ад каня. Празь нейкі час ачухаўся, сяк-так падняўся і паплёўся да ільва. "Ну як, з’еў?" - "Ды гэта нейкі не такі конь. Ён толькі падняў нагу, а мяне - як перуном па галаве стукнула. Ды, мусіць, і вока адно высмаліла. Лепей яго не чапаць і здалёк абыходзіць". - "А я ж табе казаў, каб быў асцярожны", - сказаў леў.

З гэтага часу ніхто да каня і блізка не падыходзіў. І жыў ён спакойна аж да самай смерці.

П. Пра каго гэтая казка? Чаму казка называецца “ Страшны звер”? Як сустрэў конь мядзведзя? Чаму спужаўся каня леў? Што адбылося з ваўком у выніку сустрэчы з канём? На самой справе конь страшны звер ці не? А які конь ў гэтай казцы?

**Расказванне казкі «Два зайцы»** *(апр. Якуб Колас)*

**Мэта:** садзейнічаць развіццю ў дзяцей умення адчуваць і разумець характар казкі, узаемасувязь апісанага ў казцы з рэальным жыццём. **Матэрыял:** малюнкі зайцаў

**Ход**

П. Ці расказвалі вам раней казкі пра зайчыкаў. Назавіце казкі, якія вы ведаеце пра зайчыкаў. Якія зайчыкі ў гэтых казках? Паслухайце казку, якая называецца “Два зайцы” *(апр. Якуб Колас).*

**Два зайцы** *(апр. Якуб Колас)*

Сядзяць два зайцы ў лесе пад бярэзінай і жаляцца на сваё жыццё.

— Якая наша доля? Кожны час бойся: бойся чалавека, бойся ваўка, сабакі, ліса. Хадзі ды прыслухайся. І хто не крыўдзіць нас, бедных зайцоў? Не толькі чалавек, звер, а нават птушкі і тыя цікуюць на нашае зайцава мяса. А чым можам бараніцца ад нашых непрыяцеляў? Уся надзея на ногі. Выратуюць яны з бяды — шчасце, а не — прапала твая шкура. І зайцы заліліся горкімі слязьмі.

— Ці ж варта жыць пасля гэтага? Хоць бы адна жывёла на свеце баялася нас, зайцоў… Хадзем, брат, ды ўтопімся ў возеры — раз прападаць. Наплакаліся, надумаліся бедныя зайчыкі і йдуць тапіцца. Возера было блізка. Падыйшлі зайцы да возера, абняліся, пацалаваліся, развіталіся. Толькі яны бліжэй падыйшлі да берагу — скок жаба з купіны: спалохалася зайцоў.

— Эх, брат, — кажа адзін зайчык.

— Ёсць жа на свеце стварэнне, што і нас баіцца. Ім, відаць, яшчэ горай жывецца, як нам. Можна, значыцца,жыць на свеце. І пабеглі зайчыкі назад у лес.

П.Пра каго гэтая казка? Што расказвалі зайцы пра сваё жыццё? Які настрой быў у зайчыкаў, калі яны расказвалі пра сваё жыццё? Чаму зайцы передумалі тапіцца? Як думаеце,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ці перамяніўся у іх настрой, калі яны вырашылі, што яшчэ можна жыць на свеце. Які стаў настрой ў зайчыкаў?

### *Расказванне казкі “Лісіца і жораў”*

**Мэта:** садзейнічаць развіццю ў дзяцей умення адчуваць і разумець характар казкі, узаемасувязь апісанага ў казцы персанажа з адпаведным персанажам ў іншых казках, паглыбіць ўяўленні выхаванцаў пра жывёл і птушак.

**Матэрыял:** малюнкі звяроў і птушак.

**Ход**

П. Ці ведаеце вы казкі пра лісічку. Назавіце гэтыя казкі. Якая лісічка ў гэтых казках?

П. Ці бачылі вы жорава? Знайдзіце гэтую птушку на малюнку.

П. Давайце пагуляем ў гульню “ Жораў”. Станем у пары – дзяўчынка з хлопчыкам, зробім круг, лічылкай выбярэм жорава. Паставім яго ў цэнтры круга Будзем павольна паднімаюць то правую, то левую нагу, імітуючы крокі жорава. У цэнтры круга ходзіць — «жораў». Дзяўчынкі з хлопчыкамі кружацца ў парах. Калі пары пачнуць кружыцца, «жораў» імкнецца забраць якую-небудзь дзяўчынку з пары. Дзяўчаты спяваюць: «Ходзіць жораў // Ходзіць жораў // Так-такі чубаты // Так такі насаты». У гэты час вядучы гаворыць: «Бяры, жораў!» — жораў прапаноўвае дзяўчынцы, якая яму падабаецца, сваю руку і прапаноўвае станцаваць з ёю адзін круг. «Жоравам» у крузе застаецца хлопчык без пары.Пагулялі ў жорава, а цяпер паслухайце казку пра лісічку і жорава.

Называецца яна “**Лісіца і жораў**”.

Сустрэла лісіца жураўля.

— Кумок-галубок, прыходзь да мяне ў госці!

— Добра, — кажа журавель, — прыйду.

Наварыла лісіца рэдзенькага супу, наліла ў блюда. Той журавель лыгаў-лыгаў — ну, ніяк не наеўся. Падзякаваў ён лісіцы і пайшоў. Тады заве лісіцу да сябе. Нагатаваў ён усяго, у вялікую бутэльку накідаў і частуе. Хадзіла лісіца, хадзіла кругом бутэлькі, каб хоць паспрабаваць, ды ніяк не дастане. Раззлавалася яна на жураўля, насварылася на яго і пайшла дадому.

Так у іх дружба і прапала.

П. Пра каго расказваецца ў казцы? Якую страву прыгатавала лісіца жораву, каб яго пачаставаць. Чаму жораву не ўдалося паспрабаваць рэдзенькага супу? Што нагатаваў жораў лісіцы ў пачастунак? Чаму лісіца раззлавалася на жорава? Ці падобна лісічка з гэтай казкі на лісічак з іншых казак?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### *Расказванне казкі “Ліса і цецярук”*

**Мэта:** садзейнічаць развіццю ў дзяцей умення разумець эмацыйна-вобразны змест казкі. Пабуджаць выхаванцаў да паслядоўнай перадачы падзей у працэсе пераказвання казкі па парах.

**Матэрыял:** малюнкі звяроў і птушак.

**Ход**

П. Лісічка жыве ў лесе. Разам з ёй у лесе жыве шмат звяроў і птушак Знайдзіце іх на малюнку і назавіце.




П. Ці ёсць цецярук на гэтым малюнку. Чаму? Так, цецярук гэта птушка, а на малюнку адлюстраваны звяры.

П. Паглядзіце на цецерука.



П. Цецерук птушка, якая жыве на лясных ўзлесках, у далінах буйных рэк.

У цецерука невялікая галава і кароткая дзюба, бліскуча-чорнае апярэнне з фіялетавым або зялёным адлівам на галаве, шыі і ярка-чырвоным бровамі. Валодае добрым

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зрокам і слыхам - у выпадку небяспекі хутка ўзлятае. У моцныя маразы корміцца адзін раз у суткі, ненадоўга выбіраючыся з-пад снегу.

Паслухайце пра цецерука казку. Называецца яна “Лісіца і цецярук”.

Сядзеў цецярук на бярозе, ну і пеў свае песні. Пачула яго ліса і захацелася ёй цецеруком падсілкавацца. Вось яна падышла да дрэва і гаворыць:

— Слухай, цецярук. Ці не чуў ты, што цяпер пайшлі новыя законы, каб усе звяры мірна жылі і адзін аднаго не чапалі. Такі закон ёсць, я яго сама чытала.

А цецярук ёй гаворыць:

— Добрыя законы, але нешта, чую, недалёка сабакі брэшуць, ці не сюды яны бягуць?

Збіраецца ліса ўцякаць, а цецярук ёй кажа:

— Дык пачакай, можа, яшчэ які закон прынясуць. Раз такі закон, каб адзін аднаго не чапаў, то няма ж чаго баяцца.

Ліса гаворыць:

— А можа, яны яшчэ законы тыя не чыталі, то трэба ўцякаць.

І дала драла! Так лісе і не ўдалося абмануць цецерука.

П. Пра каго расказваецца ў казцы?Расскажыце, што вы ведаеце пра лісіцу, якая яна? Ці можна сказаць, што ліса – манюка? Чаму лісе не ўдалося абмануць цецерука?Паслухайце казку яшчэ раз. Давайце паспрабуем яе пераказаць па парах. Я буду расказчыкам, Натуся будзе лісічкай, а Ромка — цецеруком. Паслухайце казку яшчэ раз і будзем яе пераказваць.Казка пераказваецца 3-4 разы.

**Чытанне твора «Легенда пра возера Свіцязь”**

**Мэта:** пабуджаць дзяцей да эмацыйнага разумення зместу легендаў і паданняў, развіваць навыкі дыялагічнага маўлення.

**Матэрыял:** малюнкі розных азёр.

**Ход**

П. Існуе шмат легенд пра ўтварэнне рэк і азёр у Беларусі. Паслухайце легенду пра ўтварэнне возера Свіцязь.

Згодна легенды, на месцы возера Свіцязь стаяў горад, прыгожы як мара. Але аднойчы на Наваградскую зямлю прыйшлі чужынцы. Старыя і маладыя пайшлі змагацца, а ў горадзе засталіся толькі безабаронныя жанкі і дачкі. Калі чужынцы былі пад брамай, а свяцязянкі ўжо былі гатовыя памерці ў полымі, але не скарыцца перад ворагам, адбыўся цуд. Зямля раскалолася і паглынула горад, не аддала яго ворагу. На месцы гораду разлілася незвычайна прыгожае возера, на празрыстай паверхні якога з’явіліся кветкі, якіх больш нідзе няма.

П. Пра ўтварэнне якога возера гаворыцца ў легендзе? Як утварылася возера Свіцязь? Што з’явілася на празрыстай паверхні новага возера?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Расказванне легенды «Як нарадзіліся Нёман і Лоша»**

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць твор, разумець яго змест, паглыбляць уяўленні дзяцей пра адпаведнасць назвы тэкста яго зместу.

**Матэрыял:** карта Беларусі.

**Ход**

П. Давайце паглядзім на карту Беларусі. Пакажыце на карце рэчкі і азёры Беларусі. Вось гэта рэчка Нёман, а гэта – Лоша. Паслухайце легенду пра тое, як нарадзіліся Нёман і Лоша

**Як нарадзіліся Нёман і Лоша**

Пра Нёман расказваюць так. Даўно гэта было. Недалёка ад вёскі Забалацце, што на нашай Уздзеншчыне, з-пад вялікага лазовага куста выбілася крынічка. Вада ў ёй была халодная, як лёд, а чыстая, як дзявочая сляза. Вада тая ўсё прыбывала, большала, аж пакуль не пабегла па двух ручайках. Так вось нарадзіліся рэкі Нёман і Лоша.

Нёман быў шчыры і крэпкі хлапец, а Лоша ціхая, лянівая і хітраватая дзеўка. Яшчэ больш падужэўшы, Нёман аднойчы сказаў Лошы:

— Раздолля трэба мне, волі захацелася. Буду як мага прабівацца да мора.

Нічога не сказала на гэта Лоша, толькі сама сабе надумалася навыперадкі бегчы з Нёманам і першай выскачыць к мору.

Назаўтра, яшчэ не развіднела, яна ціхенька ўстала і пайшла па нізінах ды па далінах да мора.

Прачнуўся Нёман, угледзеў, што Лошы няма, ну й кінуўся наўздагон, не разбіраючы дарогі, напраскі.

З таго часу ён так і ляціць, паспяшае да мора, магутны і шырокі, а Лоша плыве сабе ціха, хаваючыся ды туляючыся па кустах і нізінах.

П. Пра ўтварэнне якіх рэчак расказваецца ў легендзе? З чаго ўтварыліся гэтыя дзве рэчкі? Праз якія мясціны цячэ да мора Неман? Як расказваецца ў легендзе пра яго шлях да мора? Так, у легендзе гаворыцца, што ён “так і ляціць, паспяшае да мора, магутны і шырокі”

П.Праз якія мясціны цячэ да мора Лоша? І сапраўды “ Лоша плыве сабе ціха, хаваючыся ды туляючыся па кустах і нізінах”. Раскажыце словамі з легенды бягуць да мора рэчкі Лоша і Нёман..

**Расказванне легенды «Сож і Дняпро»**

**Мэта:** развіваць у дзяцей уяўленні пра такі жанр фальклора, як легенда, навыкі дыялагічнага маўлення.

**Матэрыял:** карта Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Ход**

П.Давайце паглядзім на карту Беларусі. Пакажыце на карце рэчкі і азёры Беларусі. Вось гэта рэчка Сож, а гэта – Дняпро. Паслухайце легенду  пра ўтварэнне гэтых дзвюх рэчак.

**Сож і Дняпро**

Сярод глухіх пушчаў, цёмных бароў, на прыгорку, стаялі калісь старыя-старыя палацы вялікага валадара, сівога старога Рыдана. З канца ў канец зямлі называлі Рыдана багацеем з багацеяў, а над усім багаццем славілася схаваная за дванаццаццю дзвярамі, дванаццаццю замкамі залатая Рыданава карона. Як адмыкалі замкі, адчынялі дзверы і выносілі тую карону, то, калі на свеце была ноч, яна днём станавілася, а калі была зіма, то перамянялася ў лета — так зіхацела дарагое каменне на залатой Рыданавай кароне.

Зайздросцілі суседнія валадары і князі Рыдану і пастанавілі здабыць карону. Зазвалі варажбітоў і знахароў і загадалі ім прыдумаць, як украсці карону з Рыданавага скарбца.

Варажбіты і знахары думалі тры дні і тры ночы і прыдумалі разрыў-траву, якой, калі дакрануцца замкоў, то самі адчыняцца, ды сон-траву, зярняткамі якой калі пасыпаць, то ўсё жывое наўкола засне. Прыдумаўшы гэта, паслалі злодзеяў красці залатую Рыданаву карону. Тыя, прыйшоўшы пад харомы, сыпнулі сон-зелля, і ўся варта паснула; кранулі разрыў-травой замкоў, і замкі паспадалі. Тады ўзялі яны залатую Рыданаву карону і пайшлі назад.

Устаў раніцой сівы Рыдан, падышоў да акна, ажно глядзь — уся варта покатам спіць, увесь народ у сне беспрабудным валяецца. І зразумеў стары адразу, што няма ў скарбцы ў яго залатой кароны. Падышоў ён тады да звона, ударыў раз, ударыў два, і прачнуліся два Рыданавы сыны: Сож і Дняпро.

Павярнуўся бацька да Дняпра і кажа:

— Вазьмі, сынок, сталёвую зброю, каваны меч і бяжы садамі, лугамі аж да скалістых гор, дагоніш цікунцоў з каронай.

Схапіўся Дняпро і чым хутчэй пабег, а Сож застаўся пры бацьку.

Сеў на залаты пасад стары Рыдан і кажа сыну:

— Прылажы, сынку, вуха да зямлі, паслухай, ці бяжыць Дняпро?

Прылажыў Сож вуха да зямлі і кажа:

— Бегма бяжыць і не стаміўся яшчэ.

І другі раз кажа бацька:

— Прылажы, сынку, вуха да зямлі, паслухай.

Прылажыў сын вуха да зямлі і кажа:

— Бяжыць, але ўжо цяжка дыхае — шум зямлёю ідзе.

І трэці раз сказаў бацька паслухаць сыну. Сын прылажыў вуха да зямлі і кажа:

— Гул зямлёй ідзе і крык вялікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тады ўстаў Рыдан з пасады і кажа:

— Бяжы ж ты, сынку, імхамі, балотамі на падмогу яму, бо сам адзін не праб'ецца ён праз скалістыя горы.

Пусціўся Сож імхамі, балотамі на падмогу брату, а стары бацька застаўся чакаць сыноў.

Доўга чакаў стары. Не дачакаўся, з маркоты вялікай пачаў плакаць:

— Бадай нам, дзеткі мае, слязамі разліцца.— Ды ўлучыў ён такі момант, што сапраўды разліліся слязамі браты і стары бацька: у рэкі ўсе трое змяніліся.

Дняпро плыве садамі ды лугамі, Сож — імхамі ды балотамі, а Рыдан — у свет вочы.

П. Як ўтварыліся рэчкі Дняпро і Сож? Чыімі слязамі яны разліліся? Дзе працякае Дняпро? Намалюй і раскажы. Дзе працякае Сож? Намалюйі раскажы.

**Расказванне легенды "Верабей"**

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць твор, разумець яго змест, спрыяць развіцці дыялагічнага маўлення дзетак.

**Матэрыял:** малюнкі птушак.

**Ход**

П. Давайте паглядзім на малюнкі птушак. Знайдзіце на гэтых малюнках вераб'я. Апішыце вераб'я. Давайце пагуляем у вераб'я.

П. Станьце дзеткі ў кола, пасярэдзіне — «верабей», якога выбярэм лічылкай. Паводзім карагод і заспяваем песню:

Як пайшоў верабей па суметнічку,
Раскідаў, разбіваў усю сямеечку.
Многа нас, многа нас на зямлі, на хлебе.

Пасля гэтых слоў дзеткі разбягаюцца, а «верабей» іх ловіць. Хто злоўлены, той становіцца «вераб'ём». Пагулялі, а цяпер паслухаем легенду пра вераб'я.

Паслухайце легенду пра вераб'я.

**Верабей**

Калі птушкі выбіралі сабе Гаспадара, верабей зрабіў нешта брыдкае, за што яго павінны быць пакараць. Шукаючы паратунку, верабей схаваўся ў дупло, адкуль яго нельга было дастаць. Тады птушкі прыставілі на варту саву і заплацілі ёй па перайку з уласных хвастоў, таму што да гэтага часу сава была без пер'я. Удзень сава заснула, а верабей перабраўся ў іншае дупло. Пасля доўгіх пошукаў зязюля злавіла вераб'я і выдала яго птушкам. Вераб'я жорстка пакаралі і звязалі яму ногі. Таму і да гэтага часу ён не ступае, як іншыя птушкі, а падскоквае, як спутаны.

З-за таго што сава дрэнна стаяла варту, птушкі і дагэтуль вышчыпваюць у яе свае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дарэмна аддадзенае некалі пер'е. Зязюлі, на знак узнагароды за тое, што яна злавіла вераб'я, птушкі дазволілі класці яйкі ў іх гнёзды.

П. Пра каго расказваецца ў легендзе? Пакажыце гэтых птушак на малюнках і назавіце іх. Дзе схаваўся верабей ад іншых птушак?Каго пакінулі вартаваць вераб'я? Ч ым заплацілі птушкі саве за ахову вераб'я? Калі верабей пераляцеў у іншае дупло? Хто знайшоў вераб'я? Як пакаралі птушкі верабъя? Што зрабілі птушкі з савой за тое, што яна дрэнна стаяла вахту?Як узнагародзілі птушкі зязюлю?

**Расказванне легенды «Адкуль пайшлі буслы»**

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне разумець эмацыянальна – вобразны змест легенды, яго характар; навыкі дыялагічнага маўлення.

**Матэрыял:** малюнак бусла.

**Ход**

П. Адгадайце загадку і знайдзіце адгадку на малюнку.

Ляцеў птах цераз дах, сеў на варотах у чырвоных ботах (бусел).

Назавіце адгадку.

П. Паслухайце легенду пра тое ***“Адкуль пайшлі буслы”***

**Адкуль пайшлі буслы**

Было гэта вельмі даўно. На зямлі развялося такое мноства гадаў, што не стала ад іх жыцця ні людзям, ні жывёле. І парашыў адзін чараўнік знішчыць гадаў, патапіць у якойсьці бяздонніцы. Сабраў ён іх у вялізны скураны мяшок, завязаў, узваліў на плечы аднаму неразумнаму чалавеку і загадаў укінуць у паказанае прадонне. Як толькі чалавек рушыў з месца, то ўсе гады, якія былі ў мяшку, заварушыліся, засіпелі, засвісталі. І ўзяла чалавека цікаўнасць, што ён такое прэ.

Чалавек развязаў торбу ды і аслупянеў ад жаху. Гады ж тым часам вылезлі і распаўзліся ізноў па зямлі.

Разгневаны чараўнік не захацеў другі раз збіраць гэтую дрэнь і, накінуўшы на чалавека парожні мяшок, ператварыў яго ў бусла і загадаў збіраць гадаў-уцекачоў усё яго жыццё аж да самай смерці.

І ходзіць гэты ператвораны ў бусла чалавек з накінутым на плечы мяшком па лугах, палях, балотах ды збірае гадаў, але да гэтае пары ніяк сабраць не можа. З прычыны сваёй крэўнасці да чалавека гэты пярэварацень не адыходзіць далёка ад людскіх сяліб і мала баіцца людзей.

П. Апішы бусла? Па высокай траве ходзіць даўганогі бусел.Сваім незвычайным адзеннем і вострай дзюбай ён ярка вылучаецца на фоне зялёнай травы і блакітнага неба. *Паводле В.Вольскага.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

П. Пакажы, як бусел ходзіць па лугах, лясах, балотах. Што любіць есці бусел?

**Расказванне казкі “Пра Быка і яго сяброў”**

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне асэнсоўваць характары персанажаў, жанравыя асаблівасці казкі.

**Матэрыял:** малюнкі хатніх жывёл.

**Ход**

П. Паглядзіце на малюнкі і назавіце жывёл, якія на іх адлюстраваны. Паслухайце казку пра гэтых жывёл. Называецца яна “Пра быка і яго сяброў”.

Пасвіўся на лузе бык. Убачыў ён каля рэчкі туман і напужаўся: падумаў, што зямля і вада гарацъ.

«Пабягу я лепш адгэтуль на край свету!» — парашыў бык. Задраў хвост і пабег. Сустрэўся яму на дарозе казёл:

— Бык, куды бяжыш?

— На край свету.

— Чаго?

— У нас зямля і вада гараць. Баюся, каб і мне не згарэць.

— Пабягу і я з табою.

— Бяжы.

Бягуць яны, а насустрач ім парсюк:

— Куды бежыце?

— На край свету: у нас зямля і вада гараць!

Баімся, каб і нам не згарэць.

— І я з вамі пабягу.

— Бяжы.

Бягуць яны ўтрох. Сустракае іх гусак.

— Куды бежыце?

— На край свету: у нас зямля і вада гараць!

Баімся, каб і нам не згарэць.

— І я з вамі пабягу.

— Бяжы.

Бягуць яны ўчатырох. Сустракае іх певень.

— Куды бежыце?

— На край свету: у нас зямля і вада гараць…

— І я з вамі пабягу.

— Бяжы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Беглі, беглі, прыбеглі ў лес. А тут і зіма надыходзіць. Бык кажа:

— Ну, досыць бегчы: зімою зямля не загарыцца. Давайце будзем хату рабіць ды запасы на зіму рыхтаваць.

Парсюк кажа:

— Мне хата не трэба: я выкапаю сабе яму, нанашу туды моху на падсцілку, жалудоў на харч ды буду зімаваць. Мне і так цёпла будзе!

Казёл кажа:

— А я карою пракармлюся, у дупле пагрэюся.

— А ты, гусак? — пытаецца бык.

— У мяне пер’е цёплае, я дзюбу ў яго схаваю ды так і перазімую.

— А ты, певень?

— А мне што, я і пад ялінкаю перазімую.

Што рабіць? Узяўся бык адзін хату будаваць. Нанасіў бярвення, моху, збудаваў цёплую хату і жыве сабе ў ёй без бяды.

Насталі лютыя маразы. Парсюк круціўся, круціўся ў яме, не вытрымаў ды пайшоў да быка:

— Пусці, бык, у хату: сцюдзёна вельмі.

— Не, — кажа бык, — не пушчу: ты ў мох закапаешся, табе і так цёпла будзе!

— Калі не пусціш,— кажа парсюк, — дык я падкапаю лычом падрубу — твая хата абернецца, ды яшчэ і цябе самога задушыць.

Напужаўся бык: хочаш не хочаш, трэба пускаць парсюка ў хату…

— Ну, добра,— кажа, — ідзі: удвух весялей будзе.

На другі дзень прыходзіць казёл:

— Пусці, бык, у хату.

— Навошта табе хата? Ты ў дупле перазімуеш!

— Ну, калі не пусціш, дык я разганюся, стукну рагамі ў сцяну і праб’ю дзірку: мароз залезе ў хату, табе халадна будзе.

Што рабіць — пусціў казла.

— Добра,— кажа, — хата ў мяне не малая: хопіць і траім месца.

На трэці дзень прыходзіць гусак:

— Бык, бык, пусці ў хату пагрэцца!

— Не пушчу!

— Чаму?

— У цябе пер’е цёплае, ты ў яго дзюбу схаваеш ды так і перазімуеш.

— Ну, калі не пусціш, дык я дзюбаю ўсю страху расцягаю, табе халадна будзе.

Спужаўся бык— пусціў і гусака.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На чацвёрты дзень прыходзіць певень:

— Пусці, бык, у хату!

— А хіба табе пад ялінкаю не цёпла? — засмяяўся бык. — Не пушчу! У мяне ўжо і так цесна.

— А калі не пусціш, дык я ўзлячу на гару і ўвесь пясок са столі зграбу: дух з хаты праз столь выйдзе, ты замерзнеш.

Спужаўся бык — пусціў і пеўня. Жывуць яны ў хаце ўпяцёх. Ідзе мядзведзь. Убачыў хату.

— Хто тут жыве? — пытаецца.

— Бык, казёл, парсюк, гусак і певень,— адказваюць з хаты.

— Пусціце і мяне пагрэцца.

— Не, не пусцім. Ты нам не кампанія.

Мядзведзь стукнуў лапаю ў дзверы, праламаў іх і ўвайшоў у хату. Тут бык выставіў рогі ды прыпёр мядзведзя да сцяны. А казёл давай яму рагамі ў бок лупіць, а парсюк зубамі за жывот ірваць, а гусак у нос дзяўбці… А певень узляцеў на лаву ды давай крычаць: «Кудах-кудах! Куды-куды!» Ледзьве жывым выскачыў з хаты няпрошаны госць— мядзведзь. Ідзе ён кульгаючы па лесе, сустракае ваўка.

— Дзе быў, сусед? — пытаецца ў яго воўк.— Чаму ты такі хмуры?

— Ой,— кажа мядзведзь не сваім голасам, — трапіў я да страшэнных разбойнікаў. Адзін мяне віламі да сцяны прыціснуў — не павярнуцца.

Другі ражнамі ў бок таўчэ. Трэці абцугамі кішкі выцягвае. Чацвёрты прутком у нос коле. А пяты, у чырвонай шапачцы, ззаду шабля крывая, на нагах шпоры, бегае па лаве ды ўсё крычыць: «Падай, падай яго сюды!» Добра, што я ўцёк,

бо не ведаю, што б гэты разбойнік зрабіў са мною…

З таго часу больш ні мядзведзь, ні воўк у тую хату зазіралі.

П. Назавіце хатніх жывёл, пра якіх гэтая казка. Раскажыце, як кожны з хатніх жывёл хацеў перазімаваць? Ці ўдалося ім гэта? Дзе на самой справе яны жылі ў лютыя халады? Як апісаў мядзведзь ваўку казла, парсюка і гусака? Паслухайце, пра каго я расказваю словамі з казкі і назавіце гэтую жывёлу.

“ Сам, у чырвонай шапачцы, ззаду шабля крывая, на нагах шпоры, бегае па лаве ды ўсё крычыць: «Падай, падай яго сюды!»

Ці можна казла, парсюка і гусака назваць сапраўднымі сябрамі быка?

### *Расказванне казкі “ Лёгкі хлеб”*

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне разумець змест казкі, паглыбляць уяўленні дзяцей пра жанравыя асаблівасці казкі; асэнсоўваць характары персанажаў. Фарміраваць навыкі і уменні дыялагічнага маўлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Матэрыял:**малюнкі да казкі.

**Ход**

П. Адгадайце загадку і знайдзіце адгадку.

Мнуць і катаюць,
У печцы закаляюць,
А потым за сталом
Рэжуць нажом.

Хлеб

П. Раскажыце пра хлеб, які ён? А ці бывак хлеб лёгкім?

Паслухайце казку, якая называецца ***“Лёгкі хлеб”***

Касіў на лузе касец. Змарыўся і сеў пад кустом адпачыць. Дастаў торбачку, развязаў і пачаў есці.

Выходзіць з лесу галодны воўк. Бачыць— касец пад кустом сядзіць і нешта есць.

Падышоў да яго воўк:

— Ты што ясі, чалавеча?

— Хлеб, — адказвае касец.

— А смачны ён?

— Дзіва што смачны!

— Дай мне пакаштаваць.

— Калі ласка!

Адламаў касец кавалак хлеба і даў ваўку. Спадабаўся ваўку хлеб. Ён і кажа:

— Хацеў бы я кожны дзень хлеб есці, але дзе мне яго даставаць? Парай, чалавеча!

— Добра, — кажа касец,— навучу цябе, дзе і як хлеб даставаць!258

І пачаў ён вучыць ваўка:

— Перш-наперш трэба зямлю ўзараць…

— Тады і хлеб будзе?

— Не, браце, пачакай. Потым трэба забаранаваць…

— І можна хлеб есці?— замахаў воўк хвастом.

— Што ты, пачакай яшчэ. Раней трэба жыта пасеяць…

— Тады будзе хлеб? — аблізнуўся воўк.

— Не яшчэ. Дачакайся, пакуль жыта ўзыдзе, халодную зіму паразімуе, вясной вырасце, потым закрасуе, потым пачне наліваць зярняты, потым спець…

— Ох, — уздыхнуў воўк, — вельмі ж доўга чакаць. Але цяпер то ўжо я наемся хлеба ўволю!

— Дзе там наясіся! — перапыняе касец. —

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Рана яшчэ. Спачатку спелае жыта трэба зжаць, потым у снапы звязаць, снапы ў бабкі паставіць. Вецер іх правее, сонейка прасушыць, тады вязі іх на ток…

— І есці хлеб буду?

— Які нецярплівы! Спачатку трэба снапы абмалаціць, зярняты ў мяшкі сабраць, мяшкі ў млын завезці ды мукі намалоць…

— І ўсё?

— Не, не ўсё. Муку трэба замясіць у дзяжы і чакаць, пакуль цеста падыдзе. Тады ў гарачую печ пасадзіць.

— І спячэцца хлеб?

— Але, спячэцца хлеб. Вось тады і наясіся яго, — скончыў касец навуку.

Задумаўся воўк, потым пачухаў лапай патыліцу і кажа:

— Не! Гэтая работа занадта марудная і цяжкая. Лепш парай мне, чалавеча, як лягчэй ежу здабываць.

— Ну што ж, — кажа касец, — калі не хочаш цяжкі хлеб есці, параю табе лёгкі. Ідзі на выган, там конь пасецца.

Пайшоў воўк на выган. Убачыў каня:

— Конь, конь! Я цябе з’ем.

— Што ж,— кажа конь, — еш. Толькі спачатку здымі з маіх ног падковы, каб не ламаць табе зубы аб іх.

— І то праўда, — згадзіўся воўк.

Нагнуўся ён падковы здымаць, а конь як стукне яму капытом у зубы…

Перакуліўся воўк ды ходу.

Прыбег да рэчкі. Бачыць — на беразе гусі пасуцца. «Ці не з’есці мне іх?»— думае. Потым і кажа:

— Гусі, гусі! Я вас з’ем.

— Што ж,— адказваюць гусі, — еш. Але спачатку зрабі нам адну паслугу перад смерцю.

— Якую? — пытаецца воўк.

— Паспявай нам, а мы паслухаем.

— Гэта можна. Спяваць я мастак.

Сеў воўк на купіну, задраў галаву і давай выць. А гусі крыламі — мах, мах! Узняліся і паляцелі.

Злез воўк з купіны, правёў гусей вачамі і пайшоў далей ні з чым.

Ідзе ды лае сябе апошнімі словамі: «Ці ж не дурань я, га? Навошта я згадзіўся спяваць гусям?

Ну, цяпер, каго ні сустрэну, — з’ем!»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Толькі ён так падумаў, бачыць — на полі чарада авечак пасецца, а пастух спіць. Наглядзеў воўк у чарадзе самага большага барана, схапіў яго і кажа:

— Баран, баран, я цябе з’ем.

— Што ж,— кажа баран, — такая мая доля.

Але каб не мучыцца мне доўга ды і табе каб не ламаць зубы аб мае старыя косці, стань лепш вунь у той лагчынцы і разяў рот, а я ўзбягу на ўзгорак, разганюся і сам ускочу табе ў рот.

— Дзякуй за параду, — сказаў воўк. — Так і зробім.

Стаў ён у лагчынцы, разявіў рот і чакае. А баран узбег на горку, разагнаўся ды — трах! — рагамі ваўка ў галаву. Аж іскры пасыпаліся з вачэй у ваўка, свету ён не ўбачыў.

Ачухаўся воўк, пакруціў галавою і разважае:

— Цікава: з’еў я яго ці не?

А тым часам касец скончыў работу і ідзе дахаты. Пачуў ён ваўковы словы і кажа:

— З’есці не з’еў, але паспытаў лёгкага хлеба.

П. Цяпер вы ведаеце, ці бывае лёгкі хлеб на самой справе?

П. Раскажыце, якую работу неабходна выканаць, каб атрымаўся смачны хлеб.

***Расказванне казкі “Як кот звяроў напалохаў”***

**Мэта:** паглыбляць уяўленні дзетак пра адпаведнасць назвы тэкста яго зместу, жанравыя асаблівасці казкі; фарміраваць уменне прытрымлівацца логіцы і паслядоўнасці падзей пры пераказванні казкі.

**Матэрыял:**малюнкі да казкі.

**Ход**

П. Знайдзіце адгадкі на гэтыя загадкі.

Ён прысмакаў з'еў нямала,
а калі харчоў не стала,
лапу смокчучы, заснуў,
ледзьве не праспаў вясну.

Мядзведзь.

У рыжай разбойніцы
хвост, як мятла.
Ад кары ўцякла –
сляды замяла.

Ліса.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лёг вусаты, а ўстаў гарбаты.

Кот.

П. Пакажыце гэтых звяроў на карцінках і раскажыце пра іх. Як вы лічыце, ці можа кот напужаць мядзведзя і ваўка? Паслухайце казку, якая называецаа "Як кот звяроў напалохаў".

Жылі дзед ды баба. І быў у іх кот. Дзед кашалі плёў, баба кудзелю прала, а кот паляваць на мышэй хадзіў.Вось пайшоў раз кот на паляванне і заблудзіўся. Шукаў, шукаў, а дарогу дамоў не знайшоў.

Сеў пад ялінай і плача. Бяжыць лісіца. Убачыла ката — загледзелася: ніколі яшчэ такога звера ў сваім лесе не сустракала.

— Ты хто такі будзеш? — пытаецца.

— Я Кот Мурлыковіч.

— А чаго ты плачаш, Кот Мурлыковіч?

Расказаў ёй кот аб сваёй прыгодзе.

— Хе, — кажа лісіца, — каб больш тае бяды!

Ідзі да мяне жыць. Будзеш у мяне за гаспадара.

— Добра, — кажа кот.

Вось прыходзіць ён да лісіцы. А ў яе курэй— і смажаных, і вараных!..

Наеўся кот і спаць уклаўся. Тым часам бяжыць па лесе воўк: топ-топ, шлёп-шлёп! Пачула лісіца, выскачыла з хаты ды як закрычыць:

— Хто гэта ў маім лесе стукоча-тупоча? Хто майму гаспадару спаць не дае?

— А хто ж у цябе гаспадар? — пытаецца воўк.

— У мяне не гаспадар, а гаспадарышча, хвост з памялішча: як махне, дык адразу заб'е.

Узяла ваўка цікавасць. Ён кажа:— А ці нельга было б, кумка, хоць адным вокам паглядзець на твайго гаспадара?

— Паглядзець-то можна, — адказвае лісіца,— але без падарунка лепш не прыходзь. Мой гаспадар падарункі любіць.

— Добра, будзе падарунак, — сказаў воўк і пабег далей.Вярнулася лісіца ў хату.

А тым часам ідзе па лесе мядзведзь: трэсьлом, трэсь-лом, трэсь-лом!

Пачула лісіца, выскачыла з хаты ды як закрычыць зноў:

— Хто гэта ў маім лесе трашчыць? Хто майму гаспадару спаць не дае?

— А хто ў цябе гаспадар? — пытаецца мядзведзь.

— У мяне не гаспадар, а гаспадарышча, хвост з памялішча: як махне, дык адразу заб'е.287

І мядзведзя ўзяла цікавасць: які такі гаспадар у лісіцы, што хвастом усіх забівае? Вось ён і кажа:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— А ці нельга было б, лісічка-сястрычка, хоць паглядзець на твайго гаспадара?

— Паглядзець можна, — кажа лісіца, — толькі без падарунка не прыходзь. Мой гаспадар падарункі любіць.

— Добра, падарунак будзе, — сказаў мядзведзь і пайшоў далей.

Прабеглі яшчэ дзік-сякач і заяц-шарак. Лісіца і іх сваім гаспадаром напалохала.

Сабраліся звяры і моцна задумаліся: якія ж падарункі лісіцынаму гаспадару прынесці?

Думалі-гадалі, нарэшце мядзведзь і кажа:

— Вось што, браткі, трэба смачны абед згатаваць ды ў госці яго з гаспадыняй запрасіць. Тады ўсе разам і паглядзім.

— Добра, няхай будзе так,— згадзіліся звяры.

І тут яны зноў моцна задумаліся: які абед згатаваць? Думалі-гадалі, нарэшце мядзведзь і кажа:

— Я прынясу мёду калоду.

— А я — барана,— кажа воўк.

— А я — жалудоў, — кажа дзік.

— А я — салодкай капусты, — кажа заяц.

Згатавалі абед і пачалі раіцца, каму запрашаць.

Мядзведзь кажа:

— Я тоўсты, мне хадзіць цяжка.

Воўк кажа:

— Я і так набегаўся, мне ногі баляць.

Дзік кажа:

— А я складна гаварыць не ўмею.

А заяц нічога не сказаў. Вось і парашылі паслаць яго, як лягчэйшага на ногі.

Прыбег заяц да лісіцынай хаты, пастукаў лапкай у шыбіну, зажмурыўся ад страху ды прапішчаў спалоханым голасам:

— Дзень добры вам, шаноўныя гаспадары! Прасілі мядзведзь, воўк і дзік, каб вы ласкавы былі, да іх у госці прыйшлі.

Сказаў так адным духам ды ходу назад. Падрыхтаваліся звяры гасцей сустракаць.

Сядзяць ля багатага стала, чакаюць, аб лісіцыным гаспадару разважаюць.

Вось заяц і кажа:

— Не, браткі, сядзець так боязна. Хто яго ведае, які там гаспадар у лісіцы! А што, калі ён абеду нашага не ўпадабае ды ўсіх нас хвастом пазабівае. Давайце лепш схаваемся і спярша здалёк на яго паглядзім.

Згадзіліся звяры з мудрай зайцавай парадай ды пачалі хавацца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мядзведзь на дуб узлез, дзік у мох зашыўся, воўк пад куст забраўся, а заяц у траве схаваўся.

Тым часам узяла лісіца пад руку свайго гаспадара, і пайшлі яны ў госці.

Прыходзяць на палянку. Чуе кот — мясам запахла. Бачыць — цэлы баран ляжыць. Тут ён поўсць наставіў, вусы натапырыў ды адразу на барана накінуўся.

Есць ды ўсё бурчыць: «Мяў-у, мяў-у!»

Звяроў аж страх узяў. Ім здалося, што ён крычыць: «Мала, мала!»

— Ну і звяруга! — кажа воўк. — Мне б і за дзень з такім рагалём не ўправіцца, а яму на раз мала…

Дзік ляжаў, ляжаў у моху ды ад страху пачаў хвастом варушыць. Кот падумаў, што мыш з норкі вылазіць. Скокнуў туды і ўчапіўся кіпцюрамі ў дзікаў хвост.

Як схопіцца дзік, як кінецца наўцёкі! Толькі галлё трашчыць.

Кот напужаўся ды скок на дуб!

— Ну, — думае мядзведзь,— гэта ён мяне ўбачыў. Трэба ратавацца, пакуль не позна.

Грымнуўся мядзведзь з дуба проста на куст, пад якім воўк сядзеў. А таму здалося, што гэта сам лісіцын гаспадар на яго напаў. Усхапіўся воўк ды ходу далей ад бяды! А мядзведзь за ім: трэсь-лом! трэсь-лом!

Уцякалі яны так, што заяц іх ледзьве праз гадзіну дагнаў. Дагнаў і кажа:

— Каб не паслухалі мяне ды не схаваліся, ён бы нас усіх з’еў! Ну і страшэнны звер!

А кот з хітрай лісіцай нагасцяваліся ды пайшлі сабе дахаты.

П. Пра каго расказваецца ў казцы? Раскажыце пра сустрэчу лісы з катом (ваўком, мядзведзем). У беларускага народа ёсць прыказка

“ Баязліваму страх вочы коле”. Ці можна гэтак жа сказаць пра мядзведзя і воўка? Перакажыце, як закончылася казка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Расказванне казкі «Верабей і мыш”***

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць твор, разумець яго змест, асэнсоўваць характары персанажаў. Фарміраваць навыкі і уменні выбарачнага пераказу казкі.

**Матэрыял:**малюнкі да казкі.

**Ход**

П. Знайдзіце адгадкі на гэтыя загадкі.

Маленькі шарык пад лаўкаю шарыць.

Мыш.

Шапачка маленькая,

Камізэлечка нятканая,

Кафтанік рабенькі,

Ды ходзіць босенькі.

Верабей.

П. Пакажыце вераб'я і мыш на карцінках і раскажыце , дзе яны жывуць і чым харчуюцца. Паслухайце казку. Называецца яна ***"Верабей і мыш".***

Жылі па суседству верабей і мыш: верабей пад страхою, а мыш у норцы пад падрубаю. Жывіліся тым, што ад гаспадароў перападала. Улетку яшчэ сяк-так — можна на полі ці ў агародзе што-небудзь перахапіць. А зімою хоць плач: на вераб'я гаспадар сіло ставіць, а на мыш— пастку.

Надакучыла ім так жыць, задумалі яны збажыну сеяць.

— Ну, што будзем сеяць? — пытаецца верабей.

— А тое, што людзі сеюць, — адказвае мыш.

Назбіралі насення ды пасеялі пшаніцу.

— Што тваё будзе, — пытаецца мыш у вераб'я,— карэнне ці вяршкі?

— Сам не ведаю.

— Бяры карэнне,— параіла мыш.

— Добра, няхай будзе карэнне.

Прыйшло лета. Паспела пшаніца. Мыш зжала каласы, а вераб'ю пакінула салому. Перанесла мыш каласы ў сваю нару, змалаціла, змалола, напякла пірагоў ды есць сабе зімою. Добра жыве, бяды не мае.

А верабей пакаштаваў салому— нясмачная!

Давялося яму на сметніку галоднаму зімаваць.

Прыйшла вясна. Мыш вылезла з нары, убачыла вераб'я і пытаецца:

— Ну, як, суседзе, зімавалася?

— Дрэнна,— кажа верабей, — ледзьве выжыў: нясмачная наша пшаніца ўдалася.

— То давай будзем сёлета моркву садзіць: яна салодкая. Усе зайцы яе любяць.

— Давай, калі не хлусіш! — падскочыў верабей ад радасці.

Пасеялі яны моркву.

— Што тваё будзе,— пытаецца мыш у вераб'я,— карэнне ці вяршкі?

— Вяршкі! — кажа верабей. — Баюся браць карэнне: я ўжо на пшаніцы апёкся.

— Добра, бяры вяршкі.

Вырасла морква. Верабей узяў вяршкі, а мыш карэнне. Занесла яна сваё карэнне ў нару і есць сабе патроху.

А верабей пакаштаваў вяршкі, аж яны не лепшыя за пшанічнае карэнне…

Надзьмуўся верабей, ледзь не плача.

Ляціць варона. Убачыла вераб'я.

— Чаго ты, верабей, надзьмуўся?— пытаецца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Расказаў ёй верабей, як яны з мышшу сеялі пшаніцу і моркву.

Выслухала яго варона і зарагатала на ўсё горла:

— Дурны ты, верабей! Мыш цябе падманула… У пшаніцы смачныя вяршкі, а ў морквы — карэнне.

Узлаваўся верабей, прыскакаў да мышы.

— Ах, нягодніца, ах, ашуканка! Я з табою біцца буду.

— Ну, што ж, — кажа мыш, — давай біцца!

Запрасіў верабей сабе на дапамогу драздоў і шпакоў, а мыш — кратоў і пацукоў.

Пачалі біцца. Доўга біліся, а ніхто нікога не пабіў. Прыйшлося вераб’ю адступіць са сваім войскам на сметнік.

Убачыла гэта варона:

— Га, га, верабей, слабых ты сяброў сабраў. Калі б ты паклікаў марскога сокала, той адразу б усіх— і мышэй, і кратоў, і пацукоў паглытаў.

Паляцеў верабей на мора, паклікаў марскога сокала.

Прыляцеў сокал і ўсё мышынае войска паглытаў. Адна толькі мыш, тая, што вераб’я падманула, засталася: у нару схавалася.

Настаў вечар. Сокал паляцеў на ржышча начаваць. Сеў на каменне ды моцна заснуў. А верабей пашчабятаў ад радасці і палез пад страху.

Тым часам хітрая мыш пабегла ў поле да начлежнікаў, ухапіла галавешку і падпаліла ржышча, дзе спаў сокал. Узняўся агонь і асмаліў сокалу крылы. Прачнуўся сокал, а ў яго крылаў няма. Пабедаваў ён ды падаўся пехатою да мора. Убачыў яго на дарозе паляўнічы, хацеў застрэліць, а сокал і кажа:

— Не страляй мяне, добры чалавек. Лепш вазьмі з сабою: як адрастуць у мяне крылы, я табе добра аддзякую.

Узяў паляўнічы сокала. Цэлы год карміў і даглядаў яго. Адраслі ў сокала крылы, ён і кажа паляўнічаму:

— А цяпер бяры мяне на паляванне. Я табе зайцоў і птушак буду лавіць.

З таго часу сокал і служыць памочнікам у паляўнічага.

П. Пра каго расказваецца ў казцы? Што спачатку пасеялі мыш і верабей? Як падзялілі паміж сабой мыш і верабей пшаніцу? Што прыгатавала з пшаніцы мышка? Ці сытна было вераб’ю пасля сабранага ўраджаю? Што пасеялі мыш і верабей на другі год? Чаму на другі год яны вырашылі пасадзіць моркву? Правільна, таму што яна салодкая і ўсе зайцы яе любяць. Як падзялілі паміж сабой моркву мыш і верабей? Ці застаўся задаволены верабей ад сабранага ўраджаю. Паслухайце казку яшчэ раз. Перакажыце ўрыўкі з казкі пра тое, што сеялі мыш і верабей і як дзялілі ураджай паміж сабой.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Расказванне казкі “Кот Максім”***

**Мэта:** актывізаваць у дзяцей уяўленні і вобразнае мысленне ў працэсе ўспрымання казкі, паглыбляць уяўленні дзяцей пра адпаведнасць назвы тэкста яго зместу, развіваць у іх уменне асэнсоўваць характары персанажаў. Фарміраваць у выхаванцаў навыкі і уменні вобразнага маўлення ў працэсе пераказа асобных урыўкаў казкі.

**Матэрыял:**малюнкі да казкі.

**Ход**

П. Паглядзіце на гэты малюнак. Ці падобны гэты кот на звычайнага? Апішыце ката на малюнку, раскажыце які ён. Паслухайце казку,якая называецца яна ***“Кот Максім”***

Жылі дзед і баба. Мелі яны сына і ката. Сына звалі Марцін, а ката— Максім.

Памерлі дзед і баба. Застаўся Марцін з катом Максімам. Марцін гультай быў вялікі, усё на печы ляжаў, а кот яму ежу насіў: то птушку дзе зловіць, то каўбасу ці сала ў суседзяў украдзе…

Вось так жылі яны, жылі — згарэла хата, адна гліняная печ засталася.

— Што рабіць будзем? — пытаецца кот у гаспадара. — Трэба хату будаваць.

— Ат, — кажа Марцін, — навошта нам хата? Хопіць і печы.

Пажылі яны з год на печы, а тут і печ развалілася.

— Што рабіць будзем? — зноў пытаецца кот у гаспадара.

— Ты, — кажа Марцін,— як сабе хочаш, а я надумаўся жаніцца: вазьму багатую жонку, яна мне пабудуе хату.

— Хто за такога гультая пойдзе замуж? — смяецца кот.— Ты ж толькі любіш ляжаць на печы, у цябе і выгляд нечалавечы.

— Пойдзе! — кажа Марцін.— Няма чаго смяяцца! Сама цароўна пойдзе. Ідзі, Максім, да цара.

Скажы яму — так і так, пан Марцін, па прозвішчы — Глінскі-Папялінскі, сватаецца да тваёй дачкі. Ну і зрабі ўсё, як трэба: нагавары яму, што

багацейшага за мяне пана ва ўсім царстве не знайсці…

— Цяжкую ты загадаў мне службу, пане Марцін Глінскі-Папялінскі,— кажа кот.

— Нічога, ідзі, а то папругі дастанеш!— пагразіў яму гаспадар.

— Ну што ж, паспрабую шчасця.

Нанасіў кот гультаю Марціну яды ў запас, каб той з голаду не памёр, сам выправіўся ў далёкую дарогу.

Ідзе ён, ідзе, прыходзіць у лес. Бяжыць насустрач заяц.

— Куды, кот, ідзеш? — пытаецца ён.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— Да цара.

— Чаго?

Кот падумаў і кажа:

— На суд.

— На які суд?

— Праўды хачу дайсці.

— Якой праўды?

— А вось якой. Дзе што кошка ўкрадзе або нашкодзіць— усё на ката звальваюць. Кот, кажуць, смятану злізаў, кот сала ўкраў… А ката там і бліз-
ка не было. Не магу я цярпець такога паклёпу на сябе.

— Пайду хіба і я з табою! — кажа заяц.

— Чаго?

— Таксама на суд. Дзе што зайчыха зробіць— усё на зайца кажуць. Хто ў садзе прышчэпы папсаваў? Заяц! Каго сабакі ганяюць? Зайца! А там зусім і не заяц быў, а зайчыха. Не магу я няславы цярпець. Пайду да цара на суд.

— Дык што ж ты адзін пойдзеш? — кажа кот.— Хто табе на судзе паверыць? Там трэба сведак мець.

— А ты чаму адзін ідзеш?

— Ну, у мяне іншая справа. Там у мяне дзядзькі, бацькі, дзяды, браты жывуць. Усе па слову скажуць, мне і павераць. Вось каб ты набраў сотні тры сведак, тады можна смела ісці.

Як пакоціцца заяц, як наробіць крыку на ўвесь лес:

— Дзядзькі, бацькі, дзяды, браты, хутчэй бяжыце сюды!

Тут, як бачыш, з усіх бакоў пасыпаліся зайцы.

Назбягалася іх цэлая чарада.

Прывёў кот Максім зайцоў да царскіх палацаў. Бачыць— на двары вялікі хлеў стаіць. Кот і кажа зайцам:

— Пачакайце вы ў гэтым хляве. Скончыцца мой суд, тады я вашу скаргу падам цару.

Зайцы паскакалі ў хлеў, а кот — бразь!— ды і зачыніў іх там на засаўку.

Ідзе ён да царскіх палацаў падскокваючы, у ладкі плешчучы. Узыходзіць на ганак, стукае ў дзверы:

— Адчыніце!

Адчыніў яму салдат-вартавы.

— Чаго трэба? — пытаецца.

— Пакажы, дзе цар жыве.

Салдат паказаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Увайшоў кот Максім у вялікі пакой, а там цар сядзіць.

— Добры дзень, ваша царская мосць!

— Добры дзень, каток! — адказвае цар.— Што скажаш?

— Ды вось прыслаў табе мой гаспадар, пан Марцін Глінскі-Папялінскі, гасцінчыка.

— Дзе ж той гасцінчык?

— У хляве.

Прыйшоў цар у хлеў, паглядзеў, а там поўна зайцоў, няма як зачыніць.

— Мусіць, дужа багаты твой гаспадар, калі гэтулькі зайцоў прыслаў? — дзівіцца цар.

— Мусіць, у яго яшчэ больш ёсць?

Павёў цар ката ў палацы, накарміў, напаіў ды яшчэ і на дарогу ў торбу даў. А пра дачку змаўчаў.

Вярнуўся кот Максім дахаты. А яго гаспадар ледзьве дыхае: усе катовы запасы даўно паеў.

Развязаў кот торбу, дастаў адтуль усё, што з дарогі засталося, і пачаў карміць гаспадара.

Акрыяў сяк-так пан Глінскі-Папялінскі ды пытаецца ў ката:

— Ну, што табе цар сказаў?

— Нічога цікавага, — кажа кот.

— Дык ідзі яшчэ раз да цара. Толькі нанасі мне больш ежы ў запас.

Нанасіў кот яму ежы, а сам зноў пайшоў да цара. Прыходзіць у лес, а тут насустрач яму воўк:

— Куды ідзеш, кот?

— Да цара.

— Чаго?

— На суд.

І расказаў ваўку, на які суд ён ідзе. Воўк кажа:

— Дык і я пайду з табою! Мяне таксама часта дарэмна лаюць.

— Аднаму табе суд не паверыць,— кажа кот.

— А ты чаму адзін ідзеш?

Пачуў пра гэта кот Максім. Паклікаў ён свайго гаспадара ўбок і шэпча яму:

— Не бойся! Усё добра будзе.

Запрэглі царскія конюхі самых лепшых коней у самую лепшую карэту. Сеў цар у карэту і паехаў. А кот наперадзе пабег— дарогу паказваць.

Едзе цар, едзе, пад'язджае да маёнтка Змея Гарынавіча. Кот наперадзе бяжыць. Бачыць: пастухі вялікую чараду кароў пасуць. Падбягае ён да пастухоў.

— Чые вы? — пытаецца.

— Змея Гарынавіча.

Кот натапырыў вусы, грозна стаў:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— Не кажыце нікому, што вы пастухі Змея Гарынавіча, а кажыце — Марціна Глінскага-Папялінскага. Бо за мною Гром з Перуном — ён заб'е вас.

Сказаў так кот Максім і пабег далей. Сустракае вялікую чараду коней. Падбег так кот да конюхаў і пытаецца:

— Чые вы, конюхі?

— Змея Гарынавіча.

— Не кажыце нікому, што вы Змея Гарынавіча, а кажыце — пана Глінскага-Папялінскага. Бо за мною ляціць Гром з Перуном — ён заб'е вас.

Тым часам царская карэта з громам пад'ехала да пастухоў.

— Чые вы? — пытаецца ў іх цар.

— Пана Марціна Глінскага-Папялінскага,— адказваюць пастухі.

— О, — дзівіцца цар, — багаты пан Глінскі-Папялінскі!

Гэтак жа адказалі конюхі.

Пакуль цар ехаў, кот прыбег у двор Змея Гарынавіча. Убачыў самога Змея і крычыць:

— Хавайся, Змей Гарынавіч! Едзе Гром з Перуном — ён цябе заб'е і на муку сатрэ.

Спужаўся Змей Гарынавіч:

— Куды ж мне схавацца?

Кот паглядзеў і ўбачыў вялікае дупло ў старой ліпе.

— Лезь хутчэй сюды! — кажа Змею.

Залез Змей у дупло, а кот забіў дупло паленам ды яшчэ і глінаю замазаў. Потым пабег да Змеевых слуг.

— Чые вы? — пытаецца.

— Змея Гарынавіча.

— Не кажыце нікому, што Змея Гарынавіча,

а кажыце, што пана Марціна Глінскага-Папялінскага. Бо за мною ляціць Гром з Перуном — ён заб'е вас.

— Добра, — кажуць напалоханыя слугі.

Прыехаў цар у маёнтак Змея Гарынавіча. Слугі кінуліся сустракаць яго.

— Чый гэта маёнтак? — пытаецца цар.

— Пана Марціна Глінскага-Папялінскага!— у адзін голас адказалі слугі.

— Ну, што ж, — кажа цар, — сапраўды багаты пан Глінскі-Папялінскі. Аддам за яго дачку.

Тут вярнуўся цар у свае палацы, паклікаў музыкаў і загадаў іграць вяселле.

Усяго там было: хто што хацеў, тое піў і еў. І я там быў, еў і піў, па барадзе цякло, а ў роце не было.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

П. Пра што расказваецца ў казцы? Ці бывае тое, пра што расказваецца ў казцы ў сапраўдным жыцці? Як дапамог Кот Максім Марціну стаць багатым панам Глінскім-Папялінскім? Што чароўнага было ў гэтай казцы. Перакажыце той ўрывак з казкі, які вам спадабаўся больш за астатнія.

***Расказванне казкі "Два маразы"* (апр. Якуб Колас)**

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне разумець эмацыйна-вобразны змест казкіт, паглыбляць уяўленні дзяцей пра адпаведнасць назвы тэкста яго зместу, асэнсоўваць характары персанажаў. Фарміраваць навыкі і уменні звязнага вобразнага маўлення у працэсе пераказу асобных урыўкаў казкі.

**Матэрыял:**малюнкі да казкі.

**Ход**

П. Раскажыце, якія зімовыя прыкметы вы ведаеце. У прыказцы гаворыцца: " Мароз трашчыць – моцны холад кліча". Маразы і халады – гэта асноўныя прыкметы зімы. Паслухайце казку пра маразы. Называецца яна ***"Два маразы"***.

Гулялі па полі два маразы, два родныя браты: мароз Сіні-нос і мароз Чырвоны-нос. Гуляюць-пагульваюць маразы, адзін аднаго пахвальваючы. А ноч ясная-ясная. Прасторна маразам на волі. А ціха, так ціха, нібы жывой душы не засталося на свеце. Перабеглі маразы з поля на лес. Бегаюць, палускваюць, з дрэва на дрэва пераскокваюць, зайчыкаў палохаюць. З лесу ў вёску заскочылі і давай па даху страляць.

— Эге,— кажа мароз Сіні-нос, — усе пахаваліся, баяцца на двор вылезці.

— Няхай толькі вылезе хто: задамо яму страху,— адкавае мароз Чырвоны-нос.

Пачало развідняцца. Паваліў з комінаў дым густы. Заскрыпелі калодзежы. Павыходзілі мужчыны з хат. Хто малаціць пайшоў, хто ў лес па дровы збіраецца.

— Стой жа, брат, — сказаў мароз Чырвоны-нос.

— Пабяжым жа мы на дарогу ў поле. І пабеглі яны зноў у поле; стаяць, прытуліўшыся, падарожных чакаюць. Заскрыпелі сані на дарозе. Зазваніў дзесь званочак пад дугою. У санях селянін сядзіць, коніка паганяе. А ззаду за ім зухаўскі вазок плыве. Званочак пазвоньвае.

— Ну чакайце ж вы, — кажа мароз Сіні-нос.

— Ты бяжы за мужыком, а я за панам паганюся. І пабеглі яны падарожных марозіць. Доўга бег мароз Сіні-нос, пакуль пана дагнаў. Нарэшце дагнаў, пад футра залез, цяпло выганяе адтуль.

Паціскаецца пан, ногі зябнуць, холад па целе пайшоў, панскі нос пасінеў. А мароз Сіні-нос толькі пасмейваецца. Ледзь да смерці пана не замарозіў. А мароз Чырвоны-нос дагнаў селяніна і давай яго марозіць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— Эге, мароз не жартуе, — кажа селянін. Злез ён з саней, бяжыць, нагамі тупае, рукамі аб плечы б’е. Прабег так з паўвярсты, аж горача стала яму. Сеў сабе на сані, едзе — і гора мала.
— Ну пачакай ты, брат: прайму я цябе, як ты дровы сячы будзеш. Заехаў чалавек у лес. А мароз Чырвоны-нос выперадзіў яго, у лесе чакае. Выпраг коніка селянін, сякеру ўзяў ды як пачаў секчы — горача стала яму. Скінуў кажух і давай там белыя кросны ткаць. Зрабіўся кажух белы як снег. Насек дроў чалавек, да кажуха ідзе, а ён увесь абмёрз.
— Эге, браток, дык ты тут! Узяў пугаўё ды як стаў малаціць— ледзь жывы выскачыў мароз Чырвоны-нос ды драла ў лес. Узлаваўся мароз Чырвоны-нос на селяніна, але ніякай рады даць яму не можа.

П.Пра каго расказваецца ў казцы? Калі прыходзяць да нас маразы? Ці аднолькава паводзілі сябе  селянін і пан ў лютыя маразы? Перакажыце казку ад імя Мароза Чырвонага носа. Перакажыце казку ад імя Мароза Сіняга носа.

***Расказванне верша М. Танка “Ехаў казачнік бай”***

**Мэта:** развіваць ўменне дзяцей заўважаць асаблівасці паэтычнай мовы.  вызваць у выхаванцаў эмацыянальны водгук на вершаваныя радкі.

**Матэрыял:** малюнкі з розных казак.

**Ход**

П. Якія ў вас любімыя казкі?  Хто вам расказвае казкі? Паслухайце верш М.Танка пра казачніка. Называецца ён “Ехаў казачнік Бай”.
Расказванне верша « Ехаў казачнік Бай».

П.  Пра што расказваецца ў вершы?  Якімі радкамі заканчваецца верш? Чаму дзеткі  увесь час адказвалі « бай», а напрыканцы вершыка адказалі
« Не»?
Паслухайце верш яшчэ раз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Расказванне казкі Ул. Дубоўкі “ Як сінячок да мора лётаў”***

**Мэта:** актывізаваць слоўнік выхаванцаў па тэме “Птушкі”, развіваць іх здольнасць заўважаць асаблівасці паэтычнай мовы, Падтрымліваць у выхаванцаў жаданне самастойна выразна пераказваць пэўную частку  казкі.

**Матэрыял:** карцінка “ Птушкі”

**Ход**

П. Паглядзіце на малюнак, назавіце ўсіх птушак, што на ім адлюстраваны. Ці ведаеце вы гэтую птушку? Так, гэта сінічка. Сініца – адна з самых вядомых птушак. Жыве яна ў парках і садах. Акрамя дупла, яна можа пабудаваць гняздо ў адтуліне сцяны, паштовай скрыні. З задавальненнем займаюць сінічкі і шпакоўні. Сініцы – вельмі рухомыя і спрытныя

птушкі. На зіму гэтыя птушачкі не ляцяць у цёплыя краіны, але ў пошуках корму зграйкі пералятаюць з месца на месца. Там, дзе корму шмат, сініцы затрымліваюцца. Падкормліваючы, іх можна ўтрымаць у сваім садзе. Сініцы прыносяць вельмі вялікую карысць лясах, парках і садах. Вялікая сініца за суткі з'ядае столькі насякомых, колькі важыць сама.

П. Апішыце сінічку на малюнку (па мадэлі).

Паслухайце казку пра сінічку. Называецца яна “Як сінячок да сонца лётаў”. Напісаў яе Уладзімір Дубоўка.

Расказванне казкі “Як сінячок да сонца лётаў”

П. Ці спадабалася вам казка**?** Пра што расказваецца ў казцы? Чаму сінячок да сонца лётаў? Паслухайце яшчэ раз урывак з казкі, дзе расказваецца як сінячок прасіў у сонца агонь, будзем вучыцца яго пераказваць.

Ляцеў, ляцеў і прыляцеў.
Вясёлым голасам запеў.

Сваім вясёлым спевам тым
здзівіў ён сонейка зусім.

— Адкуль узяўся ты, сіняк,
не зразумею я ніяк!

За ўсе мінулыя вякі
ў мяне ты першы госць такі! —

Маленькі гэты сонцаў госць
і расказаў пра ўсё, як ёсць.

— Нялёгкі людзі маюць лёс.
Мяне прасілі, каб прынёс
адну іскрыначку для іх
з агнёў палаючых тваіх!

— Прыдумаць не магу ніяк,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

што і сказаць табе, сіняк!

Калі агню табе я дам,
як занясеш яго людзям?

Пакуль пабачыш ты свой бор,
ці сам згарыш, ці твой убор!

— Ляцець памалу буду я.
— Не спаліць іскарка твая!

— Ну што, сіняк, з табой рабіць!
— Агонь, як бачыш сам, гарыць!

Вазьмі лучынку, прыпалі.
Нясі, як зможаш, да зямлі!

Лучынку ўзяў ад сонца ён,
заціснуў дзюбкаю цаўё,

пасля лучынку прыпаліў
і паляцеў з ёй да зямлі...

Перакажыце гэты урывак самастойна.

***Чытанне апавядання В. Віткі “Страшная казка”***

**Мэта:** замацоўваць ў дзяцей уменне разумець змест твора, яго сэнс. Пабуджаць выхаванцаў да адказу на пытанні па змесце апавядання. Выхоўваць пачуццё любві да роднай мовы.

**Матэрыял:** малюнкі да казак.

**Ход**

П. Якія казкі вы ведаеце?Назавіце сваю любімую казку? Чаму яна вам падабаецца? Паглядзіце на гэтыя малюнкі, назавіце з якіх яны казак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ






Паслухайце казку В. Віткі. Называецца яна ***“Страшная казка”***

П. Пра каго расказваецца ў казцы? Ці на самой справе казка страшная? Чаму дзеткі не хацелі адпускаць бабульку ў госці? Каго яны спужаліся ўначы? Чым закончылася казка? Як бы паступілі на месцы дзяцей вы?

***Расказванне верша С. Грахоўскага “Сонечная сцежка”***

**Мэта**: развіваць у дзяцей уменне эмацыйна ўспрымаць вершы, разумець змест вершаваных тэкстаў і успрымаць рытм вершаваных радкоў, садзейнічаць развіццю непасрэднасці ў выкананні верша дзецьмі напамяць .

**Матэрыял:** малюнкі восені

**Ход**

П. Надышла восень.На дарожцы, па якой вы сёння ішлі ў дзіцячы садок, было шмат жоўтых і барвовых лісцікаў.Ці падобны іх колер на колер сонейка? Здаецца, што ідзеш у дзіцячы садок не па залацістых лісціках, а па сонечнай сцежцы.

П. Паслухайце верш С. Грахоўскага, які так і называецца “ Сонечная сцежка”.

Расказванне верша педагогам.

П. Як расказваецца ў вершы пра лістапад? Што высцілае лістапад? Як паэт называе сцежку з сонечных лісцікаў? Куды па “сонечнай дарожцы” прыходзяць дзеткі “ кожнай раніцай з ахвотай”? Як праводзяць выхаванцы свой час ў дзіцячым садзіку? А як праводзіце свой час ў дзіцячым садку вы?

Паслухайце яшчэ раз як праводзяць свой дзень выхаванцы дзіцячага садка.

Кожнай раніцай з ахвотай
Мы прыходзім на работу.
Ляльку трэба расчасаць
І кружочкі напісаць,

Збудаваць пясчаны дом,
З'есці кашу з малаком

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І кату пачысціць боты.

Ой, як шмат у нас работы!

П. Ці падобны Ваша дзейнасць на дзейнасць дзяцей у дзіцячым садку на дзейнасць малых дзетак ў вершы?

П. Паслухайце верш цалкам яшчэ раз. Будзем вучыцца расказваць яго па парах. Першы раскажа пра тое, як “лісты апускаюцца на дол” і “спрытна ходзяць ножкі сонечнай дарожкай”, а другі пра тое, што кожнай раніцай з ахвотай дзеткі прыходзяць ў дзіцячы садок і займаюцца markрознымі справамі.

***Чытанне апавядання Клаўдзіі Каліны “Верасень”***

**Праграмны змест:** замацоўваць ў дзяцей уменне разумець змест твора, яго сэнс. Пабуджаць выхаванцаў да гутаркі па змесце тэкста.Выхоўваць пачуццё любві да роднай прыроды.

**Матэрыял:** малюнкі родных краявідаў.

**Ход**

П. Якія восеньскія месяцы вы ведаеце? Назавіце першы месяц восені. Якія змены адбываюцца ў прыродзе ў верасні? Паслухайце апавяданне К. Каліны ***“Верасень”.*** Чытанне апавядання педагогам..

П. Чаму пра верасень гавораць, што ён багаты і ў яго залатыя шаты? Якія змены абыліся з надыходам верасня ў садзе? Як змяніўся лес у верасні? Якія змены абыліся з надыходам верасня ў полі і лузе? Куды кліча верасень дзетак? Чаму верасень называюць багатым месяцам? Штоб вы папрасілі ў верасня з яго восеньскіх дароў для сябе?

***Расказванне верша П. Панчанка “Месяцы года”.***

**Мэта:** замацаваць веды дзяцей аб месяцах года, іх вобразных характарыстыках; падтрымліваць у выхаванцаў жаданне самастойна расказваць верш напамяць. Развіваць у дзяцей выразнасць голасу пры чытанні верша, уменне выражаць свае ўяўленні ў вобразным слове. Вызваць у іх пачуццё захаплення перад прыгажосцю роднай прыроды.

**Матэрыял:**малюнкі або фотаздымкі восеньскіх пейзажаў.

**Ход**

П. Памятаеце казку пра дванаццаць месяцаў. Дванаццаць месяцаў складаюць цэлы год. Ці можаце вы пералічыць месяцы года? Назавіце вясновыя месяцы? (летнія месяцы? восеньскія месяцы? зімовыя месяцы?).Паслухайце, як расказвае паэт Пімен Панчанка пра кожны месяц года ў вершы ***“Месяцы года”.***

П. Пералічыце месяцы, пра якія расказваецца ў вершы. Пра якія восеньскія месяцы ідзе размова ў вершы? Які першы месяц восені, другі, трэці?

Паслухайце яшчэ раз, як прыгожа пра гэтыя месяцы расказвае П. Панчанка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Спелы яблычны верасень,

Багаты кастрычнік

У празрыстасці чыстай, крынічнай,

Лістапад – залаты лістапад.

П. Давайце разам раскажам пра розныя перыяды восені. “Спелы яблычны верасень” – гэта які перыяд восені? (*ранняя восень).* Знайдзіце на малюнках раннюю восень і растлумачце, чаму вы выбралі гэтыя малюнкі.

“ Багаты кастрычнік у празрыстасці чыстай, крынічнай” – гэта... *( інтанацыяй запрасіць дзяцей да адказу)... сярэдзіна восені*. У гэтую пару восені часта ідуць ... *дажджы.* Неба бывае *...пахмурным, ...* . Знайдзіце малюнкі, на якіх адлюстравана сярэдзіна восені. Растлумачце, чаму вы выбралі гэтыя малюнкі.

“Лістапад – залаты лістапад” – гэта... позняя восень. Лісце ападае на ... *зямлю.* Дрэвы стаяць амаль што ... *голыя.* Знайдзіце малюнкі, на якіх адлюстравана позняя восень. Растлумачце, чаму вы выбралі гэтыя малюнкі.

П. Давайце пераўтворымся ў дванаццць месяцаў і раскажам верш. Кожны месяц раскажа пра сябе (інсцэнізацыя верша 2-3 разы). Напрыканцы можна прапанаваць расказаць верш цалкам. Паслухайце верш яшчэ раз і будзем расказваць.

***Расказванне вершаў П. Броўкі “Надыход восені”, Я.Коласа “Адлёт жураўлёў”***

**Мэта:** замацаваць веды дзяцей аб восеньскіх прыкметах, вызваць у іх эмацыянальны водгук на малюнкі прыроды восенню, жаданне выразіць свае ўяўленні ў вобразным маўленні. Пабуджаць дзяцей да параўнання апісання восеньскай прыроды ў вершах і ў рэпрадукцыі карціны В.К. Бялыніцкага-Бірулі “Задумлівыя дні восені”

**Матэрыял:** рэпрадукцыя карціны В.К. Бялыніцкага-Бірулі “Задумлівыя дні восені”

**Ход**

П. Паглядзіце на рэпрадукцыю карціны В.К. Бялыніцкага-Бірулі . Якую назву можна даць гэтай карціне? Якія прыкметы, адлюстраваныя ў карціне, вам падказалі, што гэта восень? Паслухайце, як апісваюцца восеньскія прыкметы ў вершы П. Броўкі “Надыход восені”.

Расказванне верша педагогам.

П. Ці супадаюць прыкметы восені, адлюстраваныя ў рэпрадукцыі карціны, з прыкметамі восені ў вершы? Як вы думаеце, на рэпрадукцыі карціны адлюстравана ранняя восень ці позняя? Пра якую пару восені расказваецца ў вершы? Раскажыце словамі з верша аб надыходзе восені. Паслухайце яшчэ раз як расказваецца пра надыход восені ў вершы?

Непрыкметна зусім –

Прыплыве павуцінкай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гляне жоўтым лістком

З-пад зялёнай хусцінкі.

У вершы гаворыцца, што восень зачаруе агнём маладзенькай рабіны. Як можна расказаць пра гэтую прыкмету восені інакш? Як вы растлумачыце выраз з верша, што восень "на адлёце крылом памахае буслiным"? Так ўвосень птушкі ляцяць у цёплыя краіны. Паслухайце, як гэтую пару апісвае Якуб Колас ў вершы ***"Адлёт жураўлёў"***

П. Апішыце словамі з верша, тую пару восені, калі птушкі ляцяць у вырай.

Паслухайце яшчэ раз як пра гэта гаворыцца ў вершы?

Замірае лета,

Заціхаюць далі,

Сірацее рэчка,

Халадзеюць хвалі.

У бязмежным небе

Роўненькім шнурочкам

Жураўлі на вырай

Мкнуцца над лясочкам.

Намалюйце восень, але не фарбамі, а словамі з вершаў. Ці падабаецца вам гэтая пара года? Чаму?

***Адгадванне вершаваных загадак Р. Барадуліна "Загадкі на градках"***

**Мэта:** замацаваць уяўленні дзяцей пра жанравыя асаблівасці, прызначэнне загадак, іх адрозненне ад твораў другіх жанраў, развіваць у выхаванцаў уменне адгадваць вершаваныя загадкі. Садзейнічаць развіццю ў дзяцей ўмення самастойна падбіраць азначэнні для апісання агародніны.

**Матэрыял***:*агародніна ( натуральныя прадметы або муляжы)

**Ход**

П. У народзе кажуць: "Вясна багатая кветкамі, а восень палеткамі", "Увосень за стол просім", "Увосень кожная хата пладамі багата". Якую агародніну збіраюць увосень на градках? Паслухайце верш Рыгора Барадуліна ***"Загадкі на градках***", знайдзіце адгадкі на загадкі ў кошыку з агароднінай.

**Загадкі на градках**

У гародзе каля градак

Шмат цікавых ёсць загадак.

Той, хто градкі даглядае,

Той загадкі адгадае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

От бабуля важна села
і глядзіць навокал смела.
У зямлю схавала лапаць,
як зачэпіш – будзеш плакаць.
Гэта злосная бабуля
Называецца ...(цыбуля).

Пра што гэтая загадка?
Як вы здагадаліся, што гэта цыбуля?
Якія прыкметы цыбулі падказалі вам адгадку.
З кім параўноўваецца цыбуля ў загадцы? Чаму?

У бабулі родны брат
Ласкавейшы быццам,
А да слёз давесці рад,
Так, як і сястрыца.
Ты не вельмі плач, сынок,
Калі шчыплецца ...(часнок).

Назавіце яшчэ раз адгадку.
Якія аднолькавыя прыкметы ў часнака і цыбулі?

Не сыдзе з месца
Ні на крок,
Зарыўшыся ў пярыну.
Цярэбіць ціхі вецярок
Зялёную чупрыну.
Ды выцягнуць з перыны –
Пачырванее небарак .
Вядома, што гэта ... ( бурак).

П. Пра што гэтая загадка? Як вы разумеце выраз “зялёная чупрына”? Скажыце іншымі словамі. Што азначае выказванне, што бурак не сыдзе з месца ні на крок, зарыўшыся ў пярыну.З чым параўноўваецца ў загадцы зямля? Якога колеру заўжды бурак? Паслухайце загадку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гэта што за важны туз,

Хвост зялёны,

Чэпкі вус?

Усім вядомы карапуз

Пузан Пузанавіч ... (гарбуз)

П. Якая тут адгадка? Якія прыкметы гарбуза падказалі вам адгадку? Пералічыце іх. Чаму гарбуз ў загадцы называюць Пузан Пузанавіч? Малайцы, правільна адгадалі ўсе загадкі з градкі. Скажыце, а што такое загадка? Як яна адрозніваецца ад верша? апавядання? Тыя загадкі, што вы адгадвалі былі падобныя на вершы або не? Чым гэтыя загадкі адрозніваюцца ад вершаў? Сапраўды, у загадцы прадмет не называецца і неабходна самому здагадацца пра што ідзе размова. Што дапамагло вам адгадаць гэтыя загадкі? Так, па першае рыфма (аднолькавыя хвосцікі напрыкацы радкоў верша), а па-другое апісанне прыкмет агародніны. Паспрабуйце самі апісаць агародніну, каб потым вы маглі складаць пра яе загадкі.

цыбуля, якая? ... *горкая, залацістая, круглая, расце на градцы*

бурак – *круглы, бардовы,чырвоны, цвёрды, расце на градцы*

морква – *аранжавая, доўгая, салодкая, расце на градцы*

гарбуз -- *круглы, жоўты, унутры зерне, расце на градцы*

агурок – *зялёны, доўгі, расце на градцы, у бочцы салёны*

памідор – *чырвоны, круглы, сакавіты, расце на градцы, мяккі*

бульба – *жоўтая, круглая або авальная, цвёрдая, смачная, калі зварыць, расце на градцы.*

П. Пагуляем у гульню “Агароднік”.

Кожны з вас называе сябе якой-небудзь агароднінай (рэпай, рэдзькай, цыбуляй, морквай, радыскай і г.д.) і стане ў круг. Аднаго выбярэм з дапамогай лічылкі агароднікам. Агароднік выходзіць на сярэдзіну круга і стукае палкай аб зямлю. У яго пытаюцца:

—Хто там?

—Агароднік!

—Чаго прыйшоў?

—Рэпу ўзяць!

Пасля такога адказу ўсе вядуць карагод і спяваюць:

Зверху рэпа зялёная,

У сярэдзіне тоўстая,

К канцу вострая.

Хавае хвост пад сябе.

Хто да яе не падыдзе,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Усялякі за віхор возьме.

Агароднік павінен адгадаць, хто з дзяцей назваў сябе рэпай. Калі ён адгадае, рэпа ўцякае, інакш агароднік зловіць яе і павядзе ў свой агарод.

*Правілы гульні: агароднік не павінен ведаць, хто назваўся рэпай; адгадваць ён можа тры разы, калі не адгадае, яго мяняюць.(3-4 разы)*

П. Паслухайце яшчэ раз верш " Загадкі на градках", Наступны раз паспрабуем скласці свае загадкі пра агародніну, аб якой вы пачулі ў гэтым вершы.

## *Расказванне вершаў Я. Коласа "Зіма", Я. Купалы " У зімовым лесе", Я. Коласа " Дзед-госць"*

**Мэта:** замацаваць веды дзяцей аб прыкметах зімы, вызваць эмацыяльнальны водгук на карціны зімовай прыроды, жаданне выразіць свае ўяўленні ад паэтычнага апісання зімовых пейзажаў ў вобразным слове. Падтрымліваць у выхаванцаў жаданне самастойна чытаць верш напамяць. Развіваць у дзяцей выразнасць голасу пры чытанні верша.

**Матэрыял:** ілюстрацыі зімовых пейзажаў

**Ход**

П. Паглядзіце на гэты пейзаж.



Пейзаж «Зімовая дарога» : А.Саврасов

П. Якая пара года на ім адлюстравана? Якія прыкметы вам падказалі, што гэта зіма? Здагадайцеся, якую пару года апісвае Я. Колас у сваім вершы?

Расказванне верша Я. Коласа "Зіма" педагогам.

П. Дайце назву гэтаму вершу. Пералічыце зімовыя прыкметы, пра якія вы пачулі ў вершы( надышлі марозы, рэчкі пад лёдам, бярозы ў шэрані, дарогі замяло снегам, травы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лісточкі пад пялёнкай белай -- пад снегам). У вершы паэт піша, што рэчка амярцвела, змоўклі ручаёчкі. Чаму? Што з імі стала?

П. Я. Колас параўновае зімовы лес са старым дзедам з доўгімі вусамі. Доўгія вусы гэтага дзеду гэта галінкі дрэў, пакрытыя снегам.

Апусціў галіны
І стаіць журботна,
Зрэдку верхавіны
Зашумяць маркотна.

У якіх радках верша расказваецца пра тое, што намалявана на карціне? Паслухайце яшчэ раз гэтыя радкі.

Мяккая пярына
Вочы адбірае.
Белая раўніна –
Ні канца ні краю.

П. Спадабаўся вам гэты верш? Паслухайце яшчэ адзін верш пра зіму. Напісаў гэты верш Я. Купала.

Расказванне верша Я. Купалы « У зімовым лесе».

П. Пра што расказваецца ў вершы? Як апісвае зімовы лес Я. Купала ў сваім вершы? Дзе залёг пушаны снег? Што ён атуліў сабой? Паэт гаворыць пра снег, што ён пушаны (пушысты), а якім яшчэ бывае снег? Зіма гэта не толькі белы снег, але яшчэ і моцны мароз, і …*пералічыце іншыя зімовыя прыкметы* . Узімку да нас у госці заўжды прыходзіць Дзед … - Мароз. Народны пісьменнік Беларусі Я. Колас напісаў пра яго верш, і назваў яго «Дзед-госць»?

П. Паслухайце гэты верш.

Расказванне верша « Дзед-госць» педагогам.

П. Як вы лічыце, чаму ў гэтага верша такая назва - «Дзед-госць»? Пералічыце словамі з верша, якія справы ў белабародага дзеда ўзімку?(засцілае рэчкі лёдам, сыпле іней на бярозы, туліць дрэвы лёгкім пухам, пакрывае травы, лозы белай воўнаю – кажухам). З чым параўноўваецца снег у вершах пра зіму?

( з белай воўнаю – кажухам, з белаю пялёнкай, з мяккай пярынай). З чым бы параўналі снег вы, калі б складалі пра яго верш? Паслухайце гэтыя вершы яшчэ раз.

**Чытанне апавядання К. Каліны "Зімовы Дуб"**

**Мэта:** замацоўваць ў дзяцей уменне разумець змест твора, яго сэнс. Пабуджаць выхаванцаў да пераказвання асобных частак апавядання.. Выхоўваць пачуццё любві да роднай прыроды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Матэрыял:** малюнкі аб зімовага лесу

**Ход**

П. Як змяняецца выгляд дрэў увосень? Якія дрэвы не змяняюць свой убор?

П. Пра які месяц расказваецца ў апавяданні? Які гэта месяц: восеньскі або зімовы? Давайце разам прыпомнім, якія змены адбываюцца ў наваколлі ў гэты месяц. "Дрэвы нізка кланяюцца Лістападу, сцелюць да яго ног… пажоўклае лісце. Адляцелі ў вырай…птушкі, звяры …пахаваліся ў зацішак, апусцелі …палі". Але лістапад незадаволены зменамі. Чаму ? Каго прасіў Лістапад дапамагчы скарыць Зімовы Дуб? Ці дапамаглі Лістападу вятры буйныя, дажджы халодныя мароз пякучы, маразы, завеі, снегам скарыць Зімовы дуб? Як выглядае дуб усю зіму? Так, стаіць ён ў сваім мядзяным адзенні. Толькі вясною ненадоўга скідае яго, каб пераапрануцца ў новае, зялёнае. За гэта называюць яго Зімовым Дубам. Паслухайце апавяданне яшчэ раз. Будзем яго пераказваць па ролях. Я буду выконваць ролю расказчыка. Паўлік будзе лістападам, а Вадзік – зімовым дубам. ( перказваюць 2-3 разы).

***Завучванне верша Я. Коласа "На рэчцы зімою"***

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне адчуваць і разумець характар вобразаў паэтычных твораў, засвайваць паслядоўнасць развіцця сюжэта, заўважаць выразна-выяўленчыя сродкі. Падтрымліваць у дзяцей жаданне самастойна расказваць урывак з верша напамяць. Развіваць у выхаванцаў выразнасць голасу пры чытанні верша па ролях.

**Матэрыял:** ілюстрацыі зімовых пейзажаў

**Ход**

П. Назавіце вашы любімыя зімовыя забавы і гульні ? Узімку рэчка замярзае. І дзеці, і дарослыя могуць катацца па лёдзе на каньках. Паслухайце верш, які называецца "На рэчцы зімой", напісаў яго Я. Колас.

П. Пра якую пару года ідзе размова ў вершы? Куды просіцца хлопчык у маці? Раскажыце словамі з верша, як хлопчык просіцца ў маці на рэчку.

Мамачка-галубка! –
Можа б ты на рэчку
Пагуляць пусціла?
Я не буду доўга,
Зараз жа вярнуся,
Трошачкі на рэчцы
У санках паважуся.

П. Раскажы гэтыя радкі, ты Міколка, але расказвай так, каб адчувалася твая пяшчота і любоў да маці. Раскажы ты, Вадзік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

П. Аб чым папярэджвае маці хлопчыка? Паслухайце яшчэ раз яе папярэджванне.

Ну, ідзі пабегай,
Толькі апраніся
Ды, глядзі, ў палонку,
Сынку, не ўваліся.

П. Цяпер раскажы ты Маша, аб чым папярэджвае маці хлопчыка.

Ну, ідзі пабегай,
Толькі апраніся
Ды, глядзі, ў палонку,
Сынку, не ўваліся.

П. Хто яшчэ з вас хоча расказаць, як маці папярэджвае малога хлопчыка.

Паслухаце верш яшчэ раз. Будзем расказваць верш разам па ролях. Хто з вас хоча быць хлопчыкам, хто – маці. Паслухайце яшчэ раз гэты верш цалкам. Цяпер будзем па ролях яго расказваць. Я буду чытаць гэты верш за аўтара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Чытанне апавядання Таццяны Бушко “ Сняжынка”***

**Мэта:** развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць твор, разумець яго змест, паглыбляць уяўленні дзяцей пра адпаведнасць назвы тэкста яго зместу.

**Матэрыял:** малюнкі рэальных жыццёвых сітуацый, якія адлюстроўваюць жыццё і гульні дзяцей.

**Ход**

П. Адгадайце загадку і знайдзіце адгадку.

Улетку кропелькай была,
Вясёлаю дажджынкай,
А іней лёг,
Зіма прыйшла —
Зляцела ўніз...

П. Паслухайце апавяданне Таццяны Бушко **«Сняжынка».**

П. Як выглядаюць сапраўдныя сняжынкі? Ці здагадаліся вы, чаму сняжынкі прападалі? Паслухайце апавяданне яшчэ раз. Намалюйце сняжынкі такімі, якімі вы іх пабачылі.

***Расказванне вершаў М. Багдановіча пра зіму.***

**Мэта:** пазнаёміць дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту з вершамі М. Багдановіча, садзейнічаць развіццю ўмення дашкольнікаў разумець вобразную мову вершаў, практыкаваць іх ў падборы сінонімаў, у апісанні зімовай прыроды.

**Матэрыял:** ілюстрацыі, на якіх адлюстраваны зімовыя пейзажы.

**Ход**

П. Паглядзіце на гэтыя ілюстрацыі. Назавіце зімовыя прыкметы, якія на іх адлюстраваны.Паслухайце верш М. Багдановіча ***“Зімой”***

П. Якая пара сутак апісваецца ў вершы? Якія радкі з верша сведчаць, што на двары стаіць марозны, звонкі вечар? Паэт піша пра сінеючыя снягі, пра пакрытае срэбнай рызаю (пакрывалам) раздолле. Пра снег гаворыцца, што ён скрыпучы, мяккі. Якімі яшчэ прыгожымі словамі можна рассказаць пра снег? Ці заўважалі вы, якія змены назіраюцца ў прыродзе ў час завірухі? Раскажыце. Паслухайце, як расказвае пра завіруху ў сваім вершы ***“Завіруха”***

М. Багдановіч.

П. Як апісвае паэт завіруху? У час завірухі у бубны дахаў вецер *... б’е,.. што яшчэ ён робіць? ... грыміць па ім, ...звініць,... пяе.* Ці выходзяць дзеці гуляць ў завіруху? Чаму? Як пра завіруху можна сказаць інакш ?( завея, бура, пурга). Апішыце зімовы дзень у любую пару сутак: уранку, днём, увечары. Раскажыце, як выглядае неба, якія дрэвы, якая зямля, што робяць дзеці.

***Расказванне верша Я. Коласа “Песня аб вясне”***

**Мэта:** узбагачаць слоўнік выхаванцаў па тэме “Вясна”, развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць вершы, разумець змест вершаваных тэкстаў, успрымаць рытм вершаваных радкоў. Падтрымліваць у дзяцей жаданне самастойна чытаць радкі з верша напамяць.

**Матэрыял:**малюнкі з вясновымі замалёўкамі, http://youtu.be/Xl-5Ln4dxrk

**Ход**

П. Нарэшце прыйшла вясна. Паглядзіце замалёўкі пра надыход вясны (http://youtu.be/Xl-5Ln4dxrk). Ідзе вясна. Абуджае лугі, палі – усё наваколле. Птушкі спяваюць песні вясне.

П. Прыгожы верш пра вясну напісаў вядомы беларускі паэт Я. Колас.
Называецца верш “Песня аб вясне”.

Расказванне верша педагогам

П. Раскажы словамі з верша пра вясновы ручаёк. А цяпер паслухай, як пра гэта расказваецца ў вершы.

Звоніць, скача, як дзіцятка,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гэты жэўжык-ручаёк.

На яго, бы тая матка,

Сонца кідае свой зрок.

А ён, гучны і смяшлівы,

Так і ходзіць аж дрыжыць,

І другі сябрук шчаслівы

Насустрэч яму бяжыць.

Паслухайце верш яшчэ раз. Раскажыце напамяць яго першы слупок.

Уцякай, мароз-дзядуля,

Чуеш ты, стары, ці не?

На пагорках — булі-гулі! —

Песні чуюцца вясне.

П. Паспрабуйце расказаць гэтыя радкі з інтанацыяй просьбы да дзядулі-мароза. Радкі верша расказваюцца пакуль ёсць жадаючыя.

***Чытанне верша «Вясна» В. Віткі.***

***Завучванне верша «Пралеска» В. Вярбы***

**Мэта:** развіваць уменне адчуваць і разумець паэтычную мову верша, падтрымліваць у дзяцей жаданне самастойна чытаць верш напамяць. Развіваць у выхаванцаў выразнасць голасу пры чытанні твора, інтанацыйна перадаваючы радасць абуджэння вясновай прыроды.

**Матэрыял:**букет пралесак.

**Ход**

П. Паглядзіце, які прыгожы букецік кветак? З якіх кветак гэты букет? Калі цвітуць гэтыя кветкі? Назавіце першыя вясновыя кветкі, якія вы ведаеце? Паслухайце верш В. Віткі "Вясна"

П. Што за дзіва прынесла вясна ў лес? Як прыгожа называецца вясновая кветачка ў вершы? Так кветачка параўноўваецца з маленькім зіхатлівым агеньчыкам.

П.Раскажыце словамі з верша хто разам з кветкай горнецца сваімі галінкамі да цяпла, якое прынесла вясна?

Горнуцца дубы, бярозы

Голлем да майго цяпла.

П. Чаму ў вершы гаворыцца, што марозы ўжо больш не вернуцца? Паслухайце, як пра гэта расказваецца ў вершы.

Больш не вернуцца марозы –

Я пралеску прынясла.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

П. Пра першую вясновую кветачку ёсць яшчэ адзін вершык. Напімала яго Вера Вярба. Называецца верш – ***“ Пралеска”.***

П. Раскажыце пра паяўленне пралескі словамі з верша. Як вы разумееце выраз: “Тоненькую ножку з-пад пярыны белай на зямлю пралеска ставіла нясмела”. Чаму страшна стала кветцы, калі яна паявілася на свет? Як яе вітала сонейка? Як яе сустрэлі белыя бярозы? Аб чым паведаміла старая елка? Паслухайце верш яшчэ раз, будзем яго расказваць напамяць.

П. Каб вам было расказваць лягчэй я пастаўлю вось гэтыя малюнкі. Спачатку белыя бярозы, потым пралеску, далей пакрытую белым снегам нібыта пярынай зямлю, сонейка, зноў белыя бярозы і, нарэшце, старую ёлку. Цяпер слухайце верш яшчэ раз і паспрабуйце яго расказаць, а дапамагаць вам будуць вось гэтыя малюнкі. ( Расказваюць 4-5 дзетак).

***Завучванне верша Я. Коласа верша “Вясна”***

**Мэта:** узбагачаць слоўнік выхаванцаў па тэме “Вясна”, развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць вершы, разумець змест вершаваных тэкстаў, успрымаць рыфму і рытм вершаваных радкоў. Падтрымліваць у дзяцей жаданне самастойна чытаць верш напамяць.

**Матэрыял:**малюнкі з вясновымі замалёўкамі

**Ход**

П. З надыходам вясны ў прыродзе адбываюцца змены. Якія змены вы заўважылі сёння, калі ішлі ў дзіцячы садок? Паслухайце, як расказвае пра змены ў акаляючай прыродзе вясной Якуб Колас у сваім вершы “Вясна”.

Расказванне верша педагогам.

П. Пра якую пару года расказваецца ў вершы?

П. Якія змены адбываюцца ў прыродзе вясной: з сонцам? з лёдам? Які стаў ветрык і што ён нам прыгнаў?Паслухайце пра гэтыя вясновыя прыкметы яшчэ раз.

Сонца грэе, прыпякае;
Лёд на рэчцы затрашчаў.
Цёплы вецер павявае,
Хмар дажджлівых нам прыгнаў.

П. Пра якіх птушак расказваецца ў вершы? Як птушкі сустракаюць вясну? Так,

Вось і бусел паказаўся,
Гусі дзікія крычаць,
Шпак на дубе расспяваўся,
Жураўлі ужо ляцяць.

Паслухайце верш яшчэ раз, будзем яго з вамі расказваць напамяць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

П. Будзем расказваць па двое. Адзін з вас раскажа пра змены, якія адбываюцца ў прыродзе вясной, а другі – пра птушак вясной. Слухайце верш уважліва яшчэ раз.

П. Першымі раскажуць верш Натуся і Міхасёк. Калі ласка, Натуся пра змены ў прыродзе, а Міхасёк пра птушак.

***Чытанне апавядання К. Буйло “ З выраю”***

**Мэта:** замацоўваць ў дзяцей уменне разумець змест твора, яго сэнс. Пабуджаць выхаванцаў да паслядоўнага пераказвання тэста. Выхоўваць пачуццё любві да роднай прыроды.

**Матэрыял:** малюнкі птушак.

**Ход**

П. Паглядзіце на гэтыя малюнкі.Назавіце птушак, якія застаюцца на зіму. Назавіце птушак, якія зімуюць у цёплых краінах? Калі прылятаюць да нас птушкі з выраю?Паслухайце апавяданне К. Буйло ***“ З выраю”.***

Чытанне апавядання.

П. Пра каго расказваецца ў апавяданні?

П. Паслухайце апавяданне яшчэ раз, будзем яго пераказваць па частках.

П. Перакажыце, што гаворыцца у творы аб цёплай чужыне. Спачатку яшчэ раз паслухайце, гэты ўрывак, потым будзеце яго пераказваць

Не страшыць сцюжай там зіма, ні злых марозаў там няма, а краскі вечна там растуць, у гаях птушачкі пяюць; густой апрануты ліствой, штосьць шэпчуць дрэўцы між сабой… У іх цяні руччы бягуць, і птушкі райскія жывуць, што, хвост спусціўшы над зямлёй, гараць, як краскі, між ліствой.

Перакажыце ўрывак, дзе расказваецца, чаму ляцяць птушкі ў родны край? Спачатку яшчэ раз паслухайце, гэты ўрывак, потым будзеце яго пераказваць

— Хоць добра у краю тым жыць, хоць век пануе там вясна, мілей нам родна старана: тут маткі гнёзды нам вілі, сярод лясоў тых мы жылі, тут гадавалі нас яны, сюды ляцім мы штовясны.

***Завучванне верша Г. Івановай “Сонейка-сонца”***

**Мэта:** развіваць паэтычны слых, вобразнае маўленне; заахвочваць дзяцей да адгадвання загадак, разумення выразных сродкаў мовы. Падтрымліваць у выхаванцаў жаданне самастойна чытаць верш напамяць. Развіваць у іх выразнасць голасу пры чытанні верша.

**Ход**

П. Паслухайце загадкі і назавіце адгадкі .

Стукае, грукае, а нідзе яго не відаць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гром.

П. Што дапамагло вам адгадаць загадку? Паўтарыце, як расказваецца ў загадцы пра гром.

І шуміць, і гудзе, на ўвесь свет голас ідзе.

Вецер.

П. Што вам падказала адгадку? У загадцы расказваецца, што ветрык шуміць, гудзе. Якія яшчэ яго дзеянні вы ведаеце?

Насупіцца, нахмурыцца, у слёзы ўдарыцца – нічога не застанецца.

Хмара.

П. Пра што гэтая загадка? Калі хмарка так выглядае? Як выглядае хмарка ў дождж.

Тонкі, доўгі, а ўпадзе – з травы не відаць.

Дождж.

П. Што апісваецца ў гэтай загадцы? Пра дождж расказваецца, што ён тонкі і доўгі. Апішыце, якія яшчэ якасці ў дожджыка?

Мяне ўсе просяць, мяне ўсе чакаюць, а як толькі з'яўлюся, хавацца пачынаюць.

Дождж.

П. Пра што гэтая загадка? Чаму ад дожджыка ўсе хавацца пачынаюць?

Цераз палі, цераз лугі спусціліся канцы дугі.

Вясёлка

П. Што падказала вам адгадку на гэтую загадку?

Дуга гэтая незвычайная. Назавіце колеры вясёлкі. Чаму яна мае такую назву?

Ішла панна ўначы, згубіла ключы, месяц бачыў, а сонца падняло.

Раса.

П. Аб чым гэтая загадка? Што можна заўважыць на траўцы позна ўвечары і што знікае з першымі промнямі сонейка ўранку? Якая раса, раскажы пра яе якасці.

Жыве без цела, гаворыць без языка, ніхто не бачыць, а ўсякі чуе.

Рэха.

П. Што падказала табе адгадку на загадку? Апішы яшчэ раз словамі з загадкі якасці рэха. Пра якія прыродныя з'явы расказваецца ў гэтых загадках. Вось яшчэ адна загадка.

Залаценькае, кругленькае – усяму свету міленькае.

Сонейка

П. Што міленькае ўсяму беламу свету? Як апісваецца сонейка ў загадцы? Паслухайце верш пра сонейка?

Расказванне верша Г. Івановай "Сонейка-сонца"

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

П. Як прыгожа называюць дзеткі сонца?З чым параўноўваецца сонейка ў вершы? З чым яшчэ можна параўнаць сонейка? Чаго просяць малыя ў сонейка? Паўтарыце іх просьбу так, каб сонейка пачула яе.

Сонейка-сонца,
Залатое донца,
Не хавайся ў бары,
а гары,
гары,
гары!
Ну –
хоць трохі пасвяці,
каб нам спаць не ісці!

Паслухайце заклічку да сонейка яшчэ раз. Будзем расказваць яе напамяць. Расказваюць 4-5 дзяцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### *Расказванне верша В. Лукша "Вясёлка"*

**Мэта**: развіваць у дзяцей уменне эмацыйна ўспрымаць вершы, разумець змест вершаваных тэкстаў, успрымаць рытм і рыфму вершаваных радкоў, фарміраваць уменні выхаванцаў адлюстроўваць змест верша ў малюнку.

**Матэрыял :** вясновыя замалёўкі

**Ход**

П. Ці бачылі вы вясёлку? Бывае, што адразу ідзе дождж і свеціць сонейка. Тады на небе паяўляецца вясёлка. Назавіце колеры вясёлкі.

Паслухайце вершык В. Лукшы пра вясёлку.

П. Пра што расказваецца ў вершы? З-за чаго ў дзяцей узніклі спрэчкі? Назавіце ўсе колеры вясёлкі. Вось як пра іх расказваецца ў вершы.

З колераў якіх яна
Так прыгожа складзена?
Ўсе спрачаліся дасужа,
Пальцы загіналі дружна:
— Фіялетавы!
— Жоўты!
— Аранжавы!
— Чырвоны!
— Зялёны!

— Адзін прапусцілі!

— Які?

— Нібыта...

— Блакітны!..

П. Давайце раскажам словамі з верша пра колеры вясёлкі.

Колер кожны вельмі важны,
Што ён значыць, хто адкажа?

— Жоўты, ўскрылены цяплом,…
Ласку дорыць і святло.
— А блакітны разам з сінім —
Гэта… мір усім краінам!

— Фіялетавы... А гэты
Знак …павагі і прывету.
— А зялёны — …сын вясны,
Хай ім поўны будуць сны.
— Як матуліны далоні
Грэе колер нас …чырвоны.
— І аранжавы нам любы —…
Апельсіны вельмі любім!..

Колераў сем — вось суполка! —
Дружна скла́ліся вясёлкай.
Кожны колер блізкі сэрцу.
Чорнаму няма тут месца!
Чорны колер — то вайна!
Не патрэбна нам яна!

П. Намалюйце вясёлку фарбамі і раскажыце, якія рэчы вы б намалявалі гэтымі фарбамі.

**Чытанне апавядання Клаўдзіі Каліны “Ліпень”**

**Мэта:** замацоўваць ў дзяцей уменне разумець змест твора, яго сэнс. Пабуджаць выхаванцаў да пераказвання тэкста.Выхоўваць пачуццё любві да роднай прыроды.

**Матэрыял:** малюнкі родных краявідаў.

**Ход**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

П. Якія летнія месяцы вы ведаеце? Якія змены адбываюцца ў прыродзе ў ліпені? Паслухайце апавяданне К. Каліны “Ліпень”. Чытанне апавядання.

П. Пра якія поры года расказваецца ў апавяданні. Чаму спадабалася пчолам вясна. І сапраўды сады цвітуць, прыгожыя кветкі на лугах. Але і аднойчы ранкам вылецелі пчолы ў сад, а там усе кветкі з дрэў асыпаліся. Паляцелі пчолы на лугі, а там пракосы ляжаць. Падаліся на палеткі канюшыны, і тут усё скошана. Як вы думаеце , якая пара года прыйшла? . Ці спадабалася лета пчолам? З якой просьбай звярнуліся яны да лета?

П. Паспрабуйце пераказаць той ўрывак тэксту, дзе пчолы звяртаюцца да лета са сваёй скаргай.

Знайшлі пчолы Лета на лузе, яно касіла траву.

— Што ж ты нас крыўдзіш, Лета? — загулі пчолы.

— Вясна нас запрасіла да сябе, расквеціла сады… А ты ўсе галінкі атрэсла, лугі скасіла, усё высушыла… няўжо ты не ведаеш, што мы без красак і без работы загінем?!

Выслухала Лета пчол, задумалася.

— Не ведала я, што вам патрэбны кветкі, але пачакайце, можа, мае месяцы нешта параяць…

П. Раскажыце, як паабяцалі дапамагчы пчолам летнія месяцы?

П. Што паабяцаў зрабіць першы месяц лета? Так, чэрвень паабяцаў падоўжыць дзень.

П. Што паабяцаў зрабіць другі месяц лета? Раскажыце пра гэта словамі з апавядання.

Сярэдні месяц доўга думаў, што яму зрабіць, каб памагчы пчолам.

— Я расквечу ліпы, яны яшчэ не цвілі!— радасна сказаў ён.— Вось і будзе пчолам удосталь і працы, і мёду.

— Вельмі добра ты прыдумаў! — зарадавалася Лета. — За тое, што ты расквеціш ліпы і дапаможаш пчолам, ты і будзеш звацца Ліпень.

П. Ці абрадаваліся пчолы ліпеню?

П. Як пра гэта расказваецца ў апавяданні ?

— Дзякуй табе, Ліпень! Добры Ліпень! Шчодры Ліпень!— загулі пчолы і паляцелі да ліп.

І да гэтага часу пчолы дзякуюць шчодраму Ліпеню.

— Дзя-дзя-куй! Дз-дзякуй! — дзынкаюць яны над ліпамі.

### *Завучванне верша Я. Коласа “На лузе”*

**Мэта:** вызваць у выхаванцаў эмацыянальны водгук на летнія замалёўкі паэтычнага апісання прыроды, паглыбляць уяўленні дзяцей пра адпаведнасць назвы тэкста яго зместу, падтрымліваць у выхаванцаў жаданне самастойна расказваць верш напамяць. Развіваць у іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выразнасць голасу пры чытанні верша, інтанацыйнаую разнастайнасць перадачы тэксту ў залежнасці ад перадачы малюнкаў летняй прыроды.

**Матэрыял:** малюнкі або фотаздымкі летніх пейзажаў, аудыязапіс спявання птушак, трашчання конікаў, стракозак.

**Ход**

П. Паслухайце , што гэта за гукі?(аудыязапіс). Якія гукі вы пачулі?

У якую пару года можна пачуць песні птушак, трашчанне конікаў, стракозак? Ці былі вы на лузе летам? Што цікавага вы там убачылі? Пра тое, як добра на лузе летам, паслухайце верш Якуба Коласа, які так і называецца "На лузе"

П. Чаму на лузе добра ў час палудны? Раскажам разам з вамі пра тое, як добра на лузе летам. Я буду пачынаць расказваць словамі з верша, а вы дагаворваць паэтычныя радкі.

Там лёгка ... *дыхнуць.*

Там хмаркі белыя марудна ... *за лясы плывуць.*

Ветрык на лузе краскі… *чуць калыша*, травы ... *шалясцяць,*

Луг зялёны жыццём дыша – конікі ... *трашчаць.*

У лозах шчэбет не сціхае, стаіць ...*шум і свіст,*

Ў яркім бляску спачывае на ракіце... *ліст.*

П. Паслухайце верш яшчэ раз, будзем яго расказваць напамяць.
Вось тут на малюнках адлюстраваны хмаркі, краскі і травы, конікі, лозы, ліст ракіты. Я пастаўлю гэтыя малюнкі ў той паслядоўнасці, як пра іх расказваецца ў вершы, каб вам было лягчэй яго запомніць. Слухайце верш. Цяпер раскажыце яго ( 4-5 дзяцей).

***Расказванне вершаў Ул. Паўлава « Пакланіся добрым людзям», Э. Агняцвет «Саўка за сталом».***

**Мэта:** садзейнічаць развіццю ў дзяцей умення адчуваць і разумець характар верша, маральны сэнс твора, узаемасувязь апісанага ў вершы з рэальным жыццём. Актывізаваць лексіку выхаванцаў па тэме: "Ветлівыя словы". Пабуджаць дашкольнікаў да ўспаміну вершаў, якія завучваліся напамяць раней. Фарміраваць у дзяцей этычныя навыкі зносін.

**Матэрыял:** малюнкі рэальных жыццёвых сітуацый, якія адлюстроўваюць неабходнасць ужывання ветлівых слоў.

**Ход**

П. Назавіце, калі, ласка, ветлівыя словы. Калі ужываюць гэтыя словы? Знайдзіце гэтыя жыццёвыя сітуацыі на малюнках і растлумачце, чаму вы выбралі менавіта гэтыя малюнкі. Паслухайце верш, які называецца
" Пакланіся добрым людзям". Расказванне верша.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

П.  Назавіце ветлівыя словы, якія вы пачулі ў вершы. Раскажыце словамі з верша, калі ўжываюць гэтыя словы. Знайдзіце гэтыя жыццёвыя сітуацыі на малюнках і растлумачце, чаму вы выбралі менавіта гэтыя малюнкі. Паслухайце яшчэ адзін верш. Тут таксама ёсць ветлівыя словы. Запомніце ветлівыя  словы, якія сустракаюцца ў гэтым вершы.

Добра, калі ўжо змалку
Сам можаш **вітаць** людзей,
Раніцай: -- **Добрага ранку!**
І апоўдня: -- **Добры дзень!**

Увечары пры сустрэчы
Знаёмым сказаць: -- **Добры вечар**!
А соннаму сонейку нанач
І ўсім добрым людзям : -- **Дабранач**!

*В. Вітка.*

П. Назавіце ветлівыя словы з верша. Прыпомніце і раскажыце, калі гавораць кожнае ветлівае, пра якое расказваецца ў гэтым вершы? Знайдзіце  малюнкі, на якіх адлюстраваны сітуацыі, калі вітаеш людзей ці знаёмаму пры сустрэчы гаворыш “ Добры вечар”. Раней мы з вамі вучылі верш  *Тадзіяны Кляшторнай*  ***“Ветлівыя словы”.*** Давайце разам успомнім яго.

П. Назавіце ветлівыя словы, пра якія расказваецца ў вершы? Ад каго мы чуем ветлівыя словы? А для чаго іх гавораць? Чаму трэба даражыць ветлівымі словамі?

П. Добра, калі ведаеш не толькі ветлівыя словы, але і правілы паводзін. Ці ведаеце вы як трэба паводзіць сябе за сталом , калі снедаеш, абедаеш або вячэраеш?  Раскажыце.

Паслухайце верш Э. Агняцвет пра тое, як Саўка паводзіць сябе за сталом? Называецца ён “Саўка за сталом”.

П. Пра каго расказваецца ў вершы? Які посуд паўцякаў ад Саўкі? Чаму паўцякаў ад Саўкі ўвесь посуд? Растлумачце Саўку, як неабходна правільна паводзіць сябе за сталом.

***Расказванне верша Вольгі Іпатавай  “Як ён завецца?***

**Мэта:** замацоўваць ў дзяцей уменне разумець змест вершаваных радкоў, іх сэнс. Пабуджаць выхаванцаў да гутаркі па змесце верша. Выхоўваць  маральна-эстэтычныя якасці асобы.

**Матэрыял:** малюнкі аб жыцці дзяцей у розных краінах свету.

**Ход**

П. У кожнага з нас ёсць шмат найменняў. Як завецца той, дапамагае сваёй маці? Як завецца той, што не забывае мыць шыю і рукі? Як завецца той, у каго шмат сяброў? Паслухайце верш Вольгі Іпатавай  “Як ён завецца?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як ён завецца,

Гэты хлапчук?

Не хоча памыць ён

Ні шыі, ні рук.

Цукеркі і цацкі

Сабе ён грабе,

Нікога не любіць,

А толькі сябе.

Сяброў ён не мае,

Кніжкі— ірве.

А што не па ім —

Як бычок зараве.

Затупае ножкамі,

Вырвецца з рук.

Ці ведаеш, як той

Завецца хлапчук?

П. Адкажыце на пытанне з верша. Ці ёсць такія дзеці ў нашай групе? Якім трэба быць, каб вас называлі паслухмяны хлопчык,або паслухмяная дзяўчынка?

***Чытанне апавядання Клаўдзіі Каліны "Кампот"***

**Мэта:** замацоўваць ў дзяцей уменне разумець змест твора, яго сэнс. Пабуджаць выхаванцаў да гутаркі па змесце тэкста.Выхоўваць працавітасць і ашчадныя адносіны да працы, захвочваць да пераказу тэкста.

**Матэрыял:** малюнкі " Садавіна"

**Ход**

П. Ці любіце вы кампот? Знайдзіце на малюнках садавіну для кампота. Паслухайце апавяданне К. Каліны ***"Кампот"***

Маленькая Галя вельмі любіць памагаць маме. Сёння мама даручыла Галі памыць сушаныя яблыкі для кампоту.

За абедам мама сказала: «Ну, цяпер пакаштуем кампот нашай дачушкі», — і паставіла перад кожным кубак, а перад Галяй — яе любімы, з дзвюма чырвонымі вішанькамі.

Тата адпіў крыху з кубка і зірнуў на маму. Мама зрабіла глыток і паглядзела на Галю.

Паглядзела і пытаецца:

«Дачушка, ці добра ты памыла яблыкі?»—

«Так, мамачка,— адказала Галя, — вельмі добра. Я іх нават мылам мыліла!»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

П. Якое даручэнне дала маці маленькай Галі? Ці выканала яго дзяўчынка? Ці смачным атрымаўся кампот? Чаму не дапілі кампот Галіны бацькі? Паслухайце апавяданне яшчэ раз. Будзем пераказваць яго.

***Чытанне апавядання Васіль Хомчанка***

**"Білеты ў цырк"**

**Мэта:** замацоўваць ў дзяцей уменне разумець змест твора, яго сэнс. Пабуджаць выхаванцаў да гутаркі па зместу тэкста.Выхоўваць пачуццё любві да людзей сталага ўзросту.

**Матэрыял:** малюнкі цыркавога прадстаўлення.

**Ход**

П. Што азначае – зрабіць добрую справу? Якія добрыя справы вы рабілі? Паслухайце апавяданне В. Хомчанкі ***"Білеты ў цырк".***

У горад прыехаў цырк. Маці дала Кастусю грошы і сказала:

— Сёння ў 12 гадзін пойдзем у цырк. Купі два білеты. Адзін мне, другі — сабе. Потым строга дадала: — Глядзі ж, не бaўся.

Праз якія паўгадзіны радасны Кастусь ужо імчаўся дадому, сціскаючы ў руцэ дзве сіненькія паперкі.

Усюды ў горадзе віселі цыркавыя афішы. Каля адной з афіш Кастусь спыніўся. На ёй быў цікавы малюнак: белыя сабачкі стаялі ў рад і пярэднімі лапкамі віталі мядзведзя. Як многа цікавага ўбачыць Кастусь сёння ў цырку!

Нейкі дзядзька, праходзячы міма, штурхануў хлопчыка ў плячо.

— Не бачыце, ці што? — сярдзіта сказаў Кастусь.

Дзядзька спыніўся, павярнуўся назад. На вачах у яго былі акуляры з сінімі шкельцамі, у руках ён трымаў жалезную кульбу.

— Прабач, хлопчык,— ціха прамовіў ён.

Памацаўшы кульбай вакол сябе, дзядзька асцярожна зрабіў некалькі крокаў.

«Сляпы»,— здагадаўся Кастусь. Сляпы ішоў проста ў лужу.

— Дзядзька, вада там! — крыкнуў Кастусь.

Сляпы збочыў управа і наткнуўся на паркан.

— Паркан!— зноў крыкнуў хлопчык. Ён падбег да сляпога, узяў яго за руку, вывеў на дарогу і спытаў:

— Вам далёка ісці?

— На вакзал.

— О! — здзівіўся хлопчык. — Як жа вы дойдзеце?

— Як-небудзь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Не выпускаючы рукі сляпога, Кастусь вёў яго спачатку па тратуары, потым па скверы. А калі дайшоў да плошчы, Кастусь спыніўся. Тут яму трэба было зварочваць дадому, а дарога на вакзал ішла налева.

— Я, дзядзька, сёння ў цырк пайду,— сказаў Кастусь, — мяне мама чакае. Бывайце.

— Бывай. Дзякуй табе.

Кастусь пабег. Ужо ля самага дома ён азірнуўся і ўбачыў, што сляпы стаіць на тратуары і ніяк не асмельваецца перайсці плошчу.

Машыны ішлі ды ішлі бясконцым патокам. Грузавыя і легкавыя, тралейбусы і аўтобусы. А сляпы ўсё стаяў і нецярпліва пастукваў кульбай. «Ён адзін не пяройдзе,— падумаў Кастусь,— трэба дапамагчы».

Кастусь падбег да сляпога і зноў узяў яго за руку.

Сляпы пазнаў хлопчыка, моўчкі кіўнуў галавой і пакрочыў следам за ім.

П. А як бы вы паступілі на месцы хлопчыка? Чаму? Якую іншую назву можна даць апавяданню?

***Расказванне вершаў Э. Агняцвет “Хто пачынае дзень”,***

***А. Астрэйка “Размова аб прафесіях”,***

***Я. Купалы “Хлопчык і лётчык”.***

**Мэта:** актывізаваць лексіку дзяцей па тэме “Праца дарослых”, развіваць у іх уменне разумець вобразы людзей розных прафесій, пра якія расказваецца ў вершах, адчуваць узаемасувязь апісанага з рэальным жыццём; падтрымліваць у дзяцей жаданне выразіць свае ўяўленні ад успрымання паэтычнага слова ва ўласных звязных выказваннях і малюнках.

**Матэрыял:** карцінкі людзей розных прафесій.

**Ход**

П. Паглядзіце на гэтыя карцінкі. На іх адлюстраваны людзі розных прафесій. Назавіце, да якой прафесіі належыць кожны з іх. Паслухайце верш Э. Агняцвет “Хто пачынае дзень”.

П. Назавіце прафесіі, аб якіх ідзе размова ў вершы? Хто пачынае новы дзень? Рабочы чалавек, гэта і шафёр, *... і... працягвайце далей , ... і...*

Усе гэтыя прафесіі каштоўныя для нашай краіны і для ўсіх людзей. Растлумачце, чым каштоўныя гэтыя прафесіі для людзей? Паслухайце, як расказвае пра розныя прафесіі ў вершы **“**Размова аб прафесіях**”** А. Астрэйка.

П. Знайдзіце на малюнках людзей пра прафесіі, якіх гаворыцца ў вершы. Раскажыце, якую карысць прыносіць справа, якой займаюцца людзі гэтых прафесій. Кожны з вас можа выбраць прафесію сабе сам. Якой прафесіі вы жадаеце навучыцца? Чаму? Вось Алесь хоча

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

стаць лётчыкам. Чаму ты хочаш стаць лётчыкам, Алесь? Народны паэт Беларусі Я. Купала напісаў верш, які называецца “Хлопчык і лётчык”. Паслухайце гэты верш.

П. Што просіць у лётчыка хлопчык? Дзе хоча пабываць хлопчык і што ён хоча пабачыць? Паслухайце яшчэ раз ўрывак з гэтага верша, дзе хацеў пабываць хлопчык, аб чым ён марыў.

Вазьмі ж мяне, мяне, лётчык, хачу я
Пабыць у людзях, паглядзець,
Як месяц на небе начуе,
Як блукае ў лесе мядзведзь.

Як свецяцца ночкаю зоры,
А днём не відаць іх чаму,
Як рэчкі ў далёкія моры
Улетку плывуць і ўзіму.

На моры зірнуць хоць раз вокам,
Як ходзяць па іх караблі,
Ляцеці далёка, высока
Ды так пабываць і ў Крамлі.

П. Вы пачулі, дзе хацеў пабываць маленькі хлопчык, а дзе хацеў бы пабываць кожны з вас? Намалюйце , дзе вы хацелі б пабываць? Пасля малявання можна прапанаваць дзецям расказаць пра свой малюнак .

***Расказванне верша А. Вольскага “Сталяры”***

**Мэта:**пабуджаць выхаванцаў да эмацыйнага успрымання вершаваных радкоў. Выхоўваць працавітасць і адказныя адносіны да працы.

**Матэрыял:** малюнкі аб працы.

**Ход**

П. Паглядзіце на гэтыя малюнкі. Назавіце, што робяць сталяры? Паслухайце верш А. Вольскага “Сталяры”

Мы са Слаўкам —
сталяры:
робім лаўку
на двары.
Жоўтыя апілкі
сыплюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

з-пад пілкі.
Стружкі
з-пад рубанкаў —
вязкай абаранкаў.
Мы для лаўкі
дошкі
падгаблюем трошкі.
Вось гатова спінка.
Вось гатовы ножкі.
Тук-так-ток,
тук-так-ток, —
заспяваў малаток.
Ды чамусьці
цвікі
загінаюцца
ў бакі.
Выпраміш —
і зноўку
хіліць цвік галоўку.
Аж да стомы
працавалі,
але лаўку
змайстравалі.
Мы абодва
рады надта,
ды прыйшла сястрычка
Ната.
Паглядзела
і сказала:
— З вашай працы
толку мала.
Нават боязна садзіцца.
Можа лаўка
разваліцца…
Я ў адказ:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— Наадварот!

Прастаіць яна сто год…

П. Чаму верш называецца “Сталяры”? Ці сапраўдныя сталяры майстравалі лаўку? Што змайстравалі хлопчыкі? Якія дзеянні яны выконвалі, каб атрымалася лаўка?. Вось як пра гэта расказваецца ў казцы?

Жоўтыя апілкі
сыплюцца
з-пад пілкі.
Стружкі
з-пад рубанкаў —
вязкай абаранкаў.
Мы для лаўкі
дошкі
падгаблюем трошкі.
Вось гатова спінка.
Вось гатовы ножкі.
Тук-так-ток,
тук-так-ток, —
заспяваў малаток.
Ды чамусьці
цвікі
загінаюцца
ў бакі.
Выпраміш —
і зноўку
хіліць цвік галоўку.
Аж да стомы
працавалі,
але лаўку
змайстравалі.

П. Чаму Ната сказала, што ад працы хлопчыкаў толку мала? Што ёй ў адказ сказаў брат? Скажыце гэтыя радкі з упэўненасцю.

— Наадварот!

Прастаіць яна сто год…

Паслухайце верш яшчэ раз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Расказванне вершаў " Хто я?" В. Віткі, "Чатыры пажаданні" А. Мілюця.***

**Мэта:** садзейнічаць развіццю ў дзяцей умення адчуваць і разумець змест вершаванага твора, усведамляць узаемасувязь апісанага з рэальным жыццём. Выхоўваць у дашкольнікаў любоў да Радзімы, гонар за яе

**Матэрыял:** карта Беларусі .

**Ход**

П. Паглядзіце на гэтую карту, назавіце, якой яна краіны? Хто жыве ў Беларусі? Успомніце вершы, што мы вучылі раней, дзе расказваецца пра хлопчыка, які нарадзіўся ў Беларусі . Хто хоча расказаць гэты верш? Раскажыце яго з гонарам за родную Беларусь.

П. А цяпер успомніце верш, дзе расказваецца пра дзяўчынку, якая нарадзілася ў Беларусі. Хто жадае расказаць гэты верш? Раскажыце яго так, каб усе пачулі, што вы, як і маленькая дзяўчынка, любіце родную краіну.

П. Давайце раскажам разам пра нашу радзіму. Наша Радзіма завецца... – *Беларусь.* У Беларусі жывуць ... *беларусы.* Хлопчык завецца ... *беларус*, а дзяўчынка – ... *беларусачка.* Наша родная мова – ... *беларуская.* Паслухайце , як расказвае пра нашу Айчыну ў вершы ***"Чатыры пажаданні***" А. Мілюць.

П. Раскажыце словамі з верша, як паэт шчыра любіць беларускую зямельку?

Бо радзімая старонка
Над усё мне прыгажэй,
Беларуская гаворка
Над усё мне даражэй.

П. Паўтарыце гэтыя словы ўсе разам – гучна і з гонарам за родную старонку. Складзіце апавяданне пра нашу краіну, пра тое якая Беларусь, як вы яе любіце і ганарыцеся ёю.

**Расказванне твораў А. Якімовіча «Звяры нашых лясоў, А. Вольскага «Вавёрка», «Дзівачок», П. Марціновіча «Клубочак»**

**Мэта:** актывізаваць слоўнік выхаванцаў па тэме "Звяры нашых лясоў", развіваць ўменне дзяцей заўважаць асаблівасці паэтычнай мовы. Вучыць іх адчуваць і разумець характар мастацкіх вобразаў ў творах. Развіваць у выхаванцаў уменне адлюстроўваць свае ўяўленні ад успрынятага мастацкага твора ў сваіх апавяданнях. Пабуджаць іх да ўключэння у звязнае выказванне слоў вершаў, вершаваных радкоў.

**Матэрыял:**карцінкі розных лясных звяроў.

**Ход**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

П. Ці ведаеце вы, што за звяры жывуць у лесе? Назавіце іх. Знайдзіце малюнкі, на якіх адлюстраваны звяры нашых лясоў. Назавіце гэтых звяроў. Паслухайце вершы А. Якімовіча " Звяры нашых лясоў".

*У час расказвання вершаў педагог паказвае малюнкі звяроў.*

П. Што расказваецца ў вершы пра мядзведзя? Як расказваецца ў вершы пра ваўка і зайца? Што яшчэ вы можаце расказаць пра ваўка і зайца? Намалюйце воўка, але не фарбамі, а словамі. Намалюйце зайца, але не фарбамі, а словамі. Раскажыце словамі з верша, чаму зубры проста дзіва - не звяры?. Што вы даведаліся з верша пра баброў? Калі ліска навастрае свае вушкі? Апішыце , як выглядаюць дзікі? Што расказваецца ў вершы пра рогі аленя? Пра якога яшчэ рагатага звера расказваецца ў вершы? Пра якіх звяроў леса не расказвалася ў гэтым вершы? Знайдзіце гэтых звяроў на малюнках, назавіце іх і пакажыце малюнкі.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

П. Паслухайце верш пра вавёрку, якая таксама жыве ў лесе.

П. Раскажыце словамі з верша, дзе ў лесе жыве вавёрка і, як яна падрыхтавалася да зімы? Пакажыце на малюнку яшчэ аднаго ляснога жыхара, пра якога не расказвалася ў вершах.

Так, гэта калючы вожык.

Паслухайце вершы пра яго.

П. З чым у вершы параўноўваецца вожык? Чым адрозніваецца гэты клубочак ад звычайнага? Паслухайце верш пра маленькага хлопчыка і калючага вожыка, якога той знайшоў ў лесе.

П. Чаму вожык не захацеў есці малако? У вершы гаворыцца, што малака не хоча вожык і тупоча на балкон, дзе" толькі пахне вецер свежы, пахне лісцем і травой". Чаму вожыка цягне на балкон? Аб чым напамінае вожыку свежы вецер, пах травы і лісця? Дзе сапраўдны дом вожыка? Куды ён хоча вярнуцца? Пакажыце карцінкі звяроў, з якімі вы

пазнаёміліся ў вершах розных паэтаў. Паспрабуйце апісаць таго з іх, хто вам больш падабаецца. Выкарыстоўвайце ў сваіх апавяданнях слова з вершаў, якія вы сёння пачулі.

***Расказванне верша С. Шушкевіча “Пракалоў камарык ножку”***

**Мэта:** актывізаваць слоўнік выхаванцаў па тэме “Насякомыя”, развіваць іх здольнасць заўважаць асаблівасці паэтычнай мовы, Падтрымліваць у выхаванцаў жаданне самастойна выразна чытаць верш напамяць, суправаджаць расказванне верша гульнявымі дзеяннямі.

**Матэрыял:** карцінкі “ Насякомыя”

**Ход**



П. Паглядзіце на гэтыя малюнкі. . Найдзіце сярод іх камарыка. Пра камарыка гавораць -- “Камарык – насаты тварык”, чаму? Паслухайце вер*ш пра камарыка. Называецца* **ён “П***ракалоў камарык ножку”*

П. Пра што расказваецца ў вершы? Як супакойвае камарыка яго маці? Ці спачуваюць камарыку іншыя камарыкі-камараты? Чаму абяцае навучыць сваіх сяброў камарык, як залечыць ножку? Раскажыце гэтыя словы.

— Вось як ножку залячу,
Насміхацца адвучу.

***Расказванне вершаў “Певень” К. Камейшы.***

***Завучванне верша“Гусанькі” А. Дзеружынскага.***

**Мэта:** актывізаваць слоўнік выхаванцаў па тэме “Свойскія птушкі”, развіваць іх здольнасць заўважаць асаблівасці паэтычнай мовы, Падтрымліваць у выхаванцаў жаданне самастойна выразна чытаць верш напамяць па парах, суправаджаць расказванне верша гульнявымі дзеяннямі.

**Матэрыял:** карцінка “ На птушыным двары”

**Ход**

П. Паглядзіце на малюнак і назавіце птушак, якіх вы бачыце на птушыным двары. Раскажыце, што вы ведаеце пра пеўніка.Апішыце пеўніка, як ён выглядае? Як прыгожа называюць пеўніка ў песеньках, казках?(пэвунок залаты грабенёк). Паслухайце верш К. Камейшы пра пеўніка. Называецца ён *“**Певень”.***

П. Як прыгожа паэт называе пеўніка? ( певень-спевень). Ці падобна ваша апісанне пеўніка, на тое, як ён апісаны ў вершы? Чаму, на вашу думку, ён яго так называе? Колькі разоў спявае певень, каб разбудзіць нас уранку? Давайце разам раскажам, якія змены

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адбываюцца ў выглядзе пеўня і у прыродным наваколлі, калі ён пачынае спяваць. У першы яго спеў грабеньчык загарыцца як ... (агеньчык). Другі раз заспявае , то неба ... (чырванню зайграе). Заспявае трэці раз .. (прачынацца нам пара). Каго яшчэ можна сустрэць на птушыным двары? Раскажыце, што вы ведаеце пра курачку? Намалюйце курачку, але не фарбамі, а словамі. Адгадайце загадку, якая птушка з тых, што на птушыным двары ў ёй апісваецца?

- На лапатах ходзіць, рогам есь .

Гуска

П. Як вы здагадаліся, што гэта гуска? З чым параўноўваюцца лапкі гускі? Чаму? З чым параўноўваецца дзюбка гускі ? І сапраўды яна падобна на рог, моцная і доўгая. Паслухайце верш пра гусачак. Называецца верш “Гусанькі”, а напісаў яго А. Дзеружынскі.

П. Куды хадзілі гусанькі? Што яны рабілі на беразе рэчанькі, на лугах?
Хто іх там высачыў? Як гусанькі ўратаваліся ад ваўка? Давайце разам пагуляем па змесце гэтага вершыка. Вы будзеце гусанькі, а я буду гаспадыняй. ( Гуляюць разам з педагогам 2-3 разы). Цяпер выбярэм лічылкай гаспадыню, будзеце расказвайць верш і гуляць ў гаспадыню і гусак самастойна.( 2-3 разы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## *Чытанне вясёлых вершаў*

**Мэта :** працягваць вучыць дзяцей разумець гумарыстычны сэнс вершаў, заўважаць недакладнасці ў іх змесце; дапамагчы выхаванцам асэнсаваць значэнне вобразных слоў і выразаў ў тэксце паэтычных твораў; вызываць пры чытанні вершаў радасны эмацыянальны настрой.

**Матэрыял:** жазло рэгуліроўшчыка.

**Ход**

П. Раскажыце свае любімыя вершы.Які ў вас быў настрой пры чытанні сваіх любімых вершаў? Ёсць розныя вершы: вясёлыя, радасныя, бадзёрыя, сумныя. Есць нават такія вершы, што калі іх расказваюць, адразу мяняецца настрой і хочацца смяяцца. Ці любіце вы такія вершы? Хто з вас ведае вясёлыя вершы? Раскажыце. Паслухайце, якія вясёлыя вершы раскажу вам я?Расказванне верша Р. Барадуліна “Жарт”.

.П. Што недарэчнага ў гэтым вершы? Як вы думаеце, ці можа гарэць калодзеж? Паслухайце яшчэ адзін верш, які называецца «Ці так» і здагадайцеся, ці бывае так у сапраўдным жыцці.Напісаў яго М. Пазнякоў.

П. Чаму пры чытанні гэтага верша вы усміхаліся? Адкажыце, ці так бывае на самой справе? Давайце разам раскажам верш правільна. Вось яшчэ адзін верш. Напісаў яго Р. Барадулін. Называецца ён “Зай-рэгуліроўшчык”.

П. Што незвычайнага ў гэтым вершы? Ці можа быць морква жазлом рэгуліроўчыка? Пакажыце сапраўднае жазло рэгуліроўшчыка, вазьміце яго ў рукі , пакажыце, як спыніць жазлом рух, даць каманду на рух транспарту. Ці спадабаўся вам гэты верш? Раскажыце змест гэтага верша ўвечары сваім бацькам.

**Расказванне верша А. Вольскага "Дзеці"**

**Мэта:** замацоўваць ў дзяцей уменне разумець змест вершаваных радкоў іх сэнс. Пабуджаць выхаванцаў да расказвання вершаваных радкоў з клічнай інтанацыяй. Выхоўваць пачуццё любві і сяброўства паміж дзецьмі, якія жывуць у розных краінах свету.

**Матэрыял:** малюнкі аб жыцці дзяцей у розных краінах свету.

**Ход**

П. Паглядзіце на гэтыя малюнкі. Каго вы на іх бачыце? Гэтыя дзеці жывуць у розных краінах свету. У іх таксама ёсць любімыя гульні, у якія яны любяць гуляць. Як і дарослыя , дзеці маюць права на жыццё, права на адукацыю, права на адпачынак, права на тое, каб жыць ў шчаслівай сям'і, права на мірнае жыццё без вайны  і яшчэ шмат іншых праў. Гэтыя правы дзяцей ў некаторых краінах парушаюцца . Паслухайце верш А. Вольскага "Дзеці", у якім расказваецца пра розных дзяцей  нашай планеты.

П.  Што рознага ў дзяцей нашай планеты? Што аднолькавага ў дзяцей нашай планеты? Да чаго заклікае паэт дарослых? Паслухайце яшчэ раз гэтыя словы.

Вось бы зрабіць,
Каб на нашай планеце
Гора не ведалі
Розныя дзеці!
Вось бы зрабіць,
Каб у розных дзяцей
Радасць гасціла
Даўжэй

П. Паслухайце яшчэ раз  заклік паэта і паўтарыце яго з клічнай інтанацыяй.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Арушанова, А. Г. Речь и речевое общение детей: Книга для воспитателей детского сада / А.Г.Арушанова  — М.: Мозаика-Синтез, 1999. - с. 272.
2. Беларуская дзіцячая літаратура. Хрэстаматыя / Аўт.- ўклад. М. Ф. Шаўлоўская. – Мн.: 2003.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Вітка В. Урокі роднага слова: Вершы, казкі, апавяданні: Для мал. Шк. Узросту / В. Вітка; Уклад. Т. С. Тарасава; -- Мн.: 2001.

4. Воспитание малыша в семье от рождения до трех лет: Советы психолога / Е. О. Смирнова, Н. Н. Авдеева, Л. Н. Галигузова, А. О. Дробинская, Т. В. Ермолова, С. Ю. Мещерякова. — М.: АРКТИ, 2004. — 160 с.

5. Гриценко, З.А. Детская литература. Методика приобщения детей к чтению :учеб. пособие для студ. фак. дошк. воспитания высш. пед. учеб. заведений. — 2-е изд., испр./ З.А. Гриценко — М. : Издательский центр «Академия», 2007. — 320 с. 7.

6. Залатыя каласкі. Чытанка для дзяцей. Ч. 1; Ч. 2; / Пад рэд. С.С. Лаўшука.—Мн.: 1994.

7. Стародубова Н. А. Теория и методика развития речи дошкольников : учеб. пособие для студ. вузов, обуч. по спец.: 030900 (050703) - Дошк. педагогика и психология; 031000 (050707) - Педагогика и методика дошк. образования / Стародубова Н. А. - 4-е изд., стер. - М. : Академия, 2009. - 256 с.

8. Тихеева Е.И. Развитие речи детей. / Под ред. Ф.А. Сохина. - М.: Просвещение, 2011. - 159 с.

9. Чытанка для дзіцячага сада / Уклад. В.Р. Вячорка і інш.,-- Мн.: 1990.

10. Чемортан, С.М. Формирование художественно-речевой деятельности старших дошкольников. / Чемортан, С.М. – Кишинёв, 1986.

11. Ушакова О.С. Методика развития речи детей дошкольного возраста / О. С. Ушакова. - М.: Изд-во «ВЛАДОС», 2010. – 147 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Спіс запазычаных крыніц**

1. Пралеска: Хрэстаматыя для дзіцячага сада і пачатковай школы / Скл. Сачанка А.І. Мн., 1997.

2. Хрестоматия для дошкольников: в четырех частях. Часть 4. Произведения малых фольклорных форм / сост. А. И. Саченко, Л. А. Саченко. - 2006 - 187 с.

3. Чытанка для дзіцячага сада / Уклад. В.Р. Вячорка, Н.І.Маскаленка, П.В.Садоўскі. Мн., 1990.